Ба 26263
2604

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ
СЕЛЬСКАЕ і ЛЯСНОЕ ГАСПАДАРКІ імя Ў. І. ЛЕНІНА пры СНК БССР

БЮРО СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ

104

ВЫНІКІ РАБОТЫ ІНСТЫТУТУ СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ

ЗА 1928 г.

Инв. 1953 г. Ба 26263
Бел. аддзел
1994 г.



ВЫДАНЬНЕ НАРКАМЗЕМУ БССР
МЕНСК — 1929

ВЫНІКІ РАБОТЫ МЕНСКАЙ РАСЬЛІНАВОДНАЙ СТАНЦЫІ ПА ІНСТЫТУТУ СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ.

Арганізацыйная работа.

Вызначаны плян работы па Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў Менскай Расьлінаводнай Станцыі на 1928 год выкананы поўнасьцю. Пры гэтым наперад была праведзена шырокая арганізацыйная работа сярод агранамій, працаўнікоў калгасаў і сялянскага актыву. У зімовую пару для азнаямленьня з дасьледчай справай на Беларусі наогул і ў прыватнасьці Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў, а таксама з мэтай папулярызацыі вынікаў дасьледчых станцый і сялянскіх досьледаў, было прачытана на Усебеларускіх Сельска-Гаспадарчых курсах калгасаў (у Мар'іна-Горскім Сельска-Гаспадарчым Тэхнікуме) 7 лекцый, потым, на 3-х с.-г. курсах сялянскага актыву—16 лекцый і на розных агранамічных нарадах, зьездах, на сялянскіх сходах, на настаўніцкіх канфэрэнцыях, у Цэнтральным Доме Селяніна і па радыё—24 даклады. Апрача таго, для выяўленьня сялян-дасьледчыкаў і распаўсюджаньня дасьледчых ведаў і вынікаў праз пэрыядычны друк—газэты „Беларуская Вёска", „Савецкая Беларусь", „Орка", часопісь „Плуг", „Сельская і Лясная Гаспадарка" было зьмешчана 23 артыкулы. Вось, дзякуючы правядзеньню такой шырокай работы і вялікаму імкненьню сялян, працаўнікоў калгасаў і аграномаў мы назіраем значнае пашырэньне ліку дасьледчыкаў за апошні год, што сьцьвярджаюць лічбы наступнай табліцы.

Склад сялян-дасьл. па форме зямлякарыстаньня і па роду іх заняткаў	Лік сялян-дасьледчыкаў па гадох			Павялічэньне ў % % ад мінулага году	
	1926 г.	1927 г.	1928 г.	1927 г.	1928 г.
Калгасаў	2	5	18	150	260
Саўгасаў	—	14	16	—	14
Сялян-адзіночак:					
а) пасялкоўцаў . .	7	22	68	214	200
б) вясковых . . .	12	30	65	150	166
в) хутаран . . .	5	14	24	180	71
г) сель.-гасп. тэхнікумаў і школ. .	4	5	6	25	20
д) настаўнікаў . .	1	2	4	100	100
Разам . . .	31	92	201	197	222

Як бачым, агульны лік дасьледчыкаў кожны год павялічваецца больш чым удвая.

Раён абслугоўваньня Дасьледчай Станцыяй сялян-дасьледчыкаў за гэты год пашырыўся з 15 да 25 адміністрацыйных раёнаў, што фактычна ахапляе поўнасьцю ўвесь раён дзейнасьці станцыі.

На станцыі па справе сялян-дасьледчыкаў працаваў фактычна адзін чалавек які, апрача агульнага кіраўніцтва, на працягу году 4 разы выяжджаў у раёны агулам на 73 дні для закладкі, праверкі і падліку досьледаў, для выяўленьня сялян-дасьледчыкаў ды інструктаваньня на месцы.

Летам была склікана першая канфэрэнцыя сялян дасьледчыкаў і аграпрацаўнікоў (аб выніках яе гл. у канцы справаздачы). Апрача таго, у Музэі Цэнтральнага Дому Селяніна арганізаваны куток селяніна-дасьледчыка.

Лік досьледаў, праведзеных у 1928 годзе, у параўнаньні з мінулымі гадамі наступны:

№№ па чарзе	Назва тэм	Закладзеных досьледаў			З іх праведзены падлік і паступіла на станцыю		
		1926 г.	1927 г.	1928 г.	1926 г.	1927 г.	1928 г.
1	Вывучэньне мінэральных угнаеньняў пад бульбу, жыта, авёс, ячмень, канюшыну і кораньплоды	22	47	99 [1])	14	45	94
2	Вывучэньне торфу на ўгнаеньне пад жыта і бульбу	1	3	7	—	1	4
3	Вывучэньне лубіну на ўгнаеньне пад жыта і бульбу	6	19	23 [2])	—	13	7
4	Вывучэньне штучных выпасаў	—	—	4 [3])	—	—	—
5	Вывучэньне новых сартоў:						
	а) жыта	2	—	40 [4])	—	—	—
	б) азімай пшаніцы . .	—	2	—	—	—	—
	в) аўсоў	—	32	60	—	21	36
	г) ячмчнёў	—	12	35	—	7	30
	д) бульбы	—	3	36	2	2	18
	е) кораньплодаў . .	—	—	35	—	—	10
	Разам . . .	31	118	339	14	89	199

[1]) У часе распрацоўкі атрымана дадаткова 7 досьледаў, а было 92.

[2]) Падлік 15 досьледаў жыта будзе зроблены ў 1929 г.

[3]) Падлік будзе ў 1929 г.

[4]) Падлік будзе ў 1929 г.

Лік досьледаў у 1928 годзе значна павялічыўся, палепшалася і якасьць іх. Пры гэтым трэба адзначыць, што значная частка досьледаў па сортаспрабаваньню прапала па незалежных ад гаспадароў прычынах, дзякуючы дрэнным кліматычным умовам.

Прыродна-кліматычныя ўмовы раёну дзейнасьці станцыі.

Па прыродна-гістарычных, глебавых, кліматычных і эканамічных умовах абслугоўваны раён станцыі падзяляецца ў галоўных рысах на тры часткі:

Першую частку складае Барысаўскі падраён з пяшчанымі і камяністымі глебамі, залягаючымі на валуновай гліне, з больш паніжанай тэмпэратурай, павышанымі вопадападкамі значна адсталы ў эканамічных адносінах. Другі падраён—Меншчына—з пяшчанымі і сугліністымі глебамі, з мерна-цёплым вільготным кліматам; гэты раён эканамічна самы моцны ў Беларусі, трэці падраён—Случчына—з гліністы мі і сугліністымі глебамі на лёэсавым суглінку з мерна-цёплым і зьніжана-вільготным кліматам; гэты раён эканамічна таксама моцны, як і Меншчына.

Для высьвятленьня кліматычных умоў раёну дзейнасьці Станцыі за апошнія два гады падаецца наступная табліца (гл. табл. № 1, стар. 6—7).

Праглядаючы лічбы табліцы, мы знаходзім пацьвярджэньне таго, што па кліматычных умовах раён Станцыі падзяляецца на тры часткі. Адначасова назіраецца, што тэмпэратура вясны 1927 году і асабліва вясны ды ўсяго лета 1928 г. была значна зьніжана. Тое самае назіраецца і з вопадзямі як у 1927 годзе, так і 1928 годзе; ліпень і частка чэрвеня па Случчыне далі значнае адхіленьне ад нормы ў часе самога росту, а потым 27 верасьня быў замаразак, які памарозіў бульбоўнік.

Вось гэтыя няспрыяючыя кліматычныя ўмовы вельмі адмоўна адбіліся на росьце расьлін і на ўраджаі. Пры такіх няспрыяючых умовах некаторыя з культур у досьледах з сортаспрабаваньнем ды інш. зусім загінулі, а ў тых досьледах, якія былі даведзены да канца, расьліны не маглі сябе належным чынам выявіць; таксама-ж, і пажыўныя матэрыі, унесеныя пад досьлед, не маглі быць выкарыстаны поўнасьцю, ні бульбай ні кораньплодамі ды іншымі культурамі.

Тэмпэратура і вопадзі раёну дзейнасьці станцыі за 1927-28 г.

Месяцы	Назва раёну	1927 год				
		Тэмпэратура			Вопадзі ў	
		Сярэдн.	Норма	Адхілен. ад нормы	Сума	Лік дзён з вопадзямі
Красавік	Барысаўскі . .	4,25	—	— 1,1	49	20
	Менскі . . .	4,95	—	— 0,25	68,2	19,6
	Слуцкі	—	—	—	56,5	18
Май	Барысаўскі . .	8,6	—	— 4,0	90,3	20,6
	Менскі	9,6	—	— 2,8	77,9	22,1
	Слуцкі	—	—	—	67,6	19,4
Чэрвень	Барысаўскі . .	16,1	—	+ 0,05	102,0	18,5
	Менскі	17,1	—	+ 1,1	90,4	16,1
	Слуцкі	—	—	—	53,4	13,5
Ліпень	Барысаўскі . .	19,1	—	+ 1,1	68,6	13,5
	Менскі	20,2	—	+ 2,7	53,4	9,8
	Слуцкі	—	—	—	55,3	8,8
Жнівень	Барысаўскі . .	17,7	—	+ 1,0	108,8	15
	Менскі	18,1	—	+ 1,8	104,7	13,5
	Слуцкі	—	—	—	87,5	10,2
Верасень	Барысаўскі . .	12,1	—	0,55	110,8	18,8
	Менскі	12,9	—	+ 1,4	102,1	15,7
	Слуцкі	—	—	—	77,1	14,8
Кастрычнік	Барысаўскі . .	5,8	—	+ 0,15	78,5	21,5
	Менскі	6,2	—	+ 0,55	48,9	19
	Слуцкі	—	—	—	29,2	15

Увага. Лічбы паказаны сярэднія па раёнах ад некалькіх мэтэаралёгічных станцыя Барысаў, Рудня; у Менскі — Менск, Мар'іна-Горка, Чэрвень, Ма дворцы, Старобін, х. Морын, Крынкі і Вярхуцін.

Даных норм тэмпэратур за 1927 г. няма. Даных тэмпэратур па Слуцк

Табліца № 1.

паводле матэрыялаў Белгеафіза, даных Мэтстанцый.

1928 год								
мілімэтрах		Тэмпэратура			Вопадзі ў мм.			
Норм. вопадзяй	Адхіл ад нормы	Сярэдн.	Норма	Адхіл ад нормы	Сума	Лік дзён з вопадзямі	Норма вопадзяй	Адхіл ад нормы
42,8	+ 13,6	3,7	5,6	— 1,9	54,3	14,3	—	— 5,7
43.6	+ 56,6	4,1	5,4	— 1,1	26,4	12	—	— 17,4
45,5	+ 24,1	—	—	—	47,1	14,8	—	+ 1,3
54,3	+ 67,0	11,8	—	— 1,4	100	20	53,3	+ 51,7
59,4	+ 33,0	12,4	—	+ 0,05	85,8	15,8	58,7	+ 27,1
59,6	+ 15,6	—	—	—	61,6	14	60,0	+ 1,6
81,5	+ 23,0	11,9	16,9	— 4,85	98,6	23	80,5	+ 18,4
78,6	+ 14,5	12,2	16,5	— 4,65	89,5	16	63,2	+ 10,0
63,5	— 27,1	—	—	—	59,7	15	76,2	— 16,5
94,5	— 28,0	16,55	18,55	— 2,0	70,4	16,5	79,1	— 36,9
97,1	— 45,1	17,1	18,15	— 1,05	53,4	13	87,0	— 43,7
112,6	— 49,6	—	—	—	45,6	10,7	111,6	— 64,9
77,0	+ 42	14,25	16,6	— 2,35	97,5	18	77,3	30,4
75,6	+ 22	14,75	16,4	— 1,65	44,4	13	74,2	— 27,9
73,6	+ 13,7	—	—	—	51,8	14	73,7	— 10,7
59,0	+ 88,8	10,8	11,75	— 0,95	60,6	15	59,5	+ 1
55,3	+ 86,5	11,55	11,65	— 0,2	61,6	11	55,6	+ 5,9
56,1	+ 38,3	—	—	—	68,5	12	58,0	+ 10,7
—	—	5,1	5,7	— 0,6	46,6	16	48,3	—
—	—	5,2	5,5	— 0,3	46,2	17	45,7	—
—	—	—	—	—	33,1	14	46,2	—

Напрыклад: у Барысаўскі раён увайшлі—Бобр, Бягомль, Плешчаніцы, Заказьнік, Лагойск, Слабодка, Бірчукі і Мрочкі; у Слуцкі — Любань, Ямінск, Морач, Нава-

раёну няма за адсутнасьцю ў гэтым раёне мэтстанцыі 2-га разраду.

Дасьледчая праца.

Досьледы ў 1928 годзе праводзіліся па праграме ды інструкцыі Бюро Сялян-Дасьледчыкаў, надрукаванай у 1927 годзе. Тэхніка правядзеньня досьледаў была большменш аднолькавая; закладка і падлік досьледаў праводзіліся сялянамі-дасьледчыкамі пры непасрэдным удзеле прадстаўніка Станцыі ці агранома, і толькі ў рэдкіх выпадках самымі сялянамі. Мінэральныя ўгнаеньні даваліся амаль для ўсіх досьледаў Станцыяй праз аграномаў. Нормы ўгнаеньняў на гектар былі ўжыты наступныя: азоту ў чылійскай салетры—45 кгр., ці 3 цэнтн. салетры; калію ў каліевай солі—45 кгр., ці 1,5 цэнтн. 30% каліевай солі; фосфару ў супэрфасфаце—45 кгр., ці 3,2 цэнтн. 14% супэрфасфату і фосфару ў фасфарыце—90 кгр., ці 9 цэнтн. фасфарыту. Цяпер разгледзім вынікі досьледаў па асобных культурах.

БУЛЬБА.

Культура бульбы ў раёне Станцыі заслугоўвае асаблівае ўвагі, бо яна мае ня толькі спажывецкае, але і прамысловае значэньне. Засеўная плошча яе з кожным годам расьце, у некаторых раёнах яна займае ад 14 да 17% усёй засеўнай плошчы. З бульбай сялянамі-дасьледчыкамі ў 1928 годзе праведзена 35 досьледаў, прычым частка гэтых досьледаў у распрацоўку не ўвайшлі.

1. Уплыў мінэральных угнаеньняў (чылійскай салетры, супэрфасфату і каліевай солі) на ўраджай бульбы.

На гэту тэму ў 1928 годзе было праведзена 14 досьледаў у наступных сел.-дасьл.: Лебедзя С. П.—у Капыльскім раёне, Грынько А. Н. і Жыгментовіча Я. М.—у Слуцкім раёне, Шыманскага Х. Л.—у Самахвалаўскім раёне, Качуры М. А.—у Пухавіцкім раёне, Гараніна І. К., саўгасе Натальеўск—загадчык Пюві М. Я., аграпункце Іванаўск—аграномам Івановым К. П. і камуне „Чырвоны Бераг" старшынёю Церашковічам А. І.—у Чэрвеньскім раёне, Трапашкі П. А.—у Сьмілавіцкім раёне, Фурса С. І. і Хадасэвіча Н. Ю—у Лагойскім раёне і іншых с.-д.

Гісторыя дасьледчых кавалкаў была наступная:

У 12 выпадках бульба высявалася па ўгноеным іржанішчы, у адным выпадку па ўгноеным (180 цэнтн.) аўсянішчы і ў адным выпадку бульба ішла па канюшынішчы пасьля 2-гадовага карыстаньня. Выраб глебы амаль ва ўсіх досьледах быў аднолькавы: у верасьні поле аралася на 10—12 см. глыбінёй, вясной, у маі месяцы, поле баранавалася звычай-

най бараной з жалезнымі зубамі і ў 2-х выпадках спрунжынавалася, а пасьля гэтага баранавалася і клалася мінэральнае ўгнаеньне. Супэрфасфат і каліевая соль клаліся перад сяўбой, а чылійская салетра клалася два разы: палова ў час сяўбы, а другая палова—па ўсходах. Бульба садзілася пад плуг між 11 мая і пачаткам чэрвеня, а галоўным чынам (11 выпадкаў) у другой палове мая. Сярэдні высеў на гектар 15—16 цэнтн. Сарты бульбы мясцовыя, але розныя: Рабінаўка, Сылезія, Вольтман ды інш. Усходы пачалі зьяўляцца на чацьверты тыдзень пасьля засеву, галоўным чынам у сярэдзіне чэрвеня. Даглядалася бульба амаль ва ўсіх досьледах аднолькава—першае баранаваньне праводзілася ў часе зьяўленьня ўсходаў, потым праз два тыдні яе першы раз асыпалі, а пасьля гэтага баранавалі, потым праз 15 дзён другі раз асыпалі і ў 4-х выпадках праз 10—12 дзён рабілі гэта трэці раз. Цьвіла яна, галоўным чынам, у пачатку жніўня. Выбіралася бульба між 20 верасьнем і 15 кастрычнікам. Вэгетацыйны пэрыяд (момант ад засеву да часу сьпеласьці) ва ўсіх досьледах быў 140—150 дзён. Падлік рабілі праз узважваньне бульбы з усяе дзялянкі плошчай у 100—132 кв. м. Досьледы праведзены на супесях і суглінках. Вынікі досьледаў паданы ў табліцы № 2.

Табліца № 2.

Уплыў мінэральных угнаеньняў (чылійскай салетры, каліевай солі і супэрфасфату) на ўраджай бульбы.

№№ чарговыя	СХЭМЫ	На суглінку		На супесі		Дабаўка			
						На суглінку		На супесі	
		Сярэдні ўрадж. у цнт. на гект.	Лік досьледаў	Сярэдні ўрадж. у цнт. на гект.	Лік досьледаў	Абсалют. у цэнтн. на гект.	Адносная ў процантах	Абсалют. у цэнтн. на гект.	Адносная ў процантах
1	Без угнаеньня . . .	155,00	8	138,68	6	0	0	0	0
2	Салетры 3 цэнтн. . .	179,04	8	176,60	6	24,04	15,50	37,92	27,3
3	Каліевай солі 1,5 цэнтн.	175,53	8	164,46	6	20,53	13,24	25,78	18,60
4	Салетры 3 ц.+кал. солі 1,5 цэнтн. . . .	192,8	8	184,62	6	37,80	24,38	45,94	33,1
5	Салетры 3 цэнтн.+супэрф. 3,2 цэнтн. .	190,16	8	179,65	6	35,16	22,68	40,97	29,5
6	Салетры 3 ц.+супэр. фасф. 3,2 ц.+каліевай солі 1,5 цэнтн.	216,64	8	229,11	6	61.64	39,76	90,43	65,2

Праглядаючы лічбы табліцы, мы бачым, што сярэдні ўраджай бульбы па мінэральных угнаеньнях бяз гною даволі высокі, каля 18—20 тонн. (1080—1200 пуд.) на гектар. Пры гэтым на супесях эфэкт мінэральных угнаеньняў значна большы, чым на суглінках. Тлумачыцца гэта тым, што на суглінках пазьней сеялі, быў больш расьцягнуты вэгетацыйны пэрыяд, і 27 верасьня бульба яшчэ цьвіла і была прыхвачана замаразкам, у зьвязку з чым бульба ня скончыла свайго поўнага росту і дала меншы ўраджай.

2. Уплыў мінэральных угнаеньняў бяз гною і на фоне гною на ўраджай бульбы.

Па гэтым пытаньні было праведзена ўсяго 12 досьледаў Праводзіліся яны ў наступных сялян-дасьледчыкаў: Чаркаса А. С.—Капыльскага раёну, Гармазія і Фурса У. Л.—Койданаўскага раёну, с.-г. арцелі „Згода"—Любаньскага раёну, Касьцяневіча С. Я.—Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, Пятровіча З. К. і Кунскага Г. П.—Лагойскага раёну, Гурко Я. Я., Паўлоўскага П. Т. і Гаўрыльчыка А. А.—Барысаўскага раёну, і Якімовіча Р.—Бярэзінскага раёну.

Гісторыя дасьледчых кавалкаў больш-менш аднолькавая. У тых выпадках, дзе мінэральнае ўгнаеньне клалася бяз гнойнага фону, там было раней жыта па гнаі, а там, дзе папярэдняя культура жыта была бяз гною, клаўся гной пад бульбу ў 180 і 360 цэнтн. на гектар. Глеба выраблялася так: з восені іржонішча аралася, вясной, у канцы красавіка ці ў пачатку мая, баранавалася і перад сяўбой клаліся ўгнаеньні. Сеялі між 10—27 мая. Пасьля сяўбы на 4-ты тыдзень бульба баранавалася, потым праз два тыдні асыпалася першы раз і баранавалася ў адзін сьлед, а праз 12 дзён асыпалася ў другі раз і ў некаторых выпадках праз 10—12 дзён асыпалі трэці раз. Выбіралі бульбу ў большасьці выпадкаў каля 10 кастрычніка. Досьледы былі праведзены на 2-х тыпах глеб і атрыманы наступныя лічбы, згодна з табліцай № 3 (стар. 11).

З лічбаў табліцы выразна відаць, што як на фоне ўгноенага іржонішча, так і канюшынішча на супесі—мінэральнае ўгнаеньне супэрфасфат і калійная соль выяўляюць сябе даволі выразна. Па канюшынішчы супэрфасфат на супесі і суглінку дае дабаўкі каля 27%, а каліевая соль—каля 20%. Тое самае мы назіраем і на гнойным фоне. Такім чынам, па велічыні дабаўкі супэрфасфат займае ва ўсіх выпадках першае месца. Аб выгоднасьці гэтых мінэральных угнаеньняў бяз гною і на ўгноеным фоне ці разам з гноем пакуль цяжка сказаць што-небудзь канкрэтнае, але ў кожным разе можна быць упэўненым, што ўжываць мінэральныя

Табліца № 3.

Уплыў мінэральных угнаеньняў бяз гною і на фоне гною на ўраджай бульбы.

№№ п/п	С Х Э М А	Сярэдні ўраджай на сугл.	Лік досьледаў	На супесі ў цэнтн. на гект.	Лік досьледаў	Дабаўка			
						На суглінку		На супесі	
						Абсалют. у ц. на г.	Адносн. у %%	Абсалют. у ц. на г.	Адносн. у %%
1	Без угнаеньня	150,69	5	258,39	2	0	0	0	0
2	Супэрфасфат 3,2 цэнт.	190,36	5	333,57	2	39,67	26,32	75,18	29,09
3	Каліевая соль 1,5 цэнт.	181,06	5	307,41	2	30,37	20,15	49,02	18,97
4	Супэрфасф. 3,2 цэнт.+кал. с. 1,5 цэнт. .	213,93	5	344,65	2	63,24	41,96	86,26	33,38
5	Гной 360 цэнт.	237,87	2	275,34	3	107,61	82,61	95,39	53,00
6	Гной 360 цэнт.+супэрфасф. 3,2 цэнт. .	283,78	1	—	—	154,21	119,01	—	—
7	Гной 360 цэнт.+кал. солі 1,5 цэнт. .	245,45	1	—	—	115,88	89,43	—	—
8	Гной 360 ц.+супэрфасф. 3,2 ц.+каліев. солі 1,5 цэнт.	299,76	1	—	—	170,19	131,11	—	—
9	Гной 180 цэнт.	209,66	2	101,51	1	—	—	—	—
10	Гной 180 цэнт.+кал. соль 1,5 цэнт. .	228,50	1	132,51	1	5,74	2,57	31,00	30,53
11	Гной 180 цэнт.+супэрф. 3,2 цэнт. . .	259,45	1	168,16	1	36,69	16,47	56,65	55,18
12	Гной 180 ц.+к. с. 1,5 ц.+супэрф. 3,2 ц.	261,58	2	160,73	1	51,92	24,76	59,22	58,33
13	Гной 180 ц.+супэрф. 3,2 ц.+сал. 2 ц. .	294,84	1	—	—	98,28	50,00	—	—
14	Гной 360 ц.+салетры 0,96 ц.+супэрф. 3,2 ц. +попелу 6,4 цэнтн.	—	—	240,00	1	—	—	138,49	136,42

ўгнаеньні (каліевую соль і супэрфасфат) на глебах, запраўленых перагноем, выгадна.

У сувязі з тым, што пры закладцы досьледаў непасрэдна сялянамі і аграномамі была некаторая нявытрыманасьць праграмы, усіх досьледаў аб'яднаць немагчыма і прыходзіцца гаварыць аб іх паасобку. Так, напрыклад, былі праведзены два досьледы ў Лаўруковіча А. Я.—Вузьдзенскага раёну і Мініча А. А.—Старобінскага раёну. Досьледы былі праведзены на ўгноеным іржонішчы, якое было ўзарана на зіму, потым вясной баранавалася і пасьля ўгнаеньня засаджвалася бульбай у пачатку мая. Догляд бульбы быў звычайны, раней апісаны. З паданых досьледаў атрыманы наступныя лічбы (таб. № 4).

Табліца № 4.

Уплыў гною, мінэральных угнаеньняў і попелу на ўраджай бульбы.

№№ па чарзе	Схэма	Сярэдні ўраджай на супесі ў цэнтнэрах на гект.	Лік досьледаў	Дабаўка	
				Абсалют. у цэнтн. на гектар.	Адносная ў проц.
1	Без угнаеньня	43,25	1	0	0
2	Гною 360 цэнт.	101,26	2	58,01	134,12
3	Кал. солі 1,5 цэнт	82,87	2	39,62	91,60
4	Салетры 2,15 цэнт. . . .	84,67	1	41,42	95,76
5	Супэрфасф. 0,53 ц.+кал. солі 1,38 ц.	56,96	1	13,71	31,70
6	Салетры 2,15 ц.+супэрф. 0,53 ц. .	92,38	1	49,13	113,59
7	Кал. солі 1,38 ц.+салетры 2,15 ц.	110,84	1	67,59	156,27
8	Попелу 10 цэнт	61,27	1	18,02	41,66

З табліцы, як і ў ранейшых досьледах відаць выгаднасьць ужываньня мінэральных угнаеньняў на супесях, а таксама попелу, які на кожны цэнтнэр дае каля 2-х цэнтнэраў дабаўкі бульбы.

3. Параўнаўчае дзеяньне торфу і гною на ўраджай бульбы.

На гэту тэму быў праведзен адзін досьлед у селянінадасьледчыка Веліханава С. з Самахвалавіцкага раёну на суглінку. Няўгноенае іржонішча было ўзарана на 6 см. у жніўні месяцы зараз-жа пасьля таго, як было зжата жыта. У верасьні поле баранавалася, а ў палове кастрычніка было ўзарана на зіму глыбінёю на 12 см. Вясной, 6 мая, поле спрунжынавалася ў два сьляды і потым баранавалася. 1 мая быў вывезены гной і подсьцілачны торф, атрыманы з-пад кароў у зімовую пару, а 18 мая была пасаджана бульба пад плуг на глыбіню 10 см. Сорт бульбы Вольтман. Першы раз баранавалі поле 15 чэрвеня, а ўсходы зьявіліся 17 чэрвеня. Асыпалі тры разы ў працягу з 21 чэрвеня па 17 ліпня. Выбіралі 10 кастрычніка. Пры падліку важылася ўся бульба з дзялянкі плошчаю 100 кв. м. Атрыманыя вынікі паказаны ў табл. № 5.

Табліца № 5.

Параўнаўчае дзеяньне торфу і гною на ўраджай бульбы.

№№ па чарзе	Схэма	Ураджай на гектар у цэнтн.	Дабаўка	
			Абсалют. у цэнтн. на гект.	Адносн. ў проц.
1	Без угнаеньня	126,81	0	0
2	Торфу подсьцілачнага 360 цэнт . . .	361,88	235,07	185,2
3	Гною 360 цэнт	348,33	221,52	174,68

Лічбы табліцы вельмі добра сьведчаць аб тым, што ўраджай бульбы па подсьцілачнаму торфу быў лепшы, чым па гною, і што торф даў каля 185 % дабаўкі супроць кантролю.

Бульбоўнік, які красуе ў жніўні месяцы, без угнаеньня значна меншы і горшы, тымчасам, як па подсьцілачнаму торфу густы, высокі, цёмна-зялёнага колеру.

Адгэтуль відаць, што ўжываць на ўгнаеньне подсьцілачны торф пад бульбу вельмі карысна.

Канчаючы агляд культуры бульбы, для большага ўгрунтаваньня вынікаў трэба параўнаць лічбы досьледаў гэтага 1928 году з лічбамі мінулых гадоў, надрукаванымі ў справаздачы па Менскай Расьлінаводчай Станцыі ў „Выніках працы Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў за 1927 год".

Вось калі разгледзім параўнаўчыя лічбы дабавак ураджаю бульбы на суглінку, паказаныя ў табліцы №6, дык убачым:

Табліца № 6.

Дабаўка ўраджаю бульбы ад ужываньня мінэральных угнаеньняў на фоне гною і бяз гною на суглінку па даных ураджаю 1926—1928 г.

№№ па чарзе	Назва дзялянак і колькасьць угнаеньня на гектар	На фоне гною 180 цэнтн.			Бяз гною			Увага
		Дабаўка ў цэнтн. на гектар			Дабаўка ў цэнтн. на гектар			
		1296—27 г.	1928 г.	Сярэд.	1926—27 г.	1928 г.	Сярэд.	
1	Без угнаеньняў ураджаю . . .	110,96	209,66	160,31	144,71	155	149,85	Салетры ў 1926-27 г. было паложана 1,8 цэнт., а ў 1928 г.— 3,0 цэнт. Адмоўная дабаўка па салетры ў 1927 г. была з прычыны познага яе ўнясеньня—у лепені м-цы па версе бульбы ў радкі.
2	Салетр. чылійск. ад 1,8 да 3-х цэнт .	—7,01	—	—7,01	+18,26	+24,04	+21 15	
3	Супэрф. 3,2 цэнт .	+11,66	+36,69	+24,17	+12.61	+39,67	+26,14	
4	Каліев. соль 1,5 ц.	+15,25	+5,74	+10,49	+3,14	+20,53	+11,83	
5	Салетра 1,8—3 ц.+ +супэрф. 3,14 — 3,2 ц. . . .	+4,84	—	+4,84	+30,87	+35,16	+33,01	
6	Сал. 1,8—3 ц.+кал. соль 1,5 ц. . .	+0,66	—	+0,66	+21,4	+37,8	+29,6	
7	Супэрф. 3,14 — 3,2 ц.+кал соль 1,5 ц. . . .	+27,19	+51,92	+39,55	+15,15	+63,64	+39,39	
8	Салетр. 1,8—3 ц.+ +супэрф. 3,14— 3,2 ц.+к. с. 1,5 ц.	+13,44	—	+13,44	+36,73	+61,64	+49,18	

З табліцы № 6 відаць, што супэрфасфат як на фоне гною, так і бяз фону дае вельмі значную дабаўку, у сярэднім каля 25 цэнтн., ці на кожны цэнтн. супэрфасфату прыпадае 8 цэнтн. бульбы. Каліевая соль у сярэднім дае каля 11 цэнтн. дабаўкі, ці на 1 цэнтн. каля 7 цэнтн. бульбы. Цяпер калі перавесьці кошт угнаеньня і бульбы на грошы па цане 1 цэнтн. супэрфасфату 3 р. 60 кап., 1 цэнтн. каліевай солі—6 р. 30 кап. і 1 цэнтн. бульбы—2 руб., дык убачым, што супэрфасфат у ліку 3,2 цэнтн. дае ўмоўна чыстага прыбытку на гектар 38 руб. 48 кап., а каліевая соль у ліку 1,5 цэнтн.—12 р. 55 кап. Адгэтуль ужываньне гэтых угнаеньняў пры такіх суадносінах цэн зьяўляецца карысным, асабліва супэрфасфат. Што-ж да чылійскай салетры, дык яна адна ў мінулыя гады дала адмоўныя вынікі і, паложаная разам з

іншымі ўгнаеньнямі, зьнізіла ўраджай ў 1926 годзе з прычыны таго, што позна яе палажылі—у ліпені месяцы па версе. У 1928 годзе хоць яна была паложана і сваячасова, але, з прычыны няспрыяючых кліматычных умоў (паніжаная тэмпэратура) у працягу ўсяго лета, вэгетацыйны пэрыяд (пэрыяд росту) быў зацягнуты да восені і бульба яшчэ ў час красаваньня была замёрзла, ад чаго рост быў спынены, загадзя. Таму азот салетры ня мог быць належна выкарыстаным.

На супесі салетра была лепш выкарыстана, таму што тэмп разьвіцьця расьлін на супесі куды шпарчэйшы, чым на суглінку, што вельмі яскрава сьцьвярджаюць лічбы табл. № 7.

Табліца № 7

Дабаўка ўраджаю бульбы ад ужываньня мінэр. угн. на фоне гною і бяз гною на супесі паводле даных ураджаю 1926—27 і 28 г.

№№ па чарзе	Назва дзялянак і колькасьць угнаеньняў на гектар	На фоне гною 180 цэнтн.			Бяз гною			Ува га
		Дабаўка ў цэнтн. на гектар			Дабаўка ў цэнтн. на гектар			
		1926—27 г.	1928 г.	Сярэд.	1926—27 г.	1928 г.	Сярэд.	
1	Без угнаеньня (ураджай) . .	119,87	101,51	110,69	—	138,68	138,68	Сал. чыл. клалася ў 1926—27 г. 1,8 цэнтн., а ў 1928 г.—3 цэнтн. Досьледы на супесі бяз гною ў 1927 г. з мінэр. угн. не праводзіліся.
2	Салетр. чылійск. ад 1,8 ц. да 3 ц. .	+30,56	—	+30,56	—	+37,92	+37,92	
3	Супэрфосф. 3,14—3,2 ц.	+37,53	+56,65	+47,09	—	—	—	
4	Калійн. соль 1,5 ц.	+17,91	+31,00	+24,15	—	+25,78	+25,78	
5	Салетра 1,8—3 ц.+ +к. с. 1,5 ц. .	+21,56	—	+21,56	—	+45,94	+45,94	
6	Салетра 1,8—3 ц.+ +суп. 3,14—3,2 ц.	+42,33	—	+42,33	—	+40,97	+40,97	
7	Супэрф. 3,14 — 3,2 ц.+кал. соль 1,5 ц.	+28,97	+59,22	+44,09	—	—	—	
8	Салетра 1,8—3 ц.+ суп. 3,14—3,2ц.+ к. с. 1,5 ц. . .	+46,62	—	+46,62	—	+90,43	+90,43	

Выходзіць, што чылійская салетра як на фоне гною ў 1926 г., так і бяз гною ў 1928 годзе дала значную дабаўку—

у сярэднім каля 34 цэнтн. на гектар. Супэрфасфат даў дабаўку на фоне гною каля 47 цэнтн., а каліевая соль як на фоне гною, так і бяз гною каля 24% — значна больш, чым на суглінку.

Адсюль вывад — каліевую соль наогул лепш ужываць пад бульбу на супесях, а супэрфасфат на суглінку.

ЖЫТА.

1. Параўнаўчае дзеяньне торфу і гною на ўраджай жыта.

На гэту тэму было праведзена тры досьледы ў настаўніка-дасьледчыка Гуско Я. Я.—Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, сялян-дасьледчыкаў Веліханава С. І.—Самахвалаўскага раёну і Запольскага К. Я.—Сьмілавіцкага раёну.

На суглінку дасьледчыя кавалкі адышлі пад папар з-пад 2-гадовай канюшыны, а на супесі—з-пад аўса. Выраб на суглінку быў аднолькавы—раней паспрунжынаваная ў два сьляды глеба ў ліпені праз тыдзень была ўзарана на глыбіню 13 см. і пабаранавана. Перад сяўбой за тыдзень былі паложаны ўгнаеньні і завораны. На супесі пад папар было ўзарана аўсянішча з восені і ўсё лета падтрымліваўся чорны папар, а перад сяўбой былі паложаны ўгнаеньні.

Падрыхтоўка торфу для досьледу была наступная: торф нізінных балот, добра праветраны з вясны, ужываўся на подсьціл каровам і адначасова быў падрыхтаваны кампост з сырым торфам і фасфарытамі; на 40 частак торфу давалася адна частка фасфарыту. Кампост увесь час трымаўся вільготным праз паліваньне вадой і за ўвесь час два разы перасыпаўся. Каліевая соль клалася разам з торфам на полі перад сяўбой жыта. Звычайны праветраны торф клаўся перад сяўбой бяз жаднай апрацоўкі.

Сеялі ва ўсіх досьледах між 3—10 верасьня, высяючы па 1,5 цэнтн. жыта на гектар. Жыта ў двух выпадках было Пяткускае, а дзе быў праветраны торф — Прабштэйскае. Усходы былі вельмі дружныя і рунь з восені добра разьвівалася. Вясной на суглінках назіраліся месцамі выпарваньні, але ня гледзячы на гэта наогул жыта было вельмі добрае. Жалі яго ў канцы жніўня. Досьледы асабліва на суглінку, былі строга вытрыманымі, згодна з праграмай і інструкцыяй пры 2-разовай паўторнасьці, разьмерам дзялянак у 250 кв. мэтраў, і атрыманы наступныя вынікі (табл. № 8, стар. 17).

Дабаўка па кампаставанаму торфу з фасфарытамі складае каля 50%, і на паложаную разам з торфам каліевую

Инв. 1953 г. Б4 28263

Інв. 1053 г. БА 20263

Табліца № 8.

Параўнаўчае дзеяньне торфу і гною на ўраджай жыта.

№№ па чарзе	Схэма	На суглінку Сярэд. ўрадж. на гект у ц.		Лік досьледаў	На супесі Ураджай на гект. у цэнтн.		Лік досьледаў	Дабаўка							
								На суглінку				На супесі			
								Абсол. у цэн. на гектар		Адносная ў процант.		Абсол. у цэн. на гектар		Адносная ў процант.	
		Зерня	Саломы		Зерня	Саломы		Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы
1	Без угнаеньня . . .	8,76	15,11	2	6,81	13,62	1	0	0	0	0	0	0	0	0
2	Гною 360 цэнтн. . .	21,69	37,36	2	—	—	—	12,93	22,25	147,6	147,25	—	—	—	—
3	Торф кампастав. з фасфар. 360 цэнт. (на 40 ч. тор. 1 ч. фасфарыту).	13,26	21,17	2	—	—	—	4,5	6,06	51,35	40,1	—	—	—	—
4	Торф кампаст. з фасфар. 360 цэнт. + к. с. 1, 5 ц.	14,7	23,5	2	—	—	—	5,94	8,39	67,81	55,52	—	—	—	—
5	Торф подсьціл. 360 ц. .	20,43	34,31	2	—	—	—	11,67	19,20	133,21	127,06	—	—	—	—
6	Торф праветраны 360 ц.	—	—	—	11,40	27,40	1	—	—	—	—	4,59	13,78	67,4	101,17

Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна 17

соль прыпадае каля 15 проц. Торф звычайны на супесі даў дабаўку каля 67% па зярну і 101% па саломе. Тымчасам як подсьцілачны торф дае дабаўку амаль роўную з гноем. Гэта самае сьцьвярджае і малюнак досьледу з торфам с.-д. Веліханава С.

Адсюль выходзіць, што найлепш ўжываць на ўгнаеньне торф подсьцілачны, які амаль поўнасьцю можа замяніць сабою гной.

2. Уплыў лубіну, гною і камбінацыі іх з мінэральнымі ўгнаеньнямі на ўраджай жыта.

Досьледаў на гэту тэму было праведзена 8 у наступных сялян-дасьледчыкаў: Вярбіцкага К. Б.—Чырв.-Слабодзкага раёну, на аграпункце Манголінава—Узьдзенскага раёну, селяніна-дасьледчыка Трапашка П. і Крайко С. П.—Сьмілавіцкага раёну, Філіповіча А.—Смалявіцкага раёну, Казлоўскага М. і Гуско Я. Я.—Астр.-Гарадз. раёну і адзін досьлед—у Барысаўскім раёне. Дасьледчыя вучасткі ва ўсіх досьледах раней былі пад аўсом. Аўсянішча першы раз аралася вясной як пад лубін, так і пад чысты папар. Лубін сеялі ў пачатку чэрвеня, прычым пад яго, паводле схэмы і вызначанай нормы, клаўся фасфарыт за два тыдні да сяўбы. Заворваўся лубін перад сяўбой таксама за два тыдні. Жыта сеялася ў канцы жніўня з разьлікам 1,7 цэнтн. на гектар. Жалі жыта таксама ў канцы жніўня 1928 г.

Досьледы ў большасьці былі праведзены з 2-разовай паўторнасьцю. Плошча дзялянак 250 кв. мэтр. Вынікі досьледаў наступныя (табл. № 9, стар. 19).

Ураджай жыта па лубіну ў параўнаньні з гноем 360 ц. на гектар быў ня меншы, а па лубіну з фасфарытамі вышэйшы, чым на гнаі. Цяпер, што да мінэральных угнаеньняў на фоне 180 цэнтн. гною, дык як супэрфасфат, так і тамасаўка даюць вельмі значную дабаўку.

Тамасаўка і супэрфасфат, паложаныя паасобку, даюць дабаўкі каля 70%, а паложаныя разам з лубінам—каля 150%, і на долю адных гэтых мінэральных ўгнаеньняў застаецца каля 24% дабаўкі. Каліевая соль, паложаная разам з лубінам, дае меншы за фасфарытнае ўгнаеньне ўраджай на 10%.

Прычынай больш павышанага ўраджаю жыта па лубіну, чым па гнаі, у 1928 г. тлумачыцца часткова тым, што з прычыны залішняй веснавой і васеньняй вільготнасьці ўгноеная гноем сугліністая глеба была больш шчыльнай, чым па лубіну, дзякуючы чаму ў большым разьмеры і часьцей выпраўвала жыта па гнаі.

Табліца № 9.

Уплыў лубіну, гною і камбінацыі іх з мінэральнымі ўгнаеньнямі на ўраджай жыта.

№№ па чарзе	Схэма	Сярэд. урадж. на супесі ў цэнт. на гект.		Лік досьледаў	Ураджай на суглінку ў цэнт. на гект.		Лік досьледаў	Дабаўка					
								На супесі				На суглінку	
								Абсал. у цэн. на гектар		Адносная ў процантах		Абсал. у цэнтн. на гект.	Адносная ў процантах
		Зерня	Саломы		Зерня	Саломы		Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	
1	Без угнаеньня.	7,00	15,81	4	5,60	—	1	—	—	—	—	—	—
2	Лубін	15,82	23,99	4	19,50	—	1	8,82	8,18	126,0	51,74	13,90	248,21
3	Лубін+9 цэнт. фасф. пад. лубін .	16,20	28,23	4	—	—	—	9,20	12,42	131,42	78,55	—	—
4	Лубін+9 цэнт. фасф. пад жыта .	16,06	24,84	3	—	—	—	9,06	9,03	129,42	57,11	—	—
5	Гною 360 цэнт.	15,72	25,45	3	—	—	—	8,72	9,64	124,57	60,97	—	—
6	Гною 180 ц.+тамасаўка 3,5 ц. .	18,69	27,14	1	—	—	—	11,69	11,33	167,0	71,66	—	—
7	Гною 180 ц.+супэрф. 3,2 ц. .	19,40	27,66	1	—	—	—	12,40	11,85	177,14	74,95	—	—
8	Лубін 24,5+супэрф. 3,2 цэнтн. .	17,02	31,47	3	—	—	—	10,02	15,66	143,14	99,05	—	—
9	Лубін 24.5+там. 3,5 . . .	17,90	32,58	3	21,04	—	1	10,90	16,77	155,71	106,07	15,44	275,70
10	Лубін 24,5+к. с. 1,5 . . .	16,86	26,56	1	—	—	—	9,86	10,75	140,85	67,99	—	—
11	Супэрф. 3,2+там. 3,5 . . .	12,54	29,78	1	—	—	—	5,49	12,43	77,87	71,64	—	—
12	Салетра па версе 0,53 . . .	13,16	28,32	1	—	—	—	6,11	10,97	86,66	62,64	—	—
13	Тамасаўка 3,5 ц.	11,49	24,97	1	9,88	—	1	4,49	9,16	64,1	57,93	4,28	76,43

3. Уплыў мінэральных угнаеньняў супэрфасфату і каліевай солі на ўраджай жыта.

На гэту тэму было праведзена 4 досьледы ў наступных с.-д.: Корсіка М. Я.—Сьмілавіцкага р., Шыманскага Х. Л.—Самахв. раёну і Асташкевіча Л. і Асташкевіча Ў.—Астраш.-Гарадзецкага раёну. Ва ўсіх досьледах папар быў незаняты, угноены пасьля аўса. Угнаеньні клаліся перад сяўбой за два тыдні. Сеялі ў канцы жніўня 1927 году і жалі ў жніўні 1928 г. Перашкод у досьледах ня было, атрыманы наступныя даныя:

Табліца № 10.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай жыта.

№№ чарговыя	Схэма	На суглінку Ураджай на гект. у цэнтн.		Лік досьледаў	Дабаўка			
					Абсолютная		Адносная ў проц.	
		Зерня	Саломы		Зерня	Саломы	Зерня	Саломы
1	Без угнаеньня. . .	13,47	26,90	4	0	0	0	0
2	Супэрф. 3,2 цэнт. .	17,10	33,37	4	3,63	6,47	26,8	24,00
3	Кал. с. 1,5 цэнт. .	16,15	29,39	1	2,68	2,49	17,0	11,3
4	Супэрфасфату 3,2 ц.+к. с. 1,5 ц.	23,07	39,79	2	5,18	12,89	29,0	47,9

Дабаўка ўраджаю жыта па супэрфасфату даволі значная, прыблізна на кожны цэнтн. супэрфасфату атрымліваецца 1,2 цэнтн. зерня жыта. Каліевая соль на суглінку дае меншую дабаўку, каля 10%. У заключэньне, параўнаўшы вынікі дзеяньня мінэральных угнаеньняў на ўраджай жыта гэтага і мінулага гадоў, убачым наступнае: каліевая соль на суглінку летась дала дабаўку зерня 18,8%, ці 1,2 цэнтн., а ў гэтым годзе 17%, ці 2,6 цэнтн.; супэрфасфат на супесі на фоне гною (180 цэнтн.) летась даў дабаўкі 50%, ці 3,2 цэнтн., а ў гэтым годзе 51%, ці 3,3 цэнтн. Тамасаўка выявіла сябе прыблізна таксама, як і супэрфасфат. Дзеяньне ўгнаеньня такое самае, як і на суглінку. Адгэтуль можна з упэўненасьцю сказаць, што глебы нашы моцна спустошаны ў адносінах фосфару, які знаходзіцца ў мінімуме, і класьці яго пад жыта на глебах больш-менш запраўленых парагноем заўсёды карысна і патрэбна.

ПШАНІЦА.

Уплыў мінэральных угнаеньняў і гною на ўраджай пшаніцы.

Досьлед з азімай пшаніцай быў праведзены непасрэдна самім селянінам-дасьледчыкам Мяхедка К. Я., Заслаўскага раёну. Досьлед праведзены на сугліністай глебе на вучастку, дзе летась была бульба па ўгноеным іржонішчы. Пад бульбу клалася яшчэ каліевая соль і супэрфасфат. У верасьні за тыдзень перад сяўбой былі паложаны ўгнаеньні, апрача чылійскай салетры, якая клалася па версе без задзелкі. З праведзенага досьледу атрыманы такія вынікі.

Табліца № 11.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай пшаніцы.

№№ чаргования	Схэма	Ураджаі у цэнтн. на гект.		Дабаўка			
				Абсол. у цэнтн. на гектар		Адносная ў процантах	
		Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы
1	Без угнаеньня	7,95	17,58	0	0	0	0
2	Кал. солі 1,5 цэнтн. . .	8,14	18,45	0,19	0,87	2,4	4,9
3	Супэрфасф 3 цэнтн. .	9,64	20,2	1,69	2,62	21,2	14,8
4	Супэрфасф. 3 цэнтн. + кал. солі 1,5 цэнтн. . . .	9,85	21,7	1,90	4,12	23,9	23,3
5	Чыл. сал. 0,75 цэнтн. .	10,4	28,1	2,45	10,52	30,8	59,8
6	Чыл. сал. 0,75 ц. + супэрфасф. 3 ц. + к. с. 1,5 ц.	18,24	40,72	10,29	23,14	142,0	131,6
7	Гною з торфам подсьцілачным 180 цэнтн . .	16,32	35,68	8,37	17,10	105,2	96,6

З гэтае табліцы відаць, што каліевая соль дала зусім нязначную дабаўку, а супэрфасфат даў 21,2% і чылійская салетра 30,8%. Калі ўсе мінэральныя ўгнаеньні клалі разам, дык гэта дало дабаўку большую, чым палова гною. Нізкая дабаўка па калію тлумачыцца тым, што на суглінку калій не знаходзіцца ў мінімуме. Апрача таго, каліевая соль клалася пад бульбу.

АВЕС.

Авёс у раёне Станцыі высяецца большай часткай бяз усякіх угнаеньняў, і ўраджай яго даволі нізкі, каля 9 цэнтн. на гектар.

З аўсом праведзена 15 досьледаў. Распрацавана 14.

1. Уплыў мінэральных угнаеньняў (супэрфасфату і каліевай солі) на ўраджай аўса.

На гэту тэму было праведзена 11 досьледаў у наступных с.-дасьл.: Адамовіча К. М.—Чырв.-Слабодзкага раёну, Яновіча М. А.—Капыльскага р., Міхнюка Я. М.—Слуцкага раёну. Лянгіновіча Я.—Койданаўскага р., Папко М. І.—Заслаўскага р., райаграномам Камоска—Лагойскага р., Канюшыка І. С., Кішпурта Р. Р. і Яськевіча П.—Смалявіцкага р., Галуза А. А. і Боська С. П.—Барысаўскага раёну. Дасьледчыя кавалкі ў большасьці выпадкаў раней знаходзіліся пад жытам. Іржонішча ўсюды на зіму аралася, а вясной баранавалася і аралася другі раз. Угнаеньні клаліся перад самай сяўбой сеялі між 11 і 31 мая.

Усходы зьяўляліся на 7—8 дзень пасьля сяўбы, а каласіцца авёс пачынаў праз два месяцы, у канцы чэрвеня. Авёс пасьпеў у канцы жніўня і пачатку верасьня. Атрыманыя лічбы ўраджаю паказаны ў табліцы № 12, стар. 23.

Трэба адзначыць, што ўраджай аўса ў гэтым годзе наогул быў даволі высокі, што мы назіраем і на дасьледчых кавалках.

З лічбаў табліцы вельмі добра відаць, як мінэральныя ўгнаеньні павышаюць ураджай і даюць значную дабаўку як паасобку, так і разам. Пры гэтым супэрфасфат дае дабаўку большую чым каліевая соль на 1,2 цэнтн. на гектар, ці на 10—20%.

На кожны цэнтн. паложанага супэрфасфату прыпадае зерня аўса на суглінку 1,3 цэнтн., а на супесі 1,8 цэнтн., і на кожны цэнтн. каліевай солі прыпадае на суглінку 2,1 цэнтн., а на супесі 2,4 цэнтн. Калі супэрфасфат і каліевую соль палажыць разам, дык гэта павялічвае ўраджай прыблізна ўдвая.

Цяпер разгледзім дзеяньне іншых мінэральных угнаеньняў пры другіх камбінацыях па тых досьледах, якія былі закладзены непасрэдна самымі сялянамі.

2. Уплыў мінэральных угнаеньняў (чылійскай салетры, супэрфосфату і каліевай солі) і гною на ўраджай аўса.

Досьлед быў праведзены с.-д. Кіевіцкім С. з пасёлку Бухарына, Чырвона-Слабодзкага раёну. Поле, быўшае пад жытам, узарана на зіму, вясной баранавалася і аралася другі раз 8 мая. Угнаеньні—супэрфасфат і каліевая соль—былі паложаны 10 мая, а чылійская салетра па ўсходах 27 мая. Сеялі 12 мая пад барану, усходы зьявіліся 18 мая, а пасьпя-

Табліца № 12.

Уплыў мінэральных угнаеньняў (супэрфасфату і каліевай солі) на ўраджай аўса.

№№ парцовыя	СХЭМА	Сярэдні ўраджай на сугл. у цэн. на гект.		Лік досьледаў	Сярэдні ўраджай на супесі		Лік досьледаў	Дабаўка							
								На суглінку				На супесі			
								Абсалютн. ў цэнтн. на гект.		Адносная ў процант.		Абсалютн. ў цэнтн. на гект.		Адносная ў процант.	
		Зерня	Саломы		Зерня	Саломы		Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы
1	Кантроль . .	11,48	14,60	9	11,27	15,30	2	0	0	0	0	0	0	0	0
2	Суперфасфат 3,2 ц.	15,72	19,34	9	17,08	19,04	2	4,24	4,74	36,93	31,77	5,81	3,74	51,55	24,44
3	Каліев. солі 1,5 ц.	14,72	17,84	9	14,98	17,85	2	3,24	3,24	28,22	22,19	3,71	2,55	32,91	16,66
4	Супэрфасф. 3,2 ц.+ к. с. 1,5 ц. .	19,24	23,86	9	14,54	19,04	2	7,87	9,28	68,64	63,56	3,27	3,74	29,0	24,44
5	Гной 360 цэнтн. .	—	—	—	28,88	34,32	1	—	—	—	—	15,95	18,67	123,35	119,36
6	Гной 180 цэнтн. .	17,36	25,12	3	—	—	—	7,19	11,64	70,70	86,35	—	—	—	—
7	Кал. соль 1,5 ц.+ +супэрф. 3,2 ц.+ +гной 180 цэнтн.	14,19	14,74	1	—	—	—	4,79	3,55	50,95	31,72	—	—	—	—

ваць авёс пачаў 11 жніўня. Досьлед быў праведзены на супесі пры 2-разовай паўторнасьці пад кіраўніцтвам райагранома Расман Р. Атрыманы вельмі цікавыя вынікі, што відаць з ніжэй паказанай табліцы № 13.

Табліца № 13.

Уплыў мінэральных угнаеньняў і гною на ўраджай аўса.

№№ чарговыя	СХЭМА	Ураджай на супесі на гектар у цэнтнэрах		Дабаўка			
				Абсалютная ў ц. на гект.		Адносная ў процантах	
		Зерня	Салому	Зерня	Салому	Зерня	Салому
1	Кантроль	13,80	12,15	0	0	0	0
2	Салетра 1,5 ц. . . .	20,73	23,16	6,93	11,01	50,21	90,61
3	Супэрфасфату 3,2 ц. . .	17,32	15,67	3,52	3,58	25,50	29,46
4	Каліевай солі 1,5 ц. . .	15,12	13,06	1,32	0,91	9,56	7,48
5	Салетры 1,5 ц.+суп. 3,2 цэн.	21,87	15,55	8,07	3,40	58,47	27,98
6	Салетры 1,5 ц.+к. с. 1,5 ц.	22,55	17,84	8,75	5,69	63,40	46,83
7	Супэрфасфату 3,2 ц.+кал. соль 1,5 ц. . . .	20,33	14,73	6,53	2,58	47,31	21,23
8	Сал. 1,5 ц.+супэрф. 3,2 ц.+ +кал. с. 1,5 ц. . .	24,86	19,56	11,06	7,41	80,14	60,98
9	Гною 180 ц. . . .	23,85	20,55	10,05	8.40	72,82	69,13

З вынікаў досьледаў ясна відаць, што на першым месцы стаіць чылійская салетра, якая дае дабаўкі 6,93 цэнтн. зерня аўса, г. зн. 1 цэн. угнаеньня дае 4,6 цэнтн. дабаўкі зерня аўса. Супэрфасфат-жа даў дабаўкі 3,52 цэнт зерня, ці на 1 цэнтн. угнаеньня 1,1 цэнтн. зерня аўса і каліевая соль дала 1,32 цэнтн. дабаўкі, ці на 1 цэнтн. угнаеньня 0,8 цэнтн. зерня аўса. Калі чылійскую салетру, супэрфасфат і каліевую соль палажыць разам, дык гэта павялічвае ўраджай больш чым палова звычайнага гною на 1 цэнтн.

3. Уплыў мінэральных угнаеньняў—чылійскай салетры, тамасаўкі і каліевай солі—на ўраджай аўса.

Досьлед праведзены с.-д. Лявіцкім Т. Ф. Старобінскага р. на супесі на іржонішчы, узораным на зіму і вясной пабаранаваным. Тамасаўка і каліевая соль былі паложаны перад сяўбой, а чыл. сал. па ўсходах. Вынікі досьледаў наступныя:

Табліца № 14.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай аўса.

№№ чарговыя	СХЭМА	Ураджай на супесі ў ц. на гект.		Дабаўка			
				Абсалютн. у ц. на гект.		Адносная ў процантах	
		Зерня	Салома	Зерня	Салома	Зерня	Салома
1	Кантроль	8,1	11,25	0	0	0	0
2	Кал. соль 1,5 цэнтн. . .	9,47	12,50	1,37	1,25	16,91	11,11
3	Чыл. сал. 1,5 ц. . . .	12,40	17,38	4,30	6.13	53,08	54,48
4	Тамасаўка 3,6 ц. . . .	10,87	13,50	2,77	2,25	34,19	20,00
5	Тамастўка 3,6 ц.+кал. соль 1,5 ц.	10,97	13,84	2,87	2,59	35,43	23,02
6	Салетра 1,5 ц.+тамасаўка 3,6 ц.	15,77	18,50	7,67	7,25	94,66	64,44
7	Салетра 1,5 ц.+кал. с. 1,5 ц.	13,99	17,13	5,89	5,88	72,71	52,26
8	Салетра 1,5 ц.+кал. с. 1,5 ц.+там. 3,6 ц. . .	16,80	19,19	8.70	7,94	107,40	70,57

Па ўплыву на ўраджай першае месца займае салетра, потым тамасаўка і апошняе месца—каліевая соль.

4. Уплыў чылійскай салетры, фасфарыту і каліевай солі на ўраджай аўса.

Досьлед быў праведзены сел.-дасьл. Яблонскім Бабруйскага раёну на іржонішчы з звычайным, раней адзначаным

вырабам глебы. Досьлед праведзены на супесі. Усе ўгнаеньні былі паложаны 12 мая, а сеялі 19 мая. Усходы зьявіліся 24 мая, авёс пасьпеў 18 жніўня. Атрыманы наступныя лічбы ўраджаю.

Табліца № 15.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай аўса.

№№ чарговыя	СХЭМА	Ураджай на супесі		Дабаўка			
				Абсалютн. у ц. на гект.		Адносная ў процантах	
		Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы
1	Кантроль	8,19	9,42	0	0	0	0
2	Фасфарыт 3,8 цэнтн. . .	9,82	10,64	1,63	1,22	19,90	11,88
3	Фасфарыт 3,8 ц.+кал. солі 1,5 цэнтн. . . .	11,98	12,26	3,79	2,84	46,27	30,14
4	Фасфарыт 3,8 ц.+чыл. сал. 1,14 цэнтн. . . .	19,65	20,47	11,46	11,05	139,92	117,30
5	Фасфарыт 3,8 ц.+чыл. сал. 1,14+кал. с. 1,5 цэнтн. .	22,35	23,72	14,16	14,30	172,89	151,80

Табліца № 16.

Параўнаньне ўплыву мінэральных угнаеньняў на ўраджай аўса за 1927-1928 год.

Назва дзялянак і колькасьць угнаеньня ў цэнтн. на гектар.	Дабаўка ўраджаю ў цэнтн. на гектар							
	На суглінку				На супесі			
	1927 г.		1928 г.		1927 г.		1928 г.	
	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.
1. Без угнаеньня	11,63	17,89	11,48	14,60	7,55	10,90	11,27	15,30
2. Супэрфасфат ад 3,14 цэнтн. да 3,2 цэнт. . .	+ 4,41	+ 2,66	+ 4,24	+ 4,74	+ 4,33	+ 3,86	+ 5,81	+ 3,74
3. Каліевая соль 1,5 ц. . . .	+ 4,77	+ 3,60	+ 3,24	+ 3,24	+ 3,43	+ 3,23	+ 3,71	+ 2,55
4. Супэрф. ад 3,14 ц. да 3,2 ц.+ + каліев. 1,5 ц.	+ 8,84	+ 10,35	+ 7,87	+ 9,28	+ 5,96	+ 6,37	+ 3,27	+ 3,74

Лічбы дабавак па гадох вельмі блізкія. Пры гэтым заўважана, што каліевая соль на суглінку ў 1928 годзе, як

быццам дала, паніжэньне супраць мінулага году і ў параўнаньні з супэрфасфатам таксама. Гэта тлумачыцца, тым што калій ў глебе не знаходзіцца ў першым мінімуме, а потым досьледаў у гэтым годзе было 9, а летась толькі два. Агульная-ж тэндэнцыя павышэньня ўраджаю за абодва гады супадае, і як абсалютныя лічбы, так і лічбы ў процантах вельмі блізка сходзяцца між сабой. Напрыклад, супэрфасфат на суглінку ў 1927 годзе даў 38,1%, а ў 1928—36,93%; на супесі ў 1927 годзе—48,2%, а ў 1928 годзе—51,55%, а сумеснае ўгнаеньне супэрфасфатам і каліевай соляй дало на суглінку ў 1927 годзе—76,2%, а ў 1928 годзе—68,64% і на супесі ў 1927 годзе—76,8%, а ў 1928 годзе—29,2%. Досьледаў на супесі летась праведзена 6, а ў гэтым годзе толькі два, таму даныя на супесі мінулага году больш правільныя.

Аб дзеяньні кожнага з угнаеньняў на розных тыпах глеб вельмі яскрава сьведчыць дыяграма № 1, стар. 28).

ЯЧМЕНЬ.

Культура ячменю больш інтэнсыўная чым авёс, і пад яго заўсёды адводзяцца лепшыя кавалкі зямлі, і вельмі часта пад яго ўжываюць гной. Вось з мэтай вывучэньня дзеяньня мінэральных угнаеньняў на ўраджай ячменю і было праведзена 10 досьледаў.

1. Уплыў мінэральных угнаеньняў (чылійскай салетры, супэрфасфату і каліевай солі) на ўраджай ячменю.

На гэту тэму былі закладзены досьледы ў сялян-даследчыкаў: Германовіча М., Максімені М. Х. і Уласевіча — Чырвона-Слабодзкага раёну, Яновіча М. А. (два досьледы)—Капыльскага раёну, Яўменчыка—Смалявіцкага р. і Валаховіча М. В. і Валаховіча Ф.—Крупскага раёну.

Досьледы былі закладзены на бульбянішчы. Вясной поле баранавалася і аралася, а затым аралася другі раз перад самай сяўбой. Угнаеньні клаліся за два дні да сяўбы, апрача салетры, якая клалася па ўсходах. Сеялі між 15 і 25 мая ва ўсіх досьледах. Усходы зьявіліся праз 5—6 дзён пасьля сяўбы. Пасьпеў ячмень прыблізна каля 25 жніўня.

Вынікі досьледаў наступныя (таб. № 17, стар. 29).

Чылійская салетра дала каля 100 % дабаўкі ўраджаю на суглінку і 85% на супесі. Каліевая соль на суглінку дала 41,6% дабаўкі, а на супесі столькі сама як і салетра. Супэр-

Дыяграма № 1

Уплыў мінэральных угнаеньня на ураджай аўса ц. па даных ураджаю 1927 і 1928 г. ц. на гект. у цэнт.

На суглінку

Зерня	11.55	15.87	15.55	19.90
Саломы	16.24	19.93	19.66	26.05

На супесі

Зерня	9.41	14.48	12.98	14.02
Саломы	13.10	16.90	15.99	18.15

Кантр. супер 3,2, к.с. 1,15, суп 3,2 + к.с. 1,5

Дабаўка

Велічыня слупкоў і іх лічбы паказваюць ураджай з гектару ў цэнтн., а замаляваная цёмная частка слупкоў паказвае дабаўку па кожным угнаеньні.

Табліца № 17.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай ячменю.

№ № чарговыя	СХЭМА	Сярэдні ўрадж. на суглінку ў цэнтн. на гектар		Лік досьледаў	Сярэдні ўраджай на супесі на гект. у цэн.		Лік досьледаў	Дабаўка							
								На суглінку				На супесі			
								Абсал. ў ц. на гект.		Адносная ў процантах		Абсол. ў ц. на гектар		Адносная ў проц.	
		Зерня	Сал.		Зерня	Сал.		Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.
1	Без угнаеньня .	11,37	15,35	8	8,19	9,41	1	0	0	0	0	0	0	0	0
2	Каліев. соль 1,5 цэнтн. .	16,10	22,14	7	15,25	12,99	1	4,73	6,79	41,60	44,23	7,06	3,58	86,2	38,04
3	Супэрф. 3,2 ц.	15,74	22,70	7	16,92	13,36	1	4,37	7,35	38,43	47,88	8,73	3,95	106,59	41,97
4	Супэрф. 3,2 + + каліев. 1,4 ц.	22,22	32,38	7	17,15	13,65	1	10,85	17,03	95,42	110,94	8,96	4,24	109,4	45,05
5	Гной 180 ц. . .	23,21	30,66	2	—	—	—	7,49	12,14	47,64	65,55	—	—	—	—
6	Салетра 3 ц. .	10,0	—	1	15,15	11,57	1	5,19	—	106,23	—	6,96	2,16	84,98	25,82
7	Сал. 3 ц. + + кал. с. 1,5 ц.	18,80	—	1	16,55	13,91	1	13,99	—	290,85	—	7,36	4,50	89,79	47,82
8	Каліев. соль 1,5 ц. + суперф. 3,2 ц. + + сал. 3 ц. .	21,25	22,09	3	17,77	15,79	1	14,27	12,09	204,44	120,9	9,58	6,38	116,97	67,82
9	Гной 360 ц. . .	15,94	—	1	15,15	11,46	1	11,13	—	231,39	—	6,96	2,05	84,98	23,95
10	Салетра 3 ц. + + суп. 3,2 ц.	15,55	—	1	17,16	14,68	1	10,74	—	223,28	—	8,97	5,27	109,52	56,0

фасфат даў таксама значную дабаўку і, пры сумесным угнаеньні супэрфасфатам з каліевай сольлю, атрымана дабаўка ўраджаю большая, чым на палове нормы (180 ц.) гною.

2. Уплыў мінэральных угнаеньняў (супэрфасфату і каліевай солі) на фоне гною на ўраджай ячменю.

Досьлед быў праведзен с.-д. Герасімовічам А., Чырвона-Слабодзкага раёну, на іржонішчы, узараным на зіму. Гной быў паложаны пад плуг 15 мая, а мінэральныя ўгнаеньні 17 мая пад барану перад сяўбой. Усходы зьявіліся 21 мая, але з прычыны холаду 24 мая пажоўклі, спыніўся рост, а потым пачалі расьці зноў. Вынікі досьледу наступныя:

Табліца №. 18.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на фоне гною на ўраджай ячменю.

№ № чарговыя	СХЭМА	Ураджай на суглінку ў цэнт. на гектар		Дабаўка				Увага
				Абсолютн. цэнт.		Адносная ў проц.		
		Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	
1	Гной 180 ц. . .	12,55	21,26	0	0	0	0	
2	Гной 180 ц. + супэрф. 3,2 ц. .	16,69	23,89	4,14	2,63	32,98	12,37	
3	Гной 180 ц. + кал. с. 1,5 ц. . .	14,06	21,10	1,51	—0,16	12,03	—0,75	Азначае адмоўны вынік
4	Гной 180 ц. + + суп. 3,2 + кал. с. 1,2 цэнт. . .	18,33	24,23	5,78	2,97	46,05	13,97	

Супэрфасфат даў даволі значную дабаўку 4,14 на гектар, а каліевая соль меншую—1,51 ц. Сумеснае ўгнаеньне павялічыла ўраджай зерня на 46%. На падставе папярэдніх даных выходзіць, што супэрфасфат наогул выгадна ўжыцаць пад ячмень як бяз гною, так і на фоне гною. Што-ж да каліевай солі, дык яе лепш ужываць бяз гною, асабліва на суглінках, а па гнаі няма сэнсу.

КАНЮШЫНА.

У сувязі з пашырэньнем засеўнай плошчы пад канюшыну—пытаньне ўгнаеньня яе зьяўляецца вельмі важным. З прычыны таго, што летась у шмат якіх мясцох канюшына выпрала і вымерзла, досьледаў правесьці ўдалося вельмі абме-

жаваны лік у наступных сялян-дасьледчыкаў: Тарайковіча Я. А. і Густоўскага Г.—Койданаўскага раёну, Пухавіцкага р., саўгасе Натальяўск—Чэрвеньскага р., камуне Сталіна (2 досьледы), Савіцкага Я., Раманенкі К. і Лаппы М.—Бярэзінскага р. Мірончыка П. Ф.—Смілавіцкага раёну і Собаля А. М.—Барысаўскага раёну.

Уплыў мінэральных угнаеньняў—супэрфасфату, каліевай солі і вапны—на ўраджай канюшыны.

Ва ўсіх праведзеных досьледах канюшына падсявалася пад авёс, які сеяўся на ўгноеным іржонішчы. Перад угнаеньнем пад канюшыну поле баранавалася ў канцы красавіка і ў пачатку мая. Падлік ураджаю праводзіўся з аднаго ўкосу ў жніўні месяцы, а пры двух укосах—у ліпені і жніўні. Атрыманы наступныя даныя:

Табліца № 19.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай канюшыны.

№ № чарговыя	СХЭМА	Сярэдні ўраджай на гектар ў цэнтнэрах			Лік досьледаў	Дабаўка			
		На суглінку		На супесі		На супесі		Па суглінку	
			Лік досьлед.			Абсолютн.	Адносн. ў проц.	Абсолютн.	Адносн. ў проц.
1	Без угнаеньня .	57,34	3	36,30	8	0	0	0	0
2	Супэрфасф. 3,2 ц.	69,56	3	46,44	8	10,14	28,0	12,22	21,31
3	Каліевая соль 1,5 ц. . . .	72,13	1	32,34	2	8,37	34,91	15,21	27,33
4	Супэрфасф. 3,2 ц. + каліев. с. 1,5 ц.	80,26	3	38,95	3	11,27	40,7	22,92	39,97
5	Супэрфасф. 3,2 ц.+попелу 6,6 ц. . . .	—	—	75,05	5	28,00	59,51	—	—
6	Супэрф. 3,2 + 1,5 ц. кал. солі + вапна 50 ц. . . .	116,04	1	—	—	—	—	28,29	32,23
7	Вапна 50 ц. .	91,88	1	—	—	—	—	4,13	4,83

З табліцы вельмі добра відаць дабаўка па кожным угнаеньні. Вельмі выразна выявіў сябе попел, які разам з супэрфасфатам павялічыў ураджай сена амаль удвая. Што-ж да вапны, дык яна дала вельмі нязначную дабаўку.

Цяпер, калі параўнаем дабаўкі ўраджаю гэтага году і мінулага, дык убачым наступнае:

Табліца № 20.

Назва дзялянак і колькасьць угнаеньняў на гектар у цэнтнэрах	Дабаўка ўраджаю											
	На суглінку						На супесі					
	Ураджаю 1927 г.		Ураджаю 1928 г.		Сярэдні за 2 гады		Ураджаю 1927 г.		Ураджаю 1928 г.		Сярэдні за 2 гады	
	Ц. на гект.	У % %	Ц. на гект.	У % %	Ц. на гект.	У % %	Ц. на гект.	У % %	Ц. на гект.	У % %	Ц. на гект.	У % %
1. Без угнаеньня [1]) .	51,37	—	57.34	—	54.0	35.0	37.06	—	36.30	—	36.70	—
2. Супэрфасф. ад 3,14—3,2 ц.	10.36	20.1	12.22	21.31	11.29	20.7	10.78	29.2	10.14	28.0	10.46	28.60
3. Каліев. с. 1,5 ц. .	8.53	14,3	—	—	8.53	14.3	9.50	25.3	8.37	34.91	8.93	30.10
4. Супэрфасф. 3,14—32 ц. +к. с. 1,5.	26.65	54.1	22.92	39.97	24.78	47.03	17.54	46.7	11.27	40.7	14.40	43.70

Вельмі прыгожыя даныя як на супясі, так і на суглінку летась і ў гэтым годзе. Такім чынам, мы можам з упэўненасьцю сказаць, што на кожны цэнтн. супэрфасфату прыпадае дабаўкі на суглінку 3,5 ц., а на супесі 3,2 ц. сена і на 1 ц. кал. солі прыпадае сена на суглінку 5,6 ц., а на супясі 5,9 ц. Сумеснае ўгнаеньне супэрфасфатам і каліев. соляй павялічвае ўраджай прыблізна на 45%.


Вельмі выразна падкрэсьлівае гэта дыяграма № 2, стар. 33, дзе паказаны сярэдні ўраджай сена на гектар.

Лічбы і велічыня квадратаў, а таксама замаляваная цёмная частка, паказваючы дабаўку, гавораць, што пад канюшыну карысна ўжываць мінэральныя ўгнаеньні—супэрфасфат і каліевую соль як паасобку, так і разам, і асабліва выгодна разам з супэрфасфатам ужываюць попел.

[1]) Па дзялянцы без угнаеньня паказаны ўраджай з гектара, а на ўсіх апошніх толькі дабаўка, што атрымалася звыш кантрольнай дзялянкі.

Дыяграма №2

Уплыў мінэральных угнаенняў і попелу на ураджай канюшыны



КОРАНЬПЛОДЫ.

Культура кораньплодаў у раёне дзейнасьці Станцыі з кожным годам значна пашыраецца, і калі ў 1925/26 і 1927 г.г. прыходзілася яе разводзіць сярод насельніцтва як на паказ і ў гародзе, дык цяпер сялянства зусім зразумела яе карысьць і пачынае разводзіць яе больш ў полі; таму патрэбен сур'ёзны падыход да яе разьвядзеньня. Асноўнымі пытаньнямі па культуры кораньплодаў у раёне Станцыі зьяўляецца наступнае: 1) выбар таго ці іншага кораньплода, 2) угнаеньне, 3) спосаб разьвядзеньня, 4) выраб глебы і 5) выбар сорту. Станцыя праз Інстытут Сялян-Дасьледчыкаў працуе над вырашэньнем усіх гэтых пытаньняў, апрача вырабу глебы, паколькі кораньплодам само сялянства аддае больш увагі, чым іншым расьлінам. У гэтым годзе ставіліся досьледы па вывучэньню ўгнаеньняў і розных відаў кораньплодаў, а таксама па сортавывучэньню.

1. Уплыў мінэральных угнаеньняў (супэрфасфату, каліевай солі і попелу) на фоне гною на ўраджай кармовага бурака.

На гэту тэму было праведзена 14 досьледаў у наступных сял.-дасьл.: Чадовіча П.—Чыр.-Слабодзкага раёну, с.-г. арцелі „Згода"—Любаньскага р., Сінягуба А. Я.—Старобінскага р., Улашчыка А. А.—Капыльскага р., Вераскоўскага П. Т.—Пухавіцкага р., с.-г. арцелі „10-годкі", Логаўск. сял. школы і Крэсы А.—Бярэзінскага раёну., Кашэўскага Ф., Маеўскага С. і Дэрынга Я.—Лагойскага р., Казімірчыка—Смалявіцкага р. і Ермалковіча І. К.—Заслаўскага р., з якіх распрацавана толькі 12.

Дасьледчыя кавалкі раней знаходзіліся ў 5 выпадках пад бульбай, у 3-х—пад жытам, у 2-х—пад гародам, 1—пад канюшынай і 1—пад вікай. Апрача бульбянішча і гароду, глеба ўсюды аралася на зіму на глыбіню 15 см. Вясной поле баранавалася, потым аралася і другі раз баранавалася. Потым у першай палове мая вывезены гной заворваўся на глыбіню 18 см., а праз тры дні клаліся мінэральныя ўгнаеньні пад барану. Сеялі між 17 і 30 мая, а ўсходы зьяўляліся праз 13—15 дзён. Догляд быў у большасьці наступны: праз 3 дні пасьля сяўбы палолі, потым праз 2 тыдні другі раз палолі, у некаторых-жа выпадках палолі і трэці раз. Прарывак было ад 2 да 3 і асыпаньняў было толькі два. Пры гэтым прарыўка часта супадала з палівам ці асыпаньнем. Выбіралі ў канцы верасьня ці ў пачатку кастрычніка з падлікам усяе плошчы дзялянак 100 кв. мэтраў. Атрыманыя лічбы паказвае наступная табліца № 21, стар. 35.

Табліца № 21.

Уплыў мінэральных угнаенняў на фоне гною на ўраджай кармовых буракоў.

№№ чарговыя	СХЭМА	Сярэдні ўраджай на сугл. ў цэнт. на гект.	Лік досьледаў	Сярэдні ўраджай на супесі ў цэнт. на гект.	Лік досьледаў	Дабаўка			
						На суглінку		На супесі	
						Абсол. ў ц. на гект.	Адносная ў проц.	Абсол. ў ц. на гект.	Адносная ў проц.
1	Гной 360 ц. (кантроль)	234,96	6	298,01	5	0	0	0	0
2	Гной 360 ц.+кал. с. 1,5 цэн.	293,47	6	324,68	3	58,51	24,9	26,67	8,94
3	Гной 360 ц.+супэрф. 3,2 ц.	316,84	6	336,54	4	81,88	34,84	38,53	12,92
4	Гной 360 ц.+кал. с. 1,5 ц.+супэрфасфат 3,2 ц. . .	386,13	6	359,51	3	151,17	64,33	61,5	20,63
5	Гной 360 ц.+супэрф. 3,2 ц.+попелу 6,4 ц. . . .	—	—	428,8	2	—	—	124,0	40,70
6	Гной 360 ц.+попелу 6,4 цэнт.	—	—	384,0	1	—	—	32,00	9,09

Табліца № 22.

Ураджай розных відаў кораньплодаў

ВІДЫ КОРАНЬПЛОДАЎ	Сорт	Сярэдні ўраджай на сугл. у ц. на гект.	Лік досьледаў	Сярэдні ўраджай на супесі ў ц. на гект.	Лік досьледаў	Дабаўка			
						На суглінку		На супесі	
						Абсал.	Адн. ў проц.	Абсал.	Адн. ў проц.
1. Кармовыя буракі	Экендорфск. жоўты. .	271,44	4	240,64	2	0	0	0	0
2. Морква	Зялёнагалов.	299,50	4	303,50	2	28,06	10,33	62,86	26,12
3. Бручка		344,35	2	—	—	114,7	49,94	—	—
4. Бурак паўцукровы.		216,44	2	—	—	–13,21	–5.75	—	—
5. Турнэпс.		—	—	246,11	2	—	—	5,47	2,27

Трэба адзначыць, што ўраджай кармовых буракоў наогул быў даволі добры як па мінэральных угнаеньнях, так і па попелу, прычым дзеяньне супэрфасфату было большае за дзеяньне каліевай солі ў паўтара разы: так, напрыклад, дабаўка па супэрфасфату складае на суглінку 81,8 цэнтн., а на супесі 38,53 ц., тымчасам як па каліевай солі на суглінку—58,51 ц. і на супесі—26,67 ц. Адсюль мы маем розьніцу паміж супэрфасфатам і каліевай сольлю на суглінку 23,37 ц. і супесі 11,86 ц. Вельмі высокую дабаўку даў попел пры ўгнаеньні супэрфасфатам—да 40,8%. Адсюль выходзіць, што з мінэральных угнаеньняў лепш ужываць супэрфасфат, а каліевая соль з посьпехам можа быць заменена попелам.

2. Вывучэньне розных відаў кармовых кораньплодаў—бурака, морквы, бручкі і турнэпсу.

На гэту тэму праведзена 6 досьледаў у с.-д.: Дзядзюлі, П. Ф., Малея А. Р., Дуброўскай А. Ф.—Астрашыцка-Гарадзецкага р., Густоўскага Б. М.—Койданаўскага раёну і Шатыкі Х. Р.—Любаньск. р. Досьледы былі закладзены на іржонішчы і бульбянішчы. Глеба ўраблялася так, як і ў першым выпадку. Угнаеньні—гной і ў 3-х выпадках дадаткова па ўсяму фону былі ўнесены супэрфасфат і каліевая соль, па такой-жа норме як і ў першай тэме. Сеялі ўсе кораньплоды адначасова між 12 і 17 мая. Дагляд усіх быў аднолькавы, як і раней. Пры гэтым у 2-х досьледах турнэпс загінуў зусім ад земляной блыхі. З праведзеных досьледаў атрыманы наступныя вынікі, што відаць з табл. № 22, стар. 35.

Выходзіць, што кармовая бручка дала самы большы ўраджай—прыблізнана 50% больш за кармовыя буракі. Потым па ўраджаі ідзе кармовая морква і, нарэшце, турнэпс. Паўцукровыя буракі далі ўраджай менш на 2,25%. супроць кармовага, але затое ў ім сухой карыснай матэрыі ёсьць больш чым у кармовага на 3-4 проц. Наогул-жа пры вырашэньні пытаньня, які з кораньплодаў лепш разводзіць, трэба прымаць пад увагу ня толькі яго агульную ўраджайнасьць, але і ўраджайнасьць сухой матэрыі, а таксама якасьць як корму і яго лёжкасьць. Па сухой матэрыі кораньплоды па ўсё меншай ступені якасьці падзяляецца так: па сухой матэрыі—паўцукровы бурак, морква, кармовы бурак, бручка і турнэпс; па якасьці корму—морква, паўцукровы бурак, кармовы бурак, бручка і турнэпс; па лёжкасьці—бручка паўцукровы і кармовы бурак, турнэпс і морква. У адносінах да запатрабаваньня глебавых умоў, дык усе кораньплоды патрабуюць добра запраўленых перагноем глеб і потым усе, апрача турнэпсу, патрабуюць зьвязаных глеб суглінкаў, тымчасам як турнэпс расьце і на пяскох

Сортаспрабаваньне.

Насельніцтва цяпер, як ніколі раней, вельмі імкнецца да палепшаных сартоў насеньня, якія амаль кожны год заводзяцца ў якасьці палепшанага насеннага матэрыялу, як, напрыклад, авёс „Пабеда", „Эха", „Гігант", ячмень—„Чэхаславацкі", кораньплоды—бульба ды іншыя. Пытаньне палепшаньня насеннага матэрыялу зьяўляецца вельмі важным у вырашэньні праблемы ўздыму ўраджаю. Аднак, заводзячы новы добра ня вывучаны той ці іншы сорт, які вельмі часта дае адмоўныя вынікі, гаспадарка часамі нясе вялікія страты, і застаецца зусім бяз усякага насеньня. Таму Станцыя аднэй з першачарговых сваіх задач паставіла вывучэньне цэлага шэрагу сортаў насеньня ў сябе і адначасова распачала работу сярод сялян-дасьледчыкаў з мэтай праверкі выяўленых сартоў у мясцовых сялянскіх умовах. Для чаго вось і праводзілася работа з бульбай, кораньплодамі, аўсамі ды ячменямі і закладзены досьледы з жытам.

БУЛЬБА.

Для вывучэньня сартоў бульбы—Вольтман, Сылезія, Райтан, Раньня-ружовая, Эпікур, Дыядор і Белага № 213, было выслана 36 сялянам 80 пасылак вагой па 16 кгр. кожная. Весткі аб праведзеных досьледах атрымаліся толькі ад 18 сял.-дасьл. Вывучэньне праводзілася згодна з інструкцыяй Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў, паводле якой высявалася разам 2—3 новыя сарты з мясцовым пры ўсіх іншых аднолькавых умовах. Поле, дзе сеялася бульба, раней у большасьці досьледаў было пад жытам. Падрыхтоўка глебы была тая-ж самая, як і раней, пры досьледах з угнаеньнямі пад бульбу. Гной у большасьці клаўся перад засевам, а сеялі ў серадзіне мая. Усходы пачалі зьяўляцца на суглінку ў Вольтмана праз 28 дзён, Сылезіі—28, Мясцовага—27, а на супесі ў Вольтмана праз 22 дні, Сылезіі—26, Райтана—27, Эпікура—24, Дыядора—25, Раньняга ружовага—25 і Мясцовага—26 дзён. Пасьля засеву перад самым усходам бульба баранавалася і потым два, а ў некаторых выпадках і тры разы асыпалася. Зацьвітала бульба ў жніўні і цьвіла да самых замаразкаў (27 верасьня), якія фактычна спынілі раптам рост, пашкодзіўшы нармальнаму пасьпяваньню бульбы і тым самым зьнізілі ўраджай. Пры падліку ўраджаю важылася ўся бульба з дзялянкі і атрыманы наступныя даныя; табліца № 23, стар. 38.

Адсюль відаць, што ўраджай новых сартоў мала адрозьніваецца ад мясцовага, апрача Райтана і Белага № 213, якія

Табліца № 23.

Сортаспрабаваньне бульбы

Назва сартоў	Сярэдні ўраджай ў цэнт. на гект.				Дабаўка				Лік выпадкаў адхіленьня			
					На суглінку		На супесі		На суглінку		На супесі	
	На суглінку	Лік досьлед.	На супесі	Лік досьлед.	Абсалют. у цэнт. на гектар	Адносн. у проц.	Абсалют. у цэнт. на гект.	Адносн. у проц.	Абсал. у цэнт. на гектар.	Адносн. у проц.	Абсалют. у цэнт. на гект.	Адносн. у проц.
I.												
1. Мясцовы	182,87	9	210,19	6	0	0	0	0	—	—	—	—
2. Сылезія	189,11	7	192,97	4	6,24	3,19	3,74	1,95	3	3	3	1
3. Вольтман	190,87	9	181,51	4	8,00	4,02	29,85	−14,12	4	5	1	3
4. Ран.-ружовая . . .	131,10	2	211,69	2	−65,08	−33,17	40,61	−18,43	—	2	1	1
II.												
1. Мясцовы	—	—	230,98	3	—	—	0	0	—	—	—	—
2. Рэйтан.	—	—	243,63	3	—	—	12,65	5,47	—	—	2	1
3. 213.	—	—	245,62	1	—	—	14,64	6,33	—	—	1	—
III.												
1. Мясц. Варшаўск. .	—	—	233,41	1	—	—	0	0	—	—	—	—
2. „ скорасьп. . .	—	—	253,89	1	—	—	20,48	8,85	—	—	1	—
3. Дыядор	—	—	353,80	1	—	—	120,39	52,02	—	—	1	—
4. Эпікур.	—	—	275,18	1	—	—	41,77	18,05	—	—	1	—

далі значную дабаўку. Паніжаны ўраджай Вольтмана і Сылезіі тлумачыцца тым, што іх вэгетацыйны пэрыяд досыць вялікі і, з прычыны-ж сьцюдзёнага лета, ён быў яшчэ больш расьцягнуты, раньнія замаразкі заўчасна спынілі рост. Між іншым, лік станоўчых выпадкаў у Сылезіі большы, чым у Вольтмана. З досьледу № 3 вельмі добра сябе выявілі Дыядор і Эпікур, якія далі значную дабаўку. Наогул-жа трэба адзначыць, што ў сялян-дасьледчыкаў свае мясцовыя сарты бульбы зьяўляюцца палепшанымі, як паказваюць іх запісы пад назвай „Вольтман", „Сылёзія", „Рабінаўка" ды інш.

АВЁС.

Сортаспрабаваньне аўсоў праводзілася летась і ў гэтым годзе. Тэхніка вырабу глебы была розная, гледзячы ад таго, чым раней было занята гэтае месца. Поле ў 12 выпадках было пад жытам, а ў іншых пад бульбай. На бульбянішчы авёс высяваўся пасьля аднаго вясновага ворыва, бяз жаднага ўгнаеньня, а іржонішча ўсюды аралася, а вясной баранавалася. Перад засевам аралі яшчэ раз, угнаеньні клаліся толькі ў 7-мі выпадках пад усе сарты (у 3-х—гной 180 ц., а ў 4-х—супэрфасфат 3 ц. на гектар). На супесях сеялі ў першай палове, а на суглінках—у другой палове мая. Усходы пачалі зьяўляцца на супесях у „Пабеды" праз 9 дзён, „Шацілаўскага"—7 дзён і „Мясцовага"—8 дзён, а на суглінках ва ўсіх сартох усходы зьявіліся на адзін дзень пазьней.

Калашэньне на супесі праходзіла ў „Пабеды" на 70 дзень, „Шацілаўскага"—69; „Залатога Дажджу"—66, „Гералецкага"—65, і „Мясцовага"—62 дзень, а на суглінку: у „Пабеды"—71 дзень, „Залатога Дажджу"—72, „Шацілаўскага"—70, „Гералецкага"—71 і „Мясцовага"—69 дзень.

Пасьпяваньне праходзіла так: на супесі ў „Пабеды"—на 115 дзень, у „Зал. Дажджу"—118 дзень, „Шацілаўскага"—118 дзень, „Гералецкага"—111 дзень і „Мясцовага"—114 дзень, а на суглінку : у „Пабеды" на 121 дзень, „Зал. Дажджу"—110 дзень, „Шацілаўскага"—111 дзень, „Гералецкага"—106 дзень і „Мясцовага"—112 дзень. Заўважана, што больш за ўсё асыпаецца „Залаты Дождж", а больш церпіць шкоды „Шацілаўскі". Падлік праводзіўся з дзялянкі плошчай 250 кв. мтр. і атрыманыя дадзеныя сьведчаць аб наступным (табл. № 24, стар. 40, 41).

Прагледжваючы лічбы табліцы, мы бачым, што па ўраджаі ў першай групе на суглінку, першае месца займае „Залаты Дождж", за ім ідзе „Пабеда", які займае першае

№	Назва сартоў	Сярэдні ўраджай на гект. у цэнтнэрах									Абс
		На суглінку			На супесі			На пяску			
		Зерня	Салому	Лік досьлед.	Зерня	Салому	Лік досьлед.	Зерня	Салому	Лік досьлед.	Зерня
	I										Ураджай 1928
1	„Мясцовы"	11,21	17,79	10	11,34	13,88	19	—	—	—	0
2	„Шацілаўскі"	12,28	15,19	5	12,66	17,67	8	—	—	—	0,1
3	„Залаты Дождж"	15,43	24,36	8	12,78	13,90	16	—	—	—	4,2
4	„Пабеда"	12,46	21,39	3	13,35	13,88	8	—	—	—	0,9
5	„Пяткускі"	—	—	—	12,28	12,28	1	—	—	—	—
	II										
1	„Мясцовы"	12,61	13,10	1	15,10	14,39	5	11,59	15,78	3	0
2	„Гералецкі"	13,10	13,10	1	17,17	16,57	5	9,75	14,25	3	0,4
3	„Залаты Дождж"	12,94	16,38	1	16,35	14,82	5	9,69	14,16	3	0,3
	III										Ураджай 1927
1	„Мясцовы"	11,29	12,27	2	9,66	10,87	3	—	—	—	0
2	„Эха"	9,90	10,98	1	12,64	11,28	1	—	—	—	—2,6
3	„Пабеда"	10,20	10,20	1	—	—	—	—	—	—	—2,3
4	„Маскоўскі"	7,71	16,85	1	13,06	14,47	2	—	—	—	—2,3
5	„Пфлюг"	—	—	—	8,82	11,42	2	—	—	—	—
	IV										
1	„Мясцовы"	9,66	10,52	3	15,87	24,04	2	—	—	—	0
2	„Лігава"	4,01	—	1	11,33	—	2	—	—	—	—2,8
3	„Дыппэ"	7,38	13,10	1	9,63	15,05	1	—	—	—	—5,0
4	„Калумбус"	11,24	—	1	—	—	—	—	—	—	1,6

Табліца № 24.

ваньне аўсоў.

Дабаўка											
На суглінку				На супесі				На пяскох			
Абсалютн.		Адносн. у %%		Абсалютн.		Адн. у %%		Абсалютн.		Адносная ў %%	
рня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерн.	Сал.	Зерня	Сал.
928 году											
0	0	0	0	0	0	0	0	—	—	—	—
0,11	2,24	0,88	12,85	1.32	3,79	11,64	27,37	—	—	—	—
4.22	6,57	37,64	36,93	1,03	0,76	8,76	5,78	—	—	—	—
0,98	3,73	8,53	21,26	0,34	0,14	2,55	1,01	—	—	—	—
–	—	—	—	—0,82	–1,64	—6,25	– 2,14	—	—	—	—
0	0	0	0	0	0	0	0	0	0	0	0
0,49	—	3,88	—	2,17	2,18	14,37	15,14	–1,84	–1,53	–15,87	—9,69
0,33	3,28	2,61	25,03	1,25	0,43	8,27	2,98	–1,90	–1,62	–16,39	–10,26
927 году											
0	0	0	0	0	0	0	0	—	—	—	—
-2,65	—3,14	–21,11	–22,23	1,66	–0,68	15,11	– 5,68	—	—	—	—
-2,35	—3,92	–18,72	–27,74	—	—	—	—	—	—	—	—
-2,33	6,42	–23,20	61,65	3,40	3,60	35,19	33,11	—	—	—	—
–	—	—	—	0,05	0,74	—0,56	6,92	—	—	—	—
0	0	0	0	0	0	0	0	—	—	—	—
-2,89	—	–41,88	—	—4,54	—	–28.60	—	—	—	—	—
-5,07	—3,37	–40,72	–20,46	—5,42	–4,03	–36,01	–21,01	—	—	—	—
1.61	—	16,71	—	—	—	—	—	—	—	—	—

месца на супесі. У другой групе на першым месцы стаіць „Гералецкі".

З лічбаў ураджаю 1927 году відаць, што ўраджай новых сартоў амаль ва ўсіх выпадках быў меншы за мясцовы. Наогул-жа, паводле заўваг сялян на пытаньне: „які сорт лепшы",—большая частка прызнае найлепшым „Залаты Дождж", потым ідзе „Гералецкі" на суглінку.

„Пабеда" мала адрозьніваецца ад „Мясцовага".

ЯЧМЕНЬ.

У 1927 годзе вывучаліся тры, а ў 1928 годзе—4 сарты ячменю, якія былі высланы Станцыяй непасрэдна кожнаму селяніну. Досьледы праводзіліся, галоўным чынам, на бульбянішчы ці ўгноеным іржонішчы. Глеба ўраблялася звычайна,—восеннае ворыва, веснавое баранаваньне і ворыва. Угнаеньні клаліся—у 9 выпадках гной і ў адным супэрфасфат. Сеялі між 5 мая і 20 чэрвеня, а, галоўным чынам, у канцы мая. Усходы пачалі зьяўляцца праз 5—6 дзён. Калашэньне праходзіла на суглінку: у „Прынцэсы" на 58 дзень, „Брыо"—53 дзень, „Залаты"—53 дзень, „Лебядзіная Шыя"—56 і „Мясцовы"—50 дзень, а на супесі: у „Брыо"—58 дзень, „Залатога"—59, „Лебядзінай Шыі"—52 і „Мясцовага"—54 дзень. Пасьпяваньне праходзіла на суглінку: у „Прынцэсы" на 100 дзень, „Брыо"—99 дзень, „Залаты"—98 і „Мясцовы"—97 дзень, а на супесі: у „Прынцэсы" на 98 дзень, „Брыо"—92, „Залаты"—101, „Лебядз. Шыі"—103, „Ганхен"—101 і „Мясцовага"—96 дзень. Асыпаўся больш усяго „Мясцовы" і „Брыо". Ніводны сорт ня быў папсаваны. На думку сялян—лепшае насеньне ў „Залатога", а салома—у „Брыо". Аб велічыні ўраджаю і дабаўках над „Мясцовым" сьведчыць табліца № 25, стар. 43 па сортаспрабаваньню ячменяў.

З лічбаў ураджаю і дабавак відаць, што ў першай групе найбольшы ўраджай даў „Брыо" а ў групе другой—„Лебядзіная Шыя" і „Залаты". Трэба адзначыць, што досьледаў з „Залатым" было праведзена больш за ўсё, і ўраджай тут зьяўляецца самым устойлівым; на думку сялян на першым месцы стаіць „Залаты", затым „Брыо".

КОРАНЬПЛОДЫ.

З тэй прычыны, што культура кораньплодаў сярод сялянства наогул яшчэ новая і тэхніка яе разьвядзеньня даволі складаная,—правядзеньня сортаспрабаваньня сярод насельніцтва справа вельмі цяжкая. Вось чаму на разасланы матэ-

Табліца № 25.

Сортаспрабаваньне ячменяў.

	НАЗВА САРТОЎ	Сярэдні ўраджай на гектар у цэнтнэрах		Лік досьледаў	Сярэдні ўрадж. на гектар у цэнтнэр.		Лік досьледаў	Дабаўка							
		На суглінку			На супесі			На суглінку				На супесі			
								Абсалютная		Адносная ў %		Абсалютная		Адносн. ў %	
		Зерня	Сал.		Зерня	Сал.		Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	Зерня	Сал.
	I														
1	„Мясцовы“ . . .	15,37	16,58	11	8,21	11,83	5	0	0	0	0	0	0	0	0
2	„Брыо“	19,83	16,96	9	8,85	13,85	5	4,05	1,54	25,66	9,88	0,64	2,02	7,79	17,07
3	„Залаты“ . . .	18.06	17,54	12	8,82	10,46	4	2,69	0,96	17,50	5,79	0,76	−0,68	9,42	−6,15
	II														
1	„Мясцовы“ . . .	15,48	19,40	6	16,88	19,15	6	0	0	0	0	0	0	0	0
2	„Прынцэса“. . .	15,44	22,35	7	25,74	31,79	1	−0,04	2,95	−2,58	−15,20	−1,89	−2,27	−6,84	−6,66
3	„Залаты“ . . .	21,04	19,89	4	17,10	14,18	5	4,71	3,99	30,72	25,09	1,17	3,17	7,34	18,27
4	„Лебядзін III.“ .	24,63	26,05	2	21,13	24,43	6	7,83	—	46,60	—	4,25	5,28	25,17	27,58
	III	У	Р	А	Д	Ж	А	Й	1927	г.					
1	„Мясцовы“ . . .	13,22	17,97	3	11,28	13,78	2	0	0	0	0	0	0	0	0
2	„Ганхен“ . . .	—	—	—	15,11	18,52	3	—	—	—	—	3,83	4,74	33,95	34,39
3	„Залаты“ . . .	12,45	11,37	1	24,60	20,28	1	−0,20	−5,49	−1,54	−32,56	—	—	—	—
4	„Прынцэса“. . .	10,79	11,86	2	—	—	—	−2,72	−6,11	−20,13	−32,95	—	—	—	—

рыял па 30 досьледах, весткі атрыманы Станцыяй толькі па 10 досьледах, з якіх распрацавана толькі 7.

Вучасткі, дзе праводзіліся досьледы раней у большасьці былі пад гародам. Глеба ўраблялася так, як гэта раней апісана пад кораньплоды. Гной клаўся перад засевам, сеялі-ж у маі. Дагляд складаўся з 2—3-х прарывак з полкамі і 2-х асыпаньняў. З прычыны няспрыяючых умоў (шкоднікі, холад ды інш.) большая частка досьледаў загінула. З праведзеных да канца досьледаў атрыманы наступныя вынікі, што відаць з табл. 26, стар. 45.

Адсюль даволі выразна відаць, што з кармовых бураковў найбольшы ўраджай дае Экендорфскі Чырвоны, а сярод бручак лепш выявіла сябе Гофманская і сярод турнэпсаў—сорт Остэр-Зундомскі.

Канчаючы агляд па сортаспрабаваньні, трэба адзначыць, што сялянства больш за ўсё цікавіцца сартамі бульбы, жытам, ячменямі, аўсамі і канюшынай, на што Станцыя і павінна зьвярнуць увагу пры далейшай рабоце.

Заключэньне.

Падагульваючы работу Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў па Менскай Расьлінаводнай Дасьледчай Станцыі за мінулы час мы можам зрабіць наступныя вывады:

1. Работа Інстытуту сялян-дасьледчыкаў пашырылася колькасьцю і павялічылася якасьцю.

2. Атрыманыя лічбы па ўжываньню мінэральных угнаеньняў як супэрфасфату, тамасаўкі, фасфарыту і каліёвай солі пад культуры—бульбу, жыта, ячмень, авёс, канюшыну і кораньплоды далі выразна станоўчы вынік па тыпах глеб, на падставе якіх фактычна магчыма будзе арыентавацца на практыцы.

3. Вельмі выразна выявілі сябе станоўча—торф пад бульбу і жыта і попел пад канюшыну (з супэрфасфатам) і кораньплоды, на ўжываньне якіх трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

4. Ад ужываньня лубіну на ўгнаеньне ўраджай жыта атрымліваецца ня меншы, чым па гнаі.

5. Па сортаспрабаваньню атрыманы арыентыровачныя лічбы, якія сьцьвярджаюць тое, што трэба вельмі асьцярожна падыходзіць да ўжываньня новых сартоў; пры гэтым трэба падкрэсьліць, што мясцовы насенны матэрыял, як бульба і інш., бываюць даволі добрых гатункаў, на што трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу пры далейшай працы.

Табліца № 26.

Сортаспрабаванье кораньплодаў.

	НАЗВА САРТОЎ	Сярэдні ўраджай на гектар у цэнтнэрах		Лік досьледаў	Сярэдні ўраджай на гектар у цэнтн.		Лік досьледаў	Дабаўка							
								На суглінку				На супесі			
		На суглінку			На супесі			Абсалютная		Адносн. у %		Абсалютная		Адносн. у %/%/%	
		корань плодаў	бацьв.		корань плодаў	бацьв.		корань плодаў	бацьв.	корань плодаў	бацьв.	корань плодаў	бацьв.	корань плодаў	бацьв.
	Бурак														
1	Экендорфскі чырв.	411,62	—	2	425,76	—	2	0	0	0	0	0	0	0	0
2	„ жоўты.	409,26	—	2	374,70	—	2	—2,36	—	—0,57	—	—51,6	—	—11,49	—
3	Морква зялёная .	—	—	—	368,59	—	1	—	—	—	—	—155,33	—	—29,64	—
	Бручка														
1	Краснасельск.. .	414,86	162,32	1	—	—	—	—	0	0	0	0	0	0	0
2	Гофманская. . .	505,07	216,46	1	—	—	—	90,21	54,14	21,74	33,35	—	—	—	—
3	Бэнгольская. . .	478,03	108,23	1	—	—	—	63,17	53,09	15,22	32,70	—	—	—	—
	Турнэпс														
1	Шасьцітыднёв. . .	—	—	—	372,43	47,15	2	—	—	—	—	0	0	0	0
2	Остразундомскі .	—	—	—	457,21	52,11	2	—	—	—	—	84,78	4,96	22,76	10,51
3	Танкард	—	—	—	173,70	52,11	1	—	—	—	—	—217,17	4,96	—55,56	10,51
4	Морква	—	—	—	368,43	—	1	—	—	—	—	14,44	—	4,0	—

Вынікі работы Першай Канфэрэнцыі Сялян-Дасьледчыкаў і аграпрацаўнікоў Менскай Расьлінаводнай Дасьледчай Станцыі пры Навукова-Дасьледчым Інстытуце імя Ў. І. Леніна.

За трохгадовы пэрыяд існаваньня Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў пры Менскай Дасьледчай Станцыі, апошняй летась у ліпені месяцы (між 15 і 18) была праведзена першая канфэрэнцыя сял.-дасьл. і аграпрацаўнікоў. Удзел у канфэрэнцыі прымала да 120 асоб, з іх сял.-дасьл.—64, прадстаўнікоў калгасаў—5, раённых аграпрацаўнікоў—26 і 25 прадстаўнікоў ад дасьледчых установ, зямельных, каапэрацыйных, карэспандэнты ад розных газэт ды іншых грамадзкіх арганізацый.

Канфэрэнцыя, па словах сялян.-дасьледчыкаў зьявілася „першай ластаўкай" у справе ўзмацненьня арганічнай сувязі паміж навукай і жыцьцём, паміж работай дасьледчых установаў і практычнымі працаўнікамі—агранаміяй і сялянамі.

На канфэрэнцыі былі пастаўлены наступныя пытаньні: азнаямленьне з сучаснай зямельнай палітыкай па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі (дакл. Наркома Земляробства Зьм. Прышчэпава); стан дасьледчай справы на Беларусі і форма яе арганізацыі (даклад дырэктара НДІ імя Леніна т. Гарэцкага); дасягненьні і работа дасьледчых станцый Менскай Расьлінаводнай і Менскай Балотнай (даклады дырэктара Менскай Расьлінаводнай Станцыі А. А. Прохарава і дырэктара Менскай Балотнай Станцыі С. П. Саўкіна, з адначасовымі экскурсіямі на гэтыя Станцыі); форма арганізацыі Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў і роля яго ва ўздыме сельскай гаспадаркі (даклад спэцыяліста Бюро Сялян-Дасьледчыкаў Р. М. Чуйко); падсумаваньне работы Інстыту Сялян-Дасьледчыкаў Менскай Расьлінаводнай Дасьледчай Станцыі і вызначэньне далейшых шляхоў, з разглядам апэрацыйнага пляну па Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў на 1929 год (даклад асыстэнта Я. Г. Тачыцкага).

Ня гледзячы на самую рабочую пару—сенакос, усе запрошаныя сяляне, а таксама аграномы зьявіліся акуратна, і работа канфэрэнцыі працякала пры надзвычай вялікім ахопе сялян і аграпрацаўнікоў.

На канфэрэнцыі было адзначана—што: у выніку правільнай зямельнай і с.-г. палітыкі ком. партыі наша сельская гаспадарка хутка дасягнула даваеннага ўзроўню і яшчэ больш шпаркім тэмпам пойдзе разьвівацца далей на падставе навуковага досьледу, па шляху калектывізацыі; ня гледзячы на тое, што дасьледчая справа на Беларусі яшчэ маладая, яна ўжо мае вялікія дасягненьні і шпаркімі крокам і разгорт-

ваецца; што работа дасьледчых станцый—Менскай Расьліна водная і Менскай Балотнай—даволі разгорнута і ёсьць значныя дасягненьні, асабліва на Балотнай Станцыі; што форма арганізацыі Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў зьяўляецца жыцьцёвай і што кірунак работы, узяты Менскай Расьліна водная Станцыяй па Інстытуту Сял-Дасьл. з установкай на шырокае выкарыстаньне самадзейнасьці працаўнікоў калгасаў, сялян і аграномаў шляхам наладжаньня цеснай арганічнай сувязі паміж дасьледчай Станцыяй з сялянствам і агранаміяй, зьяўляецца правільным.

На канфэрэнцыі сялян-дасьледчыкаў і аграпрацаўнікоў былі зроблены наступныя заўвагі:

1. У мэтах больш хутчэйшага вырашэньня пытаньня па ўздыме сельскае гаспадаркі трэба зьвярнуць больш увагі на дасьледчую справу, дзеля чаго прасіць урад адпусьціць значна больш сродкаў, чым да гэтага часу; потым—агульнае кіраўніцтва дасьледчай справай павінна быць адно.

2. Адзначана, што ў дарэвалюцыйны час сяляне зусім ня ведалі аб існаваньні дасьледчай справы; цяпер-жа гэта сталася даступным і зразумелым большай частцы насельніцтва, асабліва сялянам-дасьледчыкам, якія прыхільны да гэтай справы. Сяляне-дасьледчыкі шчыра бяруцца за досьледы ў сваёй гаспадарцы, веруючы ім як адзінаму правільнаму мэтаду палепшаньня гаспадаркі на падставе навукі. Але, ня гледзячы на вялікія дасягненьні, у рабоце селяніна ёсьць значныя недахопы—гэта наша някультурнасьць, што адбіваецца і на самой рабоце, бо здараюцца выпадкі нядбайных адносін да ажыцьцяўляных досьледаў.

3. У Інстытут сялян-дасьледчыкаў да гэтага часу слаба ўцягнуты жанчыны, члены ЛКСМ і настаўніцтва, праз якіх магчыма павесьці больш шырокую работу, скарыстаўшы пры гэтым школьныя кавалкі зямлі.

4. Селянін-дасьледчык да гэтага часу прымаў слабы ўдзел у калектывізацыі і наогул у грамадзкай рабоце па палепшаньні сельскае гаспадаркі, дзе ён павінен быць фактычна правадыром і актыўным працаўніком па распаўсюджаньні сельска-гаспадарчых вед і дасьледчых дасягненьняў сярод насельніцтва, зрабіўшыся памоцнікам агранома на вёсцы.

5. Перад ажыцьцяўленьнем таго ці іншага мерапрыемства ў раёне, раённы аграном разам з дасьледчай станцыяй павінен раней вывучыць умовы сельскае гаспадаркі, у чым селянін-дасьледчык сваім удзелам абавязан дапамагчы яму.

6. Для больш пасьпяховай работы сялян-дасьледчыкаў у раёне трэба мець цесную сувязь паміж сабой і з аграномам у раёне, для чаго неабходна наладжваць раённыя нарады, канфэрэнцыі ды інш., арганізаваўшы ў раёне бюро.

7. Для больш паглыбленай і пашыранай работы сярод сялян-дасьледчыкаў трэба арганізоўваць кожны год курсы сялян-дасьледчыкаў пры дасьледчых станцыях.

8. З прычыны пераживанага арганізацыйнага пэрыяду ў дасьледчую работу замала ўцягнуты калектыўныя і савецкія гаспадаркі, якія па сваіх умовах больш адпавядаюць гэтай справе, чым сялянскія; значыць, станцыі, адпаведным органам і агранамії трэба зьвярнуць больш увагі на ўцягненьне памянёных гаспадарак у гэту справу.

9. Адзначаючы невыстарчальную папулярызацыю дасьледчых дасягненьняў, надалей трэба больш рашуча і дакладна павесьці гэту работу ўсім каляктывам супрацоўнікаў станцыі, аграномам і сялянам-дасьледчыкам праз друк, выстаўкі, экскурсіі ды інш.

10. Заўважана, што аграпрацаўнікі і большая частка сялян-дасьледчыкаў прымаюць слабы ўдзел у друку,— у „Беларускай Вёсцы", час. „Плуг" і „Сельская і Лясная Гаспадарка"—як адных з вельмі важных органаў, што змагаюцца з цемрай жыцьця і адсталасьцю нашай сельскае гаспадаркі, за культурную рэвалюцыю, за лепшы быт, за сацыялізм.

Пажаданьні.

Канфэрэнцыя сялян-дасьледчыкаў і аграпрацаўнікоў, азнаёміўшыся са станам і арганізацыяй дасьледчай справы ў Беларусі, а таксама і са станам работы Менскай Расьлінаводнай і Менскай Балотнай Станцый, прызнала патрэбным:

1. Вітаць арганізацыю НДІ імя Леніна, дзякуючы засна-ваньню якога, дасьледчая справа пойдзе больш шпарка і пл навым парадкам, за што дзякаваць Савецкаму Ўраду Бел русі, зьвярнуўшаму ўвагу на дасьледчую справу, і адначасо прасіць Урад яшчэ больш павялічыць гэтую ўвагу і фінанс ваньне, бо дасьледчая справа правільна паказвае шлях, п якім трэба разьвіваць сельскую гаспадарку, ажыцьцяўляю яе калектывізацыю, падымаючы яе ўраджайнасьць і тава насьць.

2. Кірунак і плян разьвіцьця дасьледчай справы ў БСС правільныя, але трэба зьвярнуць увагу на патрэбу хутчэ шага разгортваньня работ Менскай Расьлінаводнай, Цэ тральнай Бульбянай і Цэнтральнай Сьвінаводчай Станцый.

3. Каб уся дасьледчая работа сялян-дасьледчыкаў па БСС была цалкам аб'яднана ў Бюро сялян-дасьледчыкаў пр Навукова-Дасьледчым Інстытуце Сельскае і Лясное Гас даркі імя Ў. І. Леніна.

4. Трэба падкрэсьліць, што на Менскай Расьлінаводн Станцыі ляжыць уся адказнасьць па абслугоўваньню ў гал

паляводзтва самага інтэсыўнага раёну Беларусі—Менска-Слуцкага. Работы Станцыі павінны быць значна больш пашыраны і паглыблены, для чаго ў першую чаргу патрэбна адпаведная зямельная тэрыторыя, якой станцыя зараз ня мае, і належнае фінансаваньне на пабудову будынкаў, абсталяваньне ды ўтрыманьне навуковых працаўнікоў.

5. Лічыць абавязкам кожнага селяніна-дасьледчыка вынікі Менскай Расьлінаводнай Станцыі ўжываць у сваіх гаспадарках і ўжыць усе захады да ажыцьцяўленьня іх сярод усяго ваколічнага насельніцтва.

6. Работу Менскай Балотнай Станцыі ў вырашэньні праблемы па выкарыстаньні вялікае колькасьці беларускіх балот лічыць асабліва важнай і, адзначаючы яе посьпехі па цэлым шэрагу дасягненьняў, трэба ўжыць усе захады, каб гэтыя дасягненьні былі вядомы больш шырокім колам сялянства.

7. Каб у работу Інстытуту сялян-дасьледчыкаў было ўцягнута больш калектыўных, савецкіх гаспадарак, жанчын і настаўніцтва; селянін-дасьледчык павінен прыняць самы актыўны ўдзел у працы раённых сельска-гаспадарчых саветаў, сельска-гаспадарчых гурткоў, каапэрацыйных аб'яднаньняў, у грамадзкіх арганізацыях ды інш.

8. Досьледы ў сялян-досьледчыкаў праводзіць па ўсіх галінах сельскае гаспадаркі.

9. Пры прывядзеьні сялянскіх досьледаў трэба трымацца ўсіх вымаганьняў навуковага досьледу, строга выконваючы ўсе работы па закладцы, назіраньні і падліку; тых сялян, якія будуць нядбайна ставіць досьледы—выключаць з ліку сялян-дасьледчыкаў.

10. Прынцып і мэтад работы Менскай Расьлінаводнай Станцыі, паложаны ў аснову арганізацыі Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў,—сувязь навукі і жыцьця з мэтавай усталёўкай на селяніна беднякa і серадняка—актывістага, калектывістага, з поўным уцягненьнем у дасьледчую работу калгасаў, саўгасаў, аграпрацаўнікоў, членаў ЛКСМ, настаўніцтва ды іншых грамадзкіх працаўнікоў,—зьяўляюцца правільнымі і іх трэба захаваць і надалей.

11. Плян работы па Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў на 1928-1929 год Менскай Расьлінаводнай Станцыі [1]) прыняць поўнасьцю з абавязковым наладжаньнем канфэрэнцыі сялян-дасьледчыкаў і аграпрацаўнікоў у наступным годзе.

Асыстэнт *Тачыцкі.*

---

[1]) Які зараз надрукаваны ў справаздачы Навукова-Дасьледчага Інстытуту мя Леніна „Другі год працы".

ВЫНІКІ РАБОТЫ ІНСТЫТУТУ СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ ГОРАЦКАЙ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ ДАСЬЛЕДЧАЙ СТАНЦЫІ.

У С Т У П

Яшчэ няма двух год, як Горацкай Сельска-Гаспадарчай Дасьледчай Станцыяй распачалася работа сярод сялянства. Але-ж, ня гледзячы на гэта, цяпер мы маем такую моцную арганізацыю, як Інстытут Сялян-Дасьледчыкаў, які яднае 190 сялян, працуючых разам з Дасьледчай Станцыяй над вырашэньнем невядомых для нашае краіны пытаньняў, вывучаючы іх у мясцовых сялянскіх умовах і вясковай тэхніцы.

Вось якія думкі і пажаданьні выказвалі сяляне на канфэрэнцыі сялян-дасьледчыкаў 8-9 ліпня 1928 г., на якой прысутнічала 130 сялян.

Сяляне Коханаўскага раёну Бардзоў і Скобелеў лічаць, што работа, праробленая Дасьледчай Станцыяй, надта карысная як сялянству, так і дзяржаве і жадаюць, каб дасьледчая станцыя шырэй распаўсюджвала свае досьледы сярод сялянскіх гаспадарак.

Селянін з Коханаўскага раёну, вёска Малая-Галашова, Каласоўскі Ягор дзякуе дасьледчую станцыю і прафэсуру, якія склікалі зьезд сялян-дасьледчыкаў і далі магчымасьць пазнаёміцца з вялікімі дасягненьнямі дасьледчых устаноў. „Тыя прыклады, якія мы бачылі на дасьледчых палёх, зьявяцца вялікім стымулам для разьвіцьця калектыўнай працы ў сялянскіх гаспадарках".

Каранеўскі—селянін з Аршанскага раёну—кажа: „Тое, што бачылі мы на дыяграмах і ў натуры ў полі, дае нам надта вялікую карысьць. Усё гэта, што мы ўбачылі, мы перанясём у нашы гаспадаркі".

Ад Багушэўскага раёну селянін Шчэрбаў з калгасу „Чырвоны Бераг" жадае, каб гэткія канфэрэнцыі былі праведзены з прадстаўнікамі калгасаў, якія здолелі-б відавочна ўпэўніцца ў карысьці ад правільнага вядзеньня буйное гаспадаркі.

„Пастаноўка жывёлагадоўлі, удойлівасьць статка, пладовыя гадавальнікі, дасьледчыя палі практычна навучылі нас, як паляпшаць сваю гаспадарку. Трэба, каб агранамія і дасьледчыя ўстановы перадалі свае дасягненьні ў шырокую гушчу сялянскіх гаспадарак"—кажа далей селянін Шчэрбаў.

Сяляне з Магілеўскае акругі Казлоў Саўка і Тарасенка В. шчыра дзякуюць савецкую ўладу і камуністычную партыю за тое, што яна шырока адчыніла дзьверы навукі для сялян, якія ня толькі могуць глядзець на дасягненьні дасьледчых устаноў, але могуць вынікі дасьледчых устаноў пераносіць на свае палі. „Тое, што цяпер робіць дасьледчая станцыя, надта спрыяе хутчэйшаму разьвіццю сельскае гаспадаркі“— кажуць яны.

Селянін ад Дубровенскага раёну—селькор Чэрвінскі— кажа: „Дасьледчая станцыя зьяўляецца вялікай установай і мае ўплыў на ўздым сельскае гаспадаркі. Праз Інстытут Сялян-Дасьледчыкаў станцыя можа хутчэй прасунуць свае дасягненьні ў сялянскія гаспадаркі. Канфэрэнцыя сялян-дасьледчыкаў пры дасьледчай установе—гэта лепшая школа для сялян“.

Ад сельска-гаспадарчага т-ва Аршанскага раёну „Аб'яднаньне“ Цітоў кажа: „Дасьледчыя палі і ўраджаі на фэрме Іванова, садова-гародныя гадавальнікі зрабілі надта добрае ўражаньне. Адчуваецца, што на дасьледчую справу зьвяртаецца належная ўвага. Дасьледчая станцыя свае веды і дасягненьні пачынае прасоўваць у сялянскія гаспадаркі. Мы павінны яшчэ больш заклікаць прафэсуру і агранамію да шчыльнай сувязі і разьвіцьця калектыўнае гаспадаркі і хутчэйшага яе ўздыму“.

Селянін Чарэйскага раёну—Мікульскі, гаворыць наступнае: „Два дні экскурсій па дасьледчых установах далі мне шмат практычных ведаў, і таго, што бачыў я за гэты невялічкі тэрмін, я за ўсё сваё жыцьцё ня бачыў. Толькі дасьледчыя ўстановы з іх дасягненьнямі могуць дапамагчы ўзьняць хутчэй сельскую гаспадарку Беларусі. Нам трэба прасіць уладу, каб яна ўжыла ўсе захады для шырэйшага азнаямленьня ўсіх з тым, што робіцца ў дасьледчых установах, каб вынікі дасьледчых устаноў былі вядомы ўсяму сялянству. Трэба работу навукова-дасьледчых устаноў строга ўвязаць з зямельнай палітыкай, і гэта яшчэ больш дапаможа хутчэйшаму аднаўленьню сельскае гаспадаркі“.

Селянін Шклоўскага раёну—Емяльянаў Цімох—кажа вось што: „Трэба, каб спроба скліканьня канфэрэнцый сялян-дасьледчыкаў і надалей працягнулася. Нашаму ўраду трэба наладзіць справу так, каб вынікі дасьледчых устаноў, як мага хутчэй, пераносіліся на сялянскія палеткі, і гэтымі асяродкамі на мясцох павінны стацца нашы агрпункты, дзе трэба згуртаваць як літаратуру, так і паказальныя мерапрыемствы“.

Селянін Куксаў—Талочынскага раёну—гаворыць: „Ужываньне штучных угнаеньняў і торфу на палёх дасьледчай станцыі пераконвае нас у тым, што гэта значна павышае ўраджай. Трэба дамагчыся таго, каб штучнае ўгнаеньне ўжы-

валася кожным сялянскім дваром, гатунковае насеньне таксама трэба шырока распаўсюджваць сярод сялян. Тое, што мы ўбачылі на дасьледчай станцыі, зьявіцца для нас практычнай школай у штодзенным жыцьці".

Ад Багушэўскага раёну Аулін кажа: „Першая канфэрэнцыя сялян-дасьледчыкаў зьявілася пачаткам тае вялікае работы, якая павінна быць у будучыні, бо толькі сьціслая сувязь дасьледчых устаноў з сялянамі-дасьледчыкамі можа забясьпечыць уздым сялянскай гаспадаркі. Трэба больш шырака вывучаць таварнасьць сельскай гаспадаркі і вызначаць шляхі хутчэйшага яе разьвіцьця. Беларуская сельская гаспадарка хутчэй пойдзе да свайго аднаўленьня, калі яна сьцісла зьвяжацца з навуковымі ўстановамі".

Селянін Каур—Аршаншчына, казаў наступнае: „На канфэрэнцыі закрануты пытаньні, якія цікавяць сельскую гаспадарку. Тыя дасягненьні, што маюцца ў дасьледчых станцый, трэба перакінуць на раёны, вёскі, якія ня ведаюць аб посьпехах дасьледчай справы. Толькі тады, калі дасягненьні дасьледчае справы зьявяцца дасягненьнямі шырокіх сялянскіх колаў, сялянская гаспадарка хутчэй пойдзе па шляху свайго разьвіцьця".

Вось аб чым казала сялянства на канфэрэнцыі. Сяляне-дасьледчыкі з вялікай ахвотай пабылі ва ўсіх установах дасьледчай станцыі. Уражаньне, якое зрабілі на сялян дасьледчыя ўстановы, зьявілася вялікім падсобнікам у справе палепшаньня сельскае гаспадаркі.

Як вітала канфэрэнцыя камуністычную партыю і савецкую ўладу:

„Першая канфэрэнцыя сялян-дасьледчыкаў пры Горацкай Дасьледчай Станцыі пасылае сваё шчырае прывітаньне правадыру працоўных Беларусі—камуністычнай партыі і савецкай уладзе. Тыя мерапрыемствы, якія ажыцьцяўляюцца пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, зусім правільна накіраваны па шляху лепшай сацыялістычнай будучыні. Мы, сяляне-дасьледчыкі, ахвяроўваем сваю працу і абавязуемся дапамагчы ў ажыцьцяўленьні сацыялістычнай перабудовы нашай вёскі.

Няхай жыве камуністычная партыя і савецкая ўлада!

Няхай жыве сувязь навукі і практыкі!"

Тыя абяцаньні, якія мы бачым на старонках тэлеграмы, сяляне-дасьледчыкі цяпер ужо пачынаюць ажыцьцяўляць. Ужо цяпер яны пачынаюць быць культурным асяродкам на вёсцы. У тыя паселішчы, дзе вядзецца дасьледчая работа, прыходзяць экскурсіі суседніх вёсак.

Селянін-дасьледчык у нашым агранамічным жыцьці зьяўляецца тым фэрмэнтам, які накіроўвае работу акаляючых яго сялян па пэўнаму шляху да пабудовы культурнае гаспадаркі.

Аб рабоце ў 1928 годзе.

У параўнаньні з мінулым годам дасьледчая работа ў сялянскіх гаспадарках у гэтым годзе значна пашырылася. Лік досьледаў павялічыўся больш чым у 5 раз. Усяго Інстытутам Сялян-Дасьледчыкаў у гэтым годзе ахоплена 4 адміністрацыйныя раёны: 1) Горацкі з лёэсавым суглінкам, 2) Аршанскі з глебай лёэсаватых суглінкаў, 3) Дрыбінскі з супяшчанымі глебамі і 4) Лупалаўскі раён Магілеўшчыны.

Да кожнага з першых трох раёнаў быў прымацаваны адзін практыкант-аграном; гэтыя практыканты працавалі там сыстэматычна. Лупалаўскі-ж раён абслугоўваўся наездамі [1]). Інстытутам Сялян-Дасьледчыкаў праведзена 148 досьледаў. Апрача гэтага, пад кіраўніцтвам Інстытуту праведзена 18 досьледаў у слухачоў сялянскага унівэрсытэту і 26 досьледаў у членаў ячэек АСОАвіахэму, а усяго ў 1928 г. праведзена 190 досьледаў.

Па форме зямлякарыстаньня дасьледчыкі разьмяркоўваюцца так: 50% выпадае на пасялковыя гаспадаркі, 4% на саўгасы, 2,5%—калгасы, 3%—камуны, 21%—цераспалосныя гаспадаркі і 19,5%—хутары.

Аб рабоце, якая праводзілася Інстытутам Сялян-Дасьледчыкаў у межах дзейнасьці Горацкай Сельска-Гаспадарчай Дасьледчай Станцыі і з паказаньнем ліку досьледаў па асобных пытаньнях можна бачыць з табліцы № 1, стар. 54.

Агульныя нарысы тэхнічнай работы.

Для палягчэньня работы ва ўмовах сялянскай гаспадаркі досьледы ставіліся па магчымасьці з кароткімі схэмамі. Так, напрыклад, з мінэральнымі ўгнаеньнямі досьледы ставіліся па чацьвярной альбо пяцярной схэме, і толькі ў некаторых выпадках па васьмярной. Для сортаспрабаваньня браліся два сэлекцыйныя сарты ды 3-ці мясцовы, і тады схэма, як прыклад, мела такі выгляд:

1) мясцовы, 2) Шацілаўскі, 3) Гералецкі.

Усе досьледы, за выключэньнем досьледаў па сортаспрабаваньню, ставіліся з трайной або чацьвярной паўторнасьцю. Разьбіўка дзялянак рабілася вымернай істужкай і экерам. На кутох дасьледчага вучастку ўкопвалі слупы. Паміж дзялянкамі забіваліся невялічкія калкі.

---

*) Практыкантамі былі запрошаны студэнты Беларускай Дзярж. С.-Г. Акадэміі: Э. П. Пашкевіч і Г. Н. Бабак, якія яшчэ да Акадэміі атрымалі сяроднюю агранамічную асьвету і працавалі ў якасьці аграномаў.

Табліца № 1.

Праведзена досьледаў з азімымі і яравымі культурамі.

Па якіх пытаньнях і з якой культурай	Праведзена працаўнікамі станцыі			Пад кіраўніцтвам станцыі			Усяго праведзена досьледаў
	Лік досьледаў	Зроблен падлік	Распрацавана	Лік досьледаў	Зроблен падлік	Распрацавана	
Пасьля дзеяньня мінэральных угнаеньняў:							
Пшаніца	8	8	8	—	—	—	8
Авёс	3	3	3	—	—	—	3
Ячмень	2	1	1	—	—	—	2
З мінэральнымі ўгнаеньнямі:							
Бульба	19	19	19	10	9	9	29
Кораньплоды	7	4	4	—	—	—	7
Жыта	18	18	17	7	6	6	25
Авёс	—	—	—	4	3	3	4
Лён	4	4	4	—	—	—	4
Канюшына	13	12	12	1	1	1	14
Сенажаць	2	2	2	—	—	—	2
Сортаспрабаваньне:							
Ячмень	24	24	24	—	—	—	24
Авёс	13	13	13	—	—	—	13
Лён	3	3	3	—	—	—	3
Усяго .	116	112	111	22	19	19	138

Нормы ўгнаеньняў для досьледаў браліся згодна з інструкцыяй Бюро сялян-дасьледчыкаў:

Фосфару чыстага ў супэрфасфаце . . .	45	*кг* на *гкт*
Фосфару чыстага ў фасфарыце	90	*кг* „
У тамасаўцы	60	*кг* „
Калію чыстага ў 30-проц. каліевай солі	45	*кг* „
Азоту чыстага ў салетры	30	*кг* „
У сярчана-кіслым амоніяку	45	*кг* „
Торфу паветрана-сухога	180	*цнт* на *гкт*
Гною $^1/_2$ нормы	180	„ „
Гною поўнай нормы	360	„ „

Нормы насеньня браліся тыя, што звычайна практыкуюцца ў гаспадарцы.

Падлік досьледаў збожжавых культур (за выключэньнем досьледаў з пасьлядзеяньнем, падлік якіх рабіўся паводле мэтоду квадратаў) рабіўся паводле мэтоду пробнага снапа; падлік канюшыны таксама. Бульба і кораньплоды ўзважваліся ўсёй масай з дзялянкі. Снапы малаціў спэцыяльна запрошаны для гэтага аграном-практыкант на Іванаўскім дасьледчым полі, куды звозіліся (абавязкова ў мяхох) усе пробныя снапы з раёну. Пры падліку больш выразным дасьледам рабіліся фатаграфічныя здымкі. Па адным экзэмпляры фатаграфічных картак маем на ўвазе пераслаць тым сялянам-дасьледчыкам, у каго рабілася фатаграфаваньне досьледаў.

Уся дасьледчая работа па разьбіўцы дзялянак, закладцы і падліку досьледаў выконвалася аграномамі-практыкантамі. Сялянам-жа дасьледчыкам даручалася толькі назіраньне за досьледамі.

Што зроблена для зьнішчэньня недахопаў у рабоце.

Недахопаў у рабоце было шмат. Большасьць з іх зьвязана з вялікай матэрыяльнай абмежаванасьцю. Для зьнішчэньня існаваўшых недахватаў, для пашырэньня і роўнамернага ахопу работы ва ўсім раёне дзейнасьці Станцыі былі высунуты на прэзыдыуме Аршанскага Выканаўчага Камітэту наступныя прапановы, якія цалкам зацьверджаны АВК 13-XII-28 г. Падаем іх цалкам:

1) Заслухаўшы даклад аб рабоце Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў, прэзыдыум Аршанскага Акруговага Выканаўчага Камітэту адзначае, што Інстытут Сялян-Дасьледчыкаў, ня гледзячы на кароткі час свайго існаваньня, разгортвае ініцыятыву і самадзейнасьць бядняцка-серадняцкіх колаў сялянства над вырашэньнем пытаньняў па ўздыму сельскае гаспадаркі.

2) У мэтах пашырэньня і паглыбленьня работы Інстытуту сялян-дасьледчыкаў і больш роўнамернага ахопу гэтай работай сялянства ва ўсіх адміністрацыйных раёнах Аршаншчыны, з вясны будучага году на летні пэрыяд завесьці ў кожным раёне па аднэй пасадзе агранома-практыканта, які знаходзіўся-б пад кіраўніцтвам райагранома ды інструктаваўся-б па дасьледчай справе дасьледчай станцыяй.

3) Праграма досьледа-паказальнай работы складаецца дасьледчай станцыяй пры абавязковым узгадненьні з АкрЗА з такім разьлікам, каб забясьпечана было выкананьне пляновай работы АкрЗА ў гэтай галіне. З будучага году распачаць дасьледчую работу па спэцыяльных галінах—садоўніцтву, гародніцтву і жывёлагадоўлі.

4) Работа па жывёлагадоўлі павінна ісьці і ў зімовы пэрыяд: для гэтай мэты дасьледчай станцыі і АкрЗА вылучыць 2—3 раёны, куды запрасіць на гэту работу аграномаў практыкантаў.

5) Для больш пасьпяховага разгортваньня гэтай работы лічыць патрэбным удзел аддзелу садоўніцтва, гародніцтва і жывёлагадоўлі, існуючых пры Горацкай Сельска-Гаспадарчай Дасьледчай Станцыі.

6) Даручыць АкрЗА і РВК з тых сродкаў, што ёсьць на досьледна-паказальную работу з бюджэту АкрЗА і раёнаў, вылучыць 4200 руб. на ўтрыманьне аграномаў-практыкантаў і, апрача таго, забясьпечыць паказальна-дасьледчую работу патрэбнымі матэрыяламі, угнаеньнем і насеньнем. Перад НКЗБ хадайнічаць аб вылучэньні сродкаў для забесьпячэньня работы па спэцыяльных галінах (садоўніцтву, гародніцтву і жывёлагадоўлі) і ўзмацненьня бюджэту Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў.

7) Паказальна-дасьледчую работу згрупаваць у першую чаргу ў калектыўных гаспадарках і шматпольных селішчах.

8) Уцягнуць у дасьледчую работу Смалянскую Сельска-Гаспадарчую Школу Сялянскай Моладзі, скарыстаўшы для пастаноўкі досьледаў школьныя вучасткі, уцягнуўшы вучняў для пастаноўкі досьледаў у сваіх бацькоў.

9) Больш шырока разгарнуць пастаноўку досьледаў на балоце, уцягнуўшы ў гэту работу мэліярацыйныя таварыствы, усклаўшы ажыцьцяўленьне гэтай работы на культуртэхнікаў, скарыстаўшы магчымасьці Талочынскага апорнага пункту.

10) Больш шырака і грунтоўна разгарнуць дасьледчую работу ў саўгасах, прыцягнуўшы да гэтае справы спэцыялістых — загадчыкаў гаспадаркамі, якія кіруюцца ў сваёй рабоце праграмамі Інстытуту Сялян - Дасьледчыкаў, даручыўшы ўпаўнаважанаму Бельсельтрэсту даць належныя заўвагі аб дзейнасьці ў гэтай рабоце загадчыкаў гаспадаркамі саўгасаў.

11) Для азнаямленьня сялян-дасьледчыкаў з дасягненьнямі дасьледчай станцыі, для абгаварэньня пытаньняў і далейшага разгортваньня работы, ды падліку вынікаў работы, для большага ўцягненьня ў дасьледчую работу сялянства і папулярызацыі вынікаў дасьледчай работы, Горацкай Раённай Дасьледчай Станцыі наладжваць, ня менш як адзін раз на год, канфэрэнцыю сялян-дасьледчыкаў. Райаграномам склікаць нарады сялян-дасьледчыкаў разам з вясковым актывам ня менш 2-х раз на год (вясна—восень). Наладжваць экскурсіі сялян на дасьледчую станцыю і больш паказальныя сялянскія досьледы.

12) У мэтах стварэньня сталага кваліфікаванага складу сялян-дасьледчыкаў, павесьці сыстэматычную падрыхтоўку іх, для чаго прыцягнуць іх на агранамічныя курсы, увязваючы праграму апошніх з пытаньнямі дасьледчае справы і правядзеньня досьледаў у сялянскіх гаспадарках.

13) Шырака папулярызаваць вынікі работы дасьледчай станцыі і сялян-дасьледчыкаў шляхам удзелу ў раённых с.-г. выстаўках, арганізацыі музэю пры станцыі і дому селяніна і заснаваньня куткоў „Дасьледчыка“ ў сельска-гаспадарчых школах, хатах-чытальнях і аграпунктах.

14) Раённай станцыі, АкрЗА і райвыканкомам распачаць падрыхтоўку сярод сялян-дасьледчыкаў да Ўсебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўкі, для чаго дасьледчай станцыі скласьці адпаведныя праграмы.

15) Бюро сялян-дасьледчыкаў і дасьледчай станцыі выдаць у папулярнай форме брашуры, плякаты і лістоўкі, дэманструючыя дасягненьні дасьледчае станцыі і Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў, даручыўшы АкрЗА ўзгодзіць пытаньне аб тэмах і чарговасьці выданьняў.

У зьвязку з тым, што вынікі работы дасьледчай станцыі невыстарчальна і несваячасова перадаюцца ў сялянскія гаспадаркі, лічыць патрэбным, як мага хутчэй, заснаваньне пры дасьледчай станцыі аддзелу прыстасаваньня, даручыўшы АкрЗА паставіць гэтае пытаньне перад НКЗБ.

ВЫНІКІ ПРАЦЫ.

Досьледы з мінэральнымі ўгнаеньнямі.

Ставячы досьледы з мінэральнымі ўгнаеньнямі, мы мелі на ўвазе вывучыць наступнае:

1) Высьветліць тэхнічна-эканамічную карысьць ужываньня мінэральных угнаеньняў, якія ўносіліся пад розныя культуры паасобку і разам; а таксама і глебавыя запатрабаваньні ў розных угнаеньнях у залежнасьці ад тыпу глебы.

2) Якія культуры даюць найбольшы прыбытак ад ужываньня мінэральных угнаеньняў (бульба, жыта, канюшына ці інш.).

3) Правесьці параўнаўчае дзеяньне мінэральных угнаеньняў у розных колькасьцях з торфам і гноем, інакш кажучы, пытаньне аб магчымасьці замены мінэральнымі ўгнаеньнямі і торфам часткі гною.

4) Высьветліць пытаньне, колькі год дзейнічае адзін раз унесенае мінэральнае ўгнаеньне (вывучэньне пасьлядзеяньня мінэральных угнаеньняў).

Досьледы з мінэральнымі ўгнаеньнямі былі зроблены з наступнымі культурамі: бульбай, кораньплодамі, жытам, аўсом, пшаніцай-яркай, ячменем, лёнам, канюшынай і сухадольнай сенажацьцю.

Разгледзім вынікі гэтых досьледаў паасобку.

БУЛЬБА.

З бульбай зроблена найбольш досьледаў з мінэральнымі ўгнаеньнямі. Усяго з культурай бульбы было пастаўлена 29 досьледаў на глебах: суглінках лёэсавых—Горацкі раён, суглінках лёэсаватых—Аршанскі раён і супяшчаных глебах—Дрыбінскі раён. Каб мець большае ўяўленьне аб тым, пры якіх умовах культывавалася гэта расьліна, закранем крыху тэхніку вырабу глебы і далейшага догляду бульбы. Што да вырабу глебы і далейшага догляду, то трэба сказаць, што яны ня вельмі адрозьніваліся паміж сабой у паасобных дасьледваньнях. Першы раз аралі ўвосень у большасьці выпадкаў у канцы верасьня—у пачатку кастрычніка месяцаў глыбінёй ад $2^1/_2$ да 3 вяршкоў і толькі на супяшчаных глебах большасьць дасьледчыкаў першы раз узорвалі пад бульбу вясной. Веснавая апрацоўка глебы там, дзе была ўзарана ўвосень, пачыналася з баранаваньня; баранавалі пераважна ў другой палове красавіка і першай палова мая. Пасьля баранаваньня ўзорвалі глебу другі раз, а потым яшчэ раз скародзілі і па заскароджаным полі высявалі мінэральнае ўгнаеньне. Мінэральнае ўгнаеньне расьсявалася рукамі дзён за тры да пасадкі бульбы. Бульбу садзілі пад плуг. У сувязі са спазьненьнем вясны садзілі яе ў другой палове мая месяца. а ў некаторых выпадках і ў пачатку чэрвеня.

У гэтым годзе, як і ў мінулым, вясна была халодная, вельмі зацяжная. Усходзіла бульба толькі ў першай палове ліпня. Баранавалі да ўсходу, а ў некаторых выпадках — у пачатку ўсходу бульбы. Асыпаньне рабілася ў большасьці выпадкаў 2 разы.

Канечна трэба адзначыць, што лішак вільготнасьці і раньнія восенныя халады не далі магчымасьці бульбе скон-

чыць поўны вэгетацыйны пэрыяд, што ў значнай ступені зьвязана з недаборам ураджаю.

У сувязі з тым, што досьледы з бульбай ставіліся на глебах розных тыпаў і не па аднэй схэме, трэба разгледзець вынікі гэтых досьледаў паасобку.

Бульба на мінэральным угнаеньні і гнаі на лёэсавых суглінках.

Такіх досьледаў было організавана 8, выключна ў Горацкім раёне. Досьледы ставіліся па арганічным фоне там, дзе летась было жыта па гнаі. Вынікі і схэму гэтых досьледаў магчыма бачыць з табліцы № 2.

Табліца № 2.

Уплыў мінэральнага ўгнаеньня на ўраджай бульбы (сярэдняе з 7 досьледаў).

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка		
	Цэнтнэраў на гектар	Пудоў на дзесяціну	%
Без угнаеньня (ураджай кантролю)	118,9	793	—
Супэрфасфат 3 *цнт* на гектар (20 пуд.—дзес)	+ 22,17	+ 147,8	+ 18,5
Каліевая соль 1,5 *цнт* на гектар (10 пуд.—дзес.)	+ 17,87	+ 119	+ 15.0
Супэрфасфат + каліевая соль . .	+ 38.95	+ 259,6	+ 32,8
Гной 360 *цнт* на *га* (2.400 пуд. на дзесяціну)	+ 51,03	+ 340,2	+ 42,0

Назіраная дабаўка ад паасобных угнаеньняў неаднолькавая. Найбольшую дабаўку даў супэрфасфат—22,17 *цнт*/*га* [1])—



Мал. № 1.

Бульба па мінэральнаму ўгнаеньню: Справа налева. 1) Без угнаеньня. 2) Супэрфасфат. 3. Кал. соль. Бліндзероў Ф. М., Рэкта, Горацкага раёну.

[1]) *га*—трэба разумець гектар.

147,8 пуд. на дзесяціну; значна таксама падняла ўраджай і каліевая соль—17,87 *цнт/га*—119 п. на дзес. Калій і супэрфасфат павысілі ўраджай як паасобныя ўгнаеньні разам узятыя (малюнак 1). Гной (норма 2.400 пуд. на дзес.) павысіў ураджай больш чым калій і супэрфасфат, але-ж, калі мы будзем вылічаць прыбытковасьць ад угнаеньня, дык убачым, што ад калію + супэрфасфат прыбытак большы, чым ад гною.

Уплыў каліевай солі і супэрфасфату (на фоне 180 *цнт/гект* гною) на ўраджай бульбы.

Такіх досьледаў было 5 у слухачоў Сялянскага Універсытэту. Адносна вынікаў іх гл. табліцу № 3.

Табліца № 3.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай бульбы на фоне 180 *цнт* гною (сярэдняе з 5 досьледаў).

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка		
	Цэнтнэраў на гектар	Пудоў на дзесяціну	%
Без угнаеньня (ураджай контролю)	232	1552	—
Супэрфасфат 3 *цнт* (20 пуд.) . .	+ 55.02	+ 366,8	+ 23,6
Каліевая соль 1,5 *цнт* (10 пуд.) .	+ 25,05	+ 167	+ 10,7
Супэрфасфат + каліевая соль . .	+ 69,43	+ 463	+ 29,8
Гной 360 *цнт* (2.400 пуд.) . . .	+ 49,43	+ 329,5	+ 21,2

Трэба адзначыць тое, што тут калій + супэрфасфат на фоне 1/2 нормы гною па сярэдніх даных павысіў ураджай больш, чымся па норме (2.400 пуд.) гною. Адсюль можна сказаць, што нехапаючую колькасьць гною з вялікім посьпехам можна замяніць мінэральнымі ўгнаеньнямі, кладучы іх на фоне 1/2 нормы гною, што падкрэсьлівае малюнак 2.



Мал. 2.

Бульба па мінэральнаму ўгнаеньню: 1) Кал. соль + Супэрфасфат. 2) Гной. Селяніна-дасьледчыка Бліндзероў Ф. М., Рэкта, Горацкага раёну.

Ураджай атрымліваецца большы, чым ад поўнай нормы гною.

Досьледы з бульбай на лёгкіх лёэсаватых суглінках—Аршанскі раён.

Гэтыя досьледы ставіліся, як і ў першай схэме, па арганічным фоне, дзе летась клаўся гной пад жыта (у дасьледчыка Каранеўскага П. бульба сеялася па сьвежым гнаі).

Аб выніках досьледу глядзі на табліцы № 4.

Табліца № 4.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай бульбы на лёгкіх лёэсаватых суглінках (сярэдняе з 5 досьледаў).

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка		
	Цэнтнэраў на гектар	Пудоў на дзесяціну	%
Без угнаеньня (ураджай контролю)	162,86	1089	—
Супэрфасфат 3 *цнт* на *га* (20 пуд. на дзес.)	+ 18,22	+ 121,5	+ 11,2
Каліевая соль 1,5 *цнт* на *га* (10 пуд. на дзес.).	+ 26,82	+ 179	+ 16,4
Супэрфасфат + каліевая соль . .	+ 37,90	+ 253	+ 23,2
Гной 360 *цнт* на *га* (2.400 пуд на дзесяціну)	+ 43,5	+ 290	+ 26,6

У параўнаньні з вышэйадзначанымі досьледамі каліевая соль тут дала большую дабаўку за супэрфасфат на 8,6 *цнт* на *га*.

Большы эфэкт дзеяньня каліевае солі, чымся супэрфасфату, можна тлумачыць неаднолькавым глебавым тыпам. Глебы досьледаў Аршанскага раёну ў параўнаньні з Горацкімі глебамі зьяўляюцца больш лёгкімі суглінкамі, якія з мэханічнага складу набліжаюцца да супяшчаных глеб, а на супесях, як мы ўбачым ніжэй, калій у большасьці выпадкаў дае большую дабаўку, чымся супэрфасфат.

Бульба на супяшчаных глебах—Дрыбінскі раён.

(Вынікі—на табліцы № 5).

Табліца № 5.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай бульбы на супяшчаных глебах (сярэдняе з 4 досьледаў).

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка		
	Цэнтнэраў на гектар	Пудоў на дзесяціну	%
Без угнаеньня (ураджай контролю)	122,06	814	—
Супэрфасфат 3 *цнт* на *га* (20 пуд. на дзес.)	+ 22,80	+ 152	+ 18,2
Каліевая соль 1,5 *цнт* на *га* (10 пуд. на дзес.)	+ 60,91	+ 406	+ 49,9
Супэрфасфат + каліевая соль . .	+ 49,93	+ 333	+ 40,8
Гной 360 *цнт* на *га* (2.400 пуд. на дзес.)	+ 39,53	+ 263,5	+ 32,4

Гэтыя досьледы далі амаль такія самыя вынікі, як і на лёгкіх суглінках і з тэю толькі розьніцаю, што гной тут даў меншую дабаўку, чым калій з супэрфасфатам.

Бульба па каліевай солі, супэрфасфату і чылійскай салетры.

Пазнаёміўшыся з дзеяньнем каліевых і фосфарных угнаеньняў пад бульбу, паглядзім, які ўплыў робіць на ўраджай бульбы азоцістае ўгнаеньне (чылійская салетра), якая клалася ў камбінацыі з каліевай сольлю і супэрфасфатам.

Гэтыя досьледы былі пастаўлены ў членаў вясковых ячэек Асоавіяхэму ў колькасьці 4-х досьледаў на лёэсавых суглінках. Паводле сярэдніх даных, па 4-х гаспадарках самая лепшая дабаўка атрымалася ад азоту + калій + супэрфасфат, паложаных разам (67 *цнт* на *га*—449,3 пуда на дзес.). Ураджай у параўнаньні з кантрольнай павысіўся больш, чым на палову. На другім месцы па велічыні дабаўкі стаіць чылійская салетра + супэрфасфат (57,4 *цнт* на *га*—382 пуд. на дзес.), потым ідзе супэрфасфат + каліевая соль і апошняе месца займае чылійская салетра + каліевая соль.

З паданых лічбаў бачым, што ўжываньне азоцістых угнаеньняў пад бульбу таксама дае значную дабаўку. У бу-

дучым маецца на ўвазе досьледы бульбы з азоцістымі ўгнаеньнямі правесьці ў большай колькасьці на розных глебавых тыпах.

Бульба па гнаі і торфу, паложаных паасобку і разам на лёэсавым суглінку.

(Аб выніках гл. табліцу № 6).

Табліца № 6.

Уплыў торфу на ўраджай бульбы (сярэдняе з 2 досьледаў).

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка		
	Цэнтнэраў на гектар	Пудоў на дзесяціну	%
Без угнаеньня (ураджай кантролю)	74,6	508	—
Торф 360 *цнт* на *га* (2.400 пуд. на дзес.)	— 3,85	— 29	— 5
Торфу 180 *цнт* + гною 180 *цнт* .	+ 28,4	+ 189	+ 37,1
Гной 360 *цнт* на *га* (2.400 пуд. на дзес.)	+ 29,40	+ 196	+ 38,7

На гэту тэму было пастаўлена ўсяго два досьледы ў саўгасах Леніна і Собалева. У адным досьледзе торф павысіў ураджай бульбы на 9,3 *цнт* на *га*—62 пуды на дзес., у другім значна менш. Торф, паложаны разам з гноем (1/2 торфу + 1/2 гною), даў ураджай, які мала адрозьніваецца ад нормы гною. Торф, як угнаеньне, браўся з куч, якія ўсю зіму ляжалі на вольным паветры [1]).

Карысьць ужываньня мінэральных угнаеньняў пад бульбу.

Разгледзеўшы дабаўку бульбы ад розных угнаеньняў, на розных глебах у абсолютных лічбах і ў процантах, зробім грашовы падрахунак, узяўшы для прыкладу сярэднія даныя па 7 першых досьледах (табл. № 7), карыстаючыся пры гэтым мясцовымі восеннімі цэнамі на бульбу, а на ўгнаеньне той цаной, якая заплочана за іх у той час, калі ўгнаеньне куплялі (кошт бульбы прыняты 3,12 кап. *кг*—50 кап. пуд.

[1]) Зьніжэньне ўраджаю ад торфу ў саўгасе Леніна можна тлумачыць нізкім месцам досьледчых вучасткаў; гэта зьвязана з лішкам вільготнасьці, што магло зрабіць уплыў на ўраджай.

Супэрфасфат—4 кап. *кг*—56 кап. пуд., каліевая соль—7 к. *кг*—1 р. 12 кап. пуд. Гной—75 кап. воз—3 кап. пуд.).

Табліца № 7.

Назва і колькасьць угнаеньняў	Дабаўка ўраджаю		Кошт дабаўкі		Кошт угнаен.		Прыбытак	
	Цэнт. на гект.	Пуд. на дзес.	Руб.	Кап.	Руб.	Кап.	Руб.	Кап.
Супэрфасфат—20 пуд. на дзес.	22,17	147,8	73	60	10	80	62	80
Каліевая соль—10 пуд. на дзес.	17,87	119	54	50	11	20	43	30
Каліевая соль—10 пуд. + +супэрфасфат—20 пуд. на дзес.	38,95	259,6	129	80	22	—	107	80
Гной—2.400 п. на дзес. .	51,03	340	170	—	72	—	98	—

Такі прыбытак атрыманы ад дзеяньня мінэральных угнаеньняў у сярэднім з 7 сялянскіх гаспадарак на працягу аднаго году. Але-ж досьледы з пасьлядзеяньнем пераконваюць нас у тым, што каліевая соль і супэрфасфат павышаюць ураджай і на другі год пасьля таго, як іх клалі.

Пасьлядзеяньне мінэральных угнаеньняў.

Яшчэ летась у плян работы сялян-дасьледчыкаў было дадана пытаньне аб вывучэньні пасьлядзеяньня мінэральных угнаеньняў, інакш кажучы, пытаньне аб тым, на працягу колькіх год адзін раз паложанае мінэральнае ўгнаеньне павышае ураджай. У гэтым годзе пасьлядзеяньне вывучалася на ярыне, якая ішла пасьля бульбы. Досьледы былі пастаўлены з пшаніцай-яркай, аўсом і ячменем у колькасьці 13 у Кацялёўскім і Рэкцянскім с.-с. Горашкага раёну, на тых дасьледчых вучастках, дзе летась была бульба на каліевай солі і супэрфасфату. Пад ярыну падсявалася канюшына, якая сялянам-дасьледчыкам давалася дарма пры ўмове, што ўраджай канюшыны таксама будзе падлічацца з тым, каб уявіць дзеяньне мінэральных угнаеньняў на 3-ці год пасьля таго, як яны былі паложаны. Перад тым, як разглядаць вынікі досьледаў (гл. табл. № 8), трэба зазначыць, што падлік досьледаў з пасьлядзеяньнем рабіўся па мэтаду квадратаў, у выніку чаго атрыманы высокія лічбы ўраджаю і дабаўкі. Падаем іх у процантах: каліевая соль у сярэднім падвысіла ўраджай аўса на 14,7, пшаніцы на 18,7 супэрфасфат павысіў

ўраджай аўса на 21,3, пшаніцы на 19,2. Калі + супэрфасфат, павысілі ўраджай аўса на 24,6 і пшаніцы—на 21,3.

Табліца № 8.

Пасьлядзеяньне мінэральных угнаеньняў на ўраджай зерня, аўса і пшаніцы.

Назва ўгнаеньняў	Авёс—дабаўка (сярэдн. з 3-х досьледаў)			Пшаніца—дабаўка (сярэдн. з 6 досьледаў)		
	Цэнтнэр. на гектар	Пудоў на дзес.	%	Цэнтнэр. на гектар	Пудоў на дзес.	%
Без угнаеньня (ураджай кантролю) . .	16,45	109,6	—	11,04	+ 74	—
Супэрфасфат .	+ 3,69	+ 24,6	+ 21,8	+ 2,13	+ 14,2	+ 19,2
Каліевая соль.	+ 2,42	+ 16,1	+ 14,7	+ 1,74	+ 11,6	+ 15,7
Супэрфасфат + каліевая соль	+ 4,06	+ 27	+ 24,6	+ 2,36	+ 16	+ 21,3

ЖЫТА.

У досьледах з жытам ставілася на мэце вывучыць наступныя пытаньні:

1) Як пазысіць ураджай жыта на канюшынавым папары.

2) Ці магчыма замяніць на позьнім сялянскім папары частку гною фасфарытам і наогул вывучэньне фасфарыту як угнаеньня. Па першым пытаньні пастаўлена 12 досьледаў, па другім—5.

Жыта па каліевай солі і супэрфасфату на канюшынавым папары.

Табліца № 9.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай жыта на канюшынавым папары.

Назва ўгнаеньняў	На суглінках			На супесях		
	Дабаўка зерня (сярэд. з 6 досьл.)			Дабаўка зерня (сярэд. з 6 досьл.)		
	Цэнтн. на гект.	Пудоў на дзес.	%	Цэнтн. на гект.	Пудоў на дзес.	%
Без угнаеньня (урадж. кантролю)	11,85	79	—	12,40	82,6	—
Супэрфасфат 3 *цнт* на *га* (20 пуд. на дзес.)	+3,23	+21,4	+23,3	+1,30	+8,6	+10,4
Каліевая соль 1,5 *цнт* на *га* (10 пудоў на дзес.) . . .	+2,90	+19,3	+20,8	+1,13	+7,5	+9,0
Супэрфасфат + каліевая соль .	+5,01	+33,4	+36,1	+3,25	+21,6	+26,2

Пытаньне, як павысіць ураджай жыта на канюшынішчы вывучалася шляхам ужываньня пад жыта каліевае солі і суперфасфату, якіх клалі паасобку і разам. Крыху тэхнікі. Канюшынішча ўраблялася так: першы раз аралі паасобныя дасьледчыкі ў першай палове ліпня, глыбінёй ад 2½ да 4 вяршкоў і ў другой палове ліпеня поле баранавалася. Другі раз узорвалі ў 2-ой палове жніўня, пасьля чаго ў пачатку верасьня на выраўненую баранаваньнем плошчу клалася мінэральнае ўгнаеньне і праз 2—3 дні пасьля гэтага высявалася жыта.

У выніку гэтых досьледаў трэба адзначыць, што супэрфасфат на суглінках павышае ўраджай жыта лепш, чым каліевая соль, а на супесях наадварот—каліевая соль дае лепшую дабаўку за супэрфасфат.

Жыта па гнаі і фасфарыту, паложаных паасобку і разам на позьнім сялянскім папары.

(Вынікі—гл. табл. № 10).

Уплыў фасфарыту і гною на ўраджай жыта на лёсаватых суглінках (сярэдняе з 4 досьледаў).

Табліца № 10.

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка зерня		
	Цэнтнэраў на гектар	Пудоў на дзес.	%
Без угнаеньня (ураджай кантролю)	6,96	46,4	—
Фасфарыт 90 *кг* чыстага на *га* .	+1,83	+12,2	+26,3
½ нормы гною + ½ фасфарыту .	+3,62	+24,0	+52,0
Гной—360 *цнт* на *га* (2.400 пуд. на дзес.)	+6,88	+45,8	+98,5

Выраб глебы пад досьледы нічым не адрозьніваўся ад вырабу звычайных позьніх сялянскіх папараў. Першы раз папар узорваўся ў 2-х выпадках у другой палове чэрвеня і ў трох выпадках у першай палове ліпеня. Фосфарыт клаўся пасьля баранаваньня за 2—3 тыдні да засеву жыта. Жыта сеялі ў першай палове верасьня.

Табліца 11.

Грашовы разьлік ужываньня мінэральных угнаеньняў пад жыта па сярэдніх даных 6-ці гаспадарак.

Назва і колькасьць угнаеньняў	Дабаўка ўрадж. зерня.	Кошт дабаўкі		Кошт угнаен.		Прыбытак	
	Пудоў на дзес.	Руб.	К.	Руб.	К.	Руб.	К.
Супэрфасфат—20 пудоў на дзесяціну . . .	21	27	30	10	80	16	50
Каліевая соль—10 пудоў на дзесяціну . . .	19	24	70	11	20	13	50
Каліевая соль—10 пудоў + супэрфасфат—20 пуд.	34	44	20	22	—	22	20

Мінэральныя ўгнаеньні ацэнены па тэй цане, як і ў досьледах пад бульбу. Жыта ацэнена па 8 руб. 12 кап. цэнтнэр—1 руб. 30 кап. пуд.

АВЁС ПА МІНЭРАЛЬНЫМ УГНАЕНЬНІ.

З аўсом было праведзена два досьледы ў членаў ячэйк Асоавіяхэму: Баранцэвіча П. С. на супяшчанай глебе пасьля жыта, пад якое клаўся гной 1/2 нормы, і Корабава П. А. на суглінку пасьля бульбы з коранем пасьля гною. (Вынікі гл. табліцу № 12).

Табліца 12.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай аўса.

Назва ўгнаеньняў	На супесях			На суглінку		
	Дабаўка зерня			Дабаўка зерня		
	Цэнтн. на гект.	Пуд. на дзес.	%	Цэнтн. на гект.	Пуд. на дзес.	%
Без угнаеньня (ураджай кантр.) .	11,04	73,6	—	14,85	99,0	—
Супэрфасфат 3 цэнтн. на *га* (20 п. на дзесяціну) . . .	+2,25	+15	+20,3	—	—	—
Каліевая соль 1,5 цэнт. на *га* (10 п. на дзесяціну . . .	+2,50	+16,7	+22.6	—	—	—
Салетра 30 *кг* чыстае на *га* .	+1,48	+ 9,8	+13,4	—	—	—
Каліевая соль + супэрфасфат .	+2,94	+19,9	+26,6	+3.5	+23,3	+20,9
Каліевая соль + чылійская салетра	+1,79	+12,9	+16,2	+0,53	+ 3.5	+ 3,5
Чылійская салетра + супэрфасфат	+3.71	+24,7	+33,6	+3,74	+24,9	+25,2
Чылійская салетра + супэрфасфат + каліевая соль . . .	+5,87	+39,1	+53,1	+9,02	+60,1	+60,6

У сувязі з тым, што гэтыя досьледы ставіліся на розных глебах і па розных схэмах, падагуліць іх вынікі немагчыма. У выніку гэтых досьледаў на суглінку найбольшая дабаўка ўраджаю аўса атрымана ад калій + чылійская салетра + супэрфасфат, паложаных разам. На другім месцы па велічыні дабаўкі ўраджаю ідзе чылійская салетра + супэрфасфат і калій + супэрфасфат і на апошнім месцы стаіць чылійская салетра + каліевая соль.

На супяшчанай глебе дае большую дабаўку ўраджаю аўса каліевая соль, потым супэрфасфат, які мала чым адрозьніваецца ад каліевай солі, і на апошнім месцы чылійская салетра. Пры камбінацыі ўгнаеньняў на першым месцы па велічыні дабаўкі ўраджаю стаіць камбінацыя—чылійская салетра + супэрфасфат + каліевая соль, потым чылійская салетра + супэрфасфат і каліевая соль + супэрфасфат іна апошнім месцы—чылійская салетра + каліевая соль. Паколькі досьледы праводзіліся толькі ў 2-х гаспадарках—пэўныя вывады рабіць на падставе іх немагчыма.

Л Ё Н.

Лён па мінэральным угнаеньні.

(Вынікі табл. № 13).

Табліца № 13.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай лёну на лёэсаватых суглінках (сярэдняе 2-х досьледаў).

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка		
	Цэнтн. на гект	Пудоў на дзес.	%
Без угнаеньня (ураджай кантролю)	6,66	45	—
Супэрфасфат 3 цэн. на *га* . .	+2,46	+16,4	+36,8
Каліевая соль 1,5 ц. на *га* . .	+3,29	+21,9	+49,0
Супэрфасфат+каліевая соль . .	+3,17	+21,1	+48,1

З мінэральнымі ўгнаеньнямі пад лён праведзена 4 досьледы, але-ж вынікі магчыма падаць толькі па 2-х досьледах. Два другія дасьледчыя полі, у сувязі з вялікімі дажджамі пасьля засеву лёну, былі вельмі засьмечаны, у выніку чаго пасевы загінулі.

Уплыў гушчыні засеву на ўраджай лёну.

У выніку гэтых досьледаў можна сказаць, што 9-пудовы засеў лёну зьяўляецца самым рацыянальным. Тая дабаўка ўраджаю, якая атрымана пры высеву 12 п. лёну на дзесяціну, не пакрывае лішніх 3-х пуд. насеньня, патрачанага на высеў.

Табліца 14.

Норма высеву на дзесяціну	Ураджай насеньня (сярэдняе з 2-х досьледаў)	
	Цэнтнэраў на гектар	Пудоў на дзесяціну
6 пудоў . . .	4,33	28
9 „ . . .	5,26	35
12 „ . . .	5,85	35,5

КАНЮШЫНА.

Ураджай канюшыны першага году карыстаньня па паверхневым мінэральным угнаеньні на лёэсавых суглінках.

На гэту тэму праведзена 7 досьледаў. Канюшына летась засявалася ва ўсіх выпадках пад пшаніцу-ярку, за выключэньнем аднаго, дзе засеў канюшыны быў зроблены пад авёс.

У трох выпадках пад ярыну клаўся гной ад 0,5 да 0,75 нормы, а ў іншых 4-х (у Сталбанава Л., Пытко П., саўгасе Леніна, Баранцэвіча П.) канюшына ішла другім коранем пасьля гною. Каліевая соль і супэрфасфат клаліся пад канюшыну паверхнева ў першай палове мая з адначасовым баранаваньнем канюшыны ў 2—3 сьляды, аб выніках гл. табліцу № 15.

Па сваім дзеяньні паводле сярэдніх даных супэрфасфат і каліевая соль мала адрозьніваюцца між сабою. Супэрфасфат павысіў ураджай канюшыны на 9,83 цэнт. на *га*—65—51 п. на дзес., а каліевая соль—на 9,52 цэнт. на *га*—63,4 пуд. на дзесяціну. Супэрфасфат + каліевая соль павысілі ўраджай канюшыны на 16,5 цэнтн. на *га*—109 пуд. на дзесяціну. Гэтыя лічбы датычаць аднаго толькі першага ўкосу канюшыны.

Табліца 15.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай канюшыны (сярэдняе з 6 досьледаў).

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка сена		
	Цэнтн. на гект.	Пудоў на дз.	%
Без угнаеньня (ураджай кантролю)	41,68	278	—
Супэрфасфат 3 цэнт. на *га* . .	+9,83	+65,5	+23,5
Каліевая соль 1,5 цэнт. на *га* .	+9,52	+63,4	+22,8
Супэрфасфат+каліевая соль .	+16,5	+ 109,9	+39,5

Канюшына першага году карыстаньня па паверхневым мінэральным угнаеньні і вапне.

З паверхневым мінэральным угнаеньнем і вапнай пад канюшыну ўсяго праведзена 7 досьледаў. Досьледы праведзены на розных глебах, згодна з табл. № 16.

Табліца № 16.

Уплыў мінэральных угнаеньняў і вапны на ўраджай канюшыны.

Назва ўгнаеньняў	На суглінку			На супесі		
	Дабаўка сена (сярэдняе з 3 досьл.)			Дабаўка сена — 1 досьлед		
	Цэнтн. на гект.	Пуд. на дзес.	%	Цэнтн. на гект.	Пуд. на дзес.	%
Без угнаеньня (урадж. кантр.) .	56,92	379,4	—	20,05	133,6	—
Супэрфасфат 3 цэнтн. на *га* .	+5,15	+34,2	+9	+4,72	+31,4	+23,0
Супэрфасфат+каліевая соль .	+11,1	+74,2	+19,4	+12,15	+81,2	+67,0
Супэрфасфат+каліев. соль+вапна	+21,59	+143,9	+37,9	+10,36	+69,6	+51,0
Вапна	—0,03	—0,3	—	—0,4	—2,6	— 2,0

Канюшына таксама падсявалася пад авёс, і толькі ў адным выпадку пад жыта, пад якое клаўся гной. Авёс ішоў другім коранем пасьля гною. Мінэральныя ўгнаеньні і вапна клаліся ў першай палове мая. У выніку гэтых досьледаў каліевая соль + супэрфасфат + вапна, паложаныя разам, павысілі ўраджай канюшыны больш, чым каліевая соль + супэрфасфат бяз вапны. Вапна, паложаная адна, дала адмоўныя вынікі. У досьледах-жа Аршанскага раёну вапна павысіла ўраджай канюшыны на 22,8 проц.

Грашовы прыбытак ад ужываньня мінэральных угнаеньняў пад канюшыну паводле сярэдніх даных 6 досьледаў.

Табліца № 17.

Ацэньваючы канюшыну па восеннай цане 50 кап. пуд, атрымаем такія лічбы.

Назва і колькасьць угнаеньняў	Дабаўка ўраджаю канюшыны		Кошт дабаўкі		Кошт угнаеньня		Прыбытак	
	Цэнт. на гект.	Пуд. на дзес.	Р.	К.	Р.	К.	Р.	К.
Супэрфасфат 20 п. на дзесяціну. . . .	9,83	65,51	32	75	10	80	21	95
Каліевая соль 10 п. на дзесяціну . . .	9,52	63,4	31	70	11	20	20	50
Каліевая соль 10 п.+супэрфасфат—20 п. на дз.	16,5	109,9	54	95	22	—	32	95

Калі прымем пад увагу дабаўку канюшыны ад другога ўкосу, дык прыбытак ад ужываньня мінэральных угнаеньняў будзе значна большы.

Досьледы з канюшынай рабілі вельмі добрае ўражаньне на вакольнае насельніцтва. Тое, што дзеяньне мінэральнага ўгнаеньня адразу было вельмі добрае, прымушала і тых, хто ня верыў, праканацца ў карысьці мінэральных угнаеньняў. „А ўсё-ж ткі, вось на гэтай дзялянцы канюшына лепшая. Вось тут выразна і без калкоў відаць, што канчаецца адна дзялянка і пачынаецца другая"—так казалі сяляне вёскі Андрухі, Горацкага раёну, аглядаючы дасьледчы вучастак канюшыны ў дасьледчыка П. Пытко.

СЕНАЖАЦЬ.

З паверхневым угнаеньнем на сухадольнай сенажаці праведзена было два досьледы. Сенажаць пры гэтым баранавалася. Глеба—супесь ападзоленая. На падставе гэтых досьледаў магчыма адзначыць, што (гл. табліцу 19) лепшую дабаўку ўраджаю сена дала каліевая соль—6,89 *цнт* на *га*, ці 45,9 пуда на дзесяціну. Тамасаўка павысіла ўраджай сена менш, чым каліевая соль. Тамасаўка + каліевая соль таксама значна павысілі ўраджай.

У сувязі з абмежаваным лікам досьледаў—пэўных вывадаў зрабіць нельга.

Табліца № 18.

Уплыў мінэральнага ўгнаеньня на ўраджай сенажаці (сярэдняе з 2-х досьледаў).

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка сена		
	Цэнт. на гект.	Пуд. на дзес.	% %
Без угнаеньня (ураджай кантролю)	34,80	230	—
Тамасаўка	+ 3,0	+ 20	+ 8,6
Каліевая соль . . .	+ 6,89	+ 45,9	+ 19,8
Тамасаўка + каліевая соль .	+ 4.57	+ 30,5	+ 13,1

КОРАНЬПЛОДЫ.

Усяго з кораньплодамі праведзена 7 досьледаў, але-ж вынікі маем толькі па 4-х, а тры досьледы, у сувязі з моцнаю засьмечанасьцю і несваячасовай барацьбой з ёю—загінулі.

Паколькі гэтыя досьледы ставіліся не па аднэй схэме—падагуліць вынікі іх немагчыма, таму разгледзім іх па асобных схэмах.

З сярэдніх даных па двух досьледах (табліца № 19) бачым, што каліевая соль + гной павысілі ўраджай буракоў на 40,7 цнт. на гектар, ці 298 п. на дзесяціну. Супэрфасфат-жа з гноем павысілі ўраджай на 38,20 цнт. на гектар, ці 254,8 п. на дзесяціну і каліевая соль + супэрфасфат + гной павысілі ўраджай буракоў на 31,2 цнт. на гектар, ці 208,3 пуда на дзесяціну. Гэтыя досьледы ставіліся на суглінку.

Табліца № 19.

Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай кораньплодаў.

Нвзва ўгнаеньняў	На супесі			На суглінку		
	Дабаўка 1 досьл.			Дабаўка 2 досьл.		
	Цэнтн. на гект.	Пуд. на дзес.	% %	Цэнтн. на гект.	Пуд. на дзес.	% %
Гной 360 ц. на гект. (ураджай кантр.) .	203,93	13,59	—	422,2	28,15	—
Гной + супэрфасфат 3 цнт. на гект.. .	+ 10,65	+ 71	+ 5,2	+ 38,2	+ 254,8	+ 9.0
Гной + кал. соль 1,5 ц. на гект.	+ 113,44	+ 756,3	+ 55,6	+ 40,7	+ 298	+ 9,6
Гной + супэрфасфат + кал. соль . . .	+ 106,89	+ 713	+ 52,4	+ 31,20	+ 208,3	+ 7,3

На супяшчанай глебе ў Дрыбінскім раёне на такую-ж самую тэму праведзены досьлед сельска-гаспадарчай камунай „Хлеб і Воля". Вынікі гэтага досьледу адрозьніваюцца ад разгледжаных на суглінку тым, што тут каліевая соль, паложаная разам з гноем, павысіла ўраджай значна больш, чым супэрфасфат + гной. Па каліевай солі + гной дабаўка ўраджаю была роўна 113,44 цэнт. на гект.—756,3 пуда на дзес., па супэрфасфату + гной 10,65 ц. на гектар—71 пуд на дзесяціну.

З чылійскай салетрай у камбінацыі з каліевай сольлю і супэрфасфатам пастаўлены адзін досьлед у дасьледчыка—члена Асовіяхэму па пяцярной схэме. Вынікі досьледу наступныя:

1) Без угнаеньня (ураджай кантролю) 103 *цнт* на *га*
2) Чылійская салетра + каліевая соль далі дабаўку . . . . . + 47 „ „ „
3) Чылійская салетра + супэрфасфат 38 „ „ „
4) Каліевая соль + супэрфасфат . . 104 „ „ „

Дасьледчы вучастак быў закладзены на лёэсаватым суглінку. Буракі ішлі другім коранем пасьля гною.

Сортаспрабаваньне.

Калі ставіліся досьледы па сортаспрабаваньні, дык мелася на ўвазе адшукаць лепшыя сарты, якія-б, у параўнаньні з мясцовымі, давалі большы ўраджай.

Досьледы ў гэтым годзе былі праведзены з ячменем, аўсом, лёнам. На будучы год закладзены досьледы з жытам. З ячменем усяго праведзена 24 досьледы з наступнымі сартамі: „Лебядзіная Шыя“, „Прынцэса“, „Залаты“ і „Брыо“.

З аўсом праведзена 13 досьледаў з сартамі: „Шаціла ўскі“, „Залаты Дождж“, „Пабеда“ і „Гаралецкі“.

З лёнам праведзены досьледы з сартамі: Мышкінскі, Кацельніцкі, Порхаўскі і Глазоўскі.

З жытам закладзена 4 досьледы.

У сувязі з позьняй сяўбой, а таксама з прычыны частых дажджоў, дзякуючы чаму некаторыя сарты аўса ня зусім пасьпелі, з атрыманых вынікаў гэтых досьледаў немагчыма пакуль што рабіць пэўных вывадаў.

Цяпер магчыма толькі сказаць, што з ячменяў паводле сярэдніх даных сарты: „Прынцэса“, „Залаты“ і „Брыо“ далі значную дабаўку ўраджаю ў параўнаньні з мясцовымі, а ў досьледах з іншымі культурамі мясцовае насеньне дало большы ўраджай за сэлэкцыйнае.

Досьледы з азімымі на 1929 год.

Частка досьледаў з азімымі на 1929 год закладзена па схэмах мінулага году. Апрача гэтага, даны дадатковыя тэмы: 1) вывучэньне лубіну, як угнаеньня, у камбінацыі з гноем, фосфарнымі і каліевымі ўгнаеньнямі, 2) досьледы з сернакіслым аміяком у камбінацыі з фосфарнымі і каліевымі ўгнаеньнямі, 3) параўнаўчае дзеяньне паасобных фосфарных угнаеньняў. Усяго з азімымі закладзена 48 досьледаў і 4 досьледы з розным вырабам глебы пад яравыя.

Разьмеркаваньне досьледаў па асобных пытаньнях можна бачыць з наступнай табліцы.

Табліца № 20.

Досьледы з жытам на 1929 год.

№№ па чарзе	Тэмы досьледаў	Праведзена прац. станцыі	Пад кіраўніцтвам станцыі	Усяго
1	Уплыў гною ды фасфарыту паасобку і разам на ўраджай жыта . .	7	4	11
2	Параўнаўчае дзеяньне каліевай солі і супэрфасфату з гноем на канюшыну	5	—	5
3	Параўнаўчае дзеяньне каліевай солі і сернакіслага аміяку з гноем на фасфарытавым фоне . . .	2	—	2
4	Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай жыта	7	6	13
5	Уплыў мінэральных угнаеньняў на ўраджай жыта	5	—	5
6	Вывучэньне фосфарных угнаеньняў .	—	3	3
7	Уплыў лубіну ў камбінацыі з гноем .	2	—	2
8	Уплыў лубіну ў камбінацыі яго з фасфарытам і каліевай сольлю . .	3	—	3
9	Сортаспрабаваньне жыта . . .	4	—	4
10	Выпрацоўка глебы пад яравыя . .	4	—	4
	Усяго . .	39	13	52

Апрача адзначаных досьледаў, прапанаваны схэмы і пасланы мінэральныя ўгнаеньні для закладкі 2—4 досьледаў у кожным адміністрацыйным раёне Аршаншчыны.

Заключэньне.

Паколькі работа сялян-дасьледчыкаў у межах дзейнасьці Горацкай Сельска-Гаспадарчай Дасьледчай Станцыі яшчэ вельмі маладая, пастолькі рабіць сталыя вывады на падставе праведзенай работы пакуль што немагчыма.

На падставе вынікаў гэтага году магчыма зрабіць наступныя заўвагі:

1) Невыстарчальную колькасьць гною з вялікім посьпехам магчыма папоўніць мінэральнымі ўгнаеньнямі, якія аплочваюць выдаткі на іх і, апрача таго, даюць значны прыбытак. Самы большы прыбытак ад мінэральных угнаеньняў атрыманы, калі яны клаліся пад бульбу.

2) З паасобных мінэральных угнаеньняў лепшая дабаўка ўраджаю збожжавых культур, канюшыны і кораньплодаў атрымана ад фосфарных угнаеньняў, прыватна-ж, ад супэрфасфату пры значнай дабаўцы каліевай солі. Такія вынікі мы маем на суглінках.

3) Камбінацыя азоцістых угнаеньняў—чылійскай салетры з супэрфасфатам пад яравыя культуры таксама значна павышае ўраджай (досьледы з аўсом, бульбай).

4) Досьледы з пасьлядзеяньнем мінэральных угнаеньняў пераконваюць нас у тым, што каліевая соль і супэрфасфат павышаюць ураджай і на другі год пасьля таго, як былі паложаны.

5) Торф, калі ён кладзецца разам з гноем ($^1/_2$ торфу і $^1/_2$ гною), дае ўраджай, які мала адрозьніваецца ад нормы гною.

6. Паверхневае ўжываньне мінэральных угнаеньняў пад канюшыну мае асабліва вялікае значэньне для пасялковых гаспадарак і колгасаў, якім у пачатку арганізацыі прыходзіцца падсяваць канюшыну на слаба-запраўленых глебах; апрача павышэньня ўраджаю канюшыны, мінэральныя ўгнаеньні дапамагаюць таксама замацаваньню існуючых шматпалёвых севазваротаў.

Канчаючы аб рабоце мінулага году, трэба адзначыць, што вышэйпрыведзеныя даныя па асобных пытаньнях немагчыма раіць як рацэпт для невядомай гаспадаркі; зацікаўлены селянін, прагледзеўшы гэтыя даныя, павінен сам, шляхам пастаноўкі досьледаў, гэтыя вывады дапасаваць да ўмоў свае гаспадаркі.

Паколькі вынікі работы ў большасьці зьяўляюцца аднагадовымі, іх трэба праверыць на працягу некалькіх год пасьля чаго магчыма будзе больш канкрэтна рабіць тыя ці іншыя вывады.

А. І. Берзін,

І. Г. Уласенка.

ВЫНІКІ РАБОТЫ ІНСТЫТУТУ СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ ТУРСКАЙ С.-Г. ДАСЬЛЕДЧАЙ СТАНЦЫІ ЗА 1928 г.

Умовы, у якіх Станцыі прыходзілася праводзіць працу па Інстытуту сялян-дасьледчыкаў у 1928 годзе, былі вельмі няспрыяючымі: адсутнасьць па штату спэцыяльнага дзеля гэтай работы пэрсанала, адсутнасьць сродкаў на забесьпячэньне неабходнымі матар'ялямі дасьледчыкаў не далі магчымасьці ўнесьці плянавасьць у працу, правадзімых досьледаў з патрэбнай дасканальнасьцю мэтодыкі палявога досьледу.

Непасрэднае правядзеньне досьледаў у сялян-дасьледчыкаў лягло такім чынам абавязкам на раённы аграпэрсанал і саміх сялян-дасьледчыкаў без належнага кіраўніцтва і дапамогі з боку станцыі і адсюль—галоўныя недахопы гэтай працы: 1) нявытрыманасьць з боку мэтодыкі, 2) вялікая рознастайнасьць у схэмах досьледаў, 3) неадпаўковая колькасьць угнаеньняў у розных досьледах па адпаўковым схэмам, 4) несваячасовая прысылка справаздач па досьледам, 5) не па ўсім закладзеным досьледам зроблен вучот і г. д.

Толькі ў бліжэйшых к Станцыі паселішчах досьледы ў сялян праводзіліся пры непасрэднай дапамозе спэцыяльнага практыканта, вылучанага Станцыяй для гэтай мэты.

Кіраўніцтва работай вялося праз агранамічныя арганізацыі. З гэтай мэтай у 1928 годзе было праведзена: а) паседжаньне Навуковага Савету Станцыі з удзелам акруговых аграномаў, на якім было абмяркована пытаньне аб рабоце Інстытуту сялян-дасьледчыкаў на 1928 год, б) разасланы інструкцыі па правядзеньню досьледаў, в) праведзена 2-дзённая канфэрэнцыя сялян-дасьледчыкаў і аграномаў, на якой зроблена 5 дакладаў аб выніках прац Станцыі, г) праведзена некалькі экскурсій на Станцыю сялян-дасьледчыкаў у колькасьці 22 чалавек ад Гомельскай акругі і 180 чалавек—Бабруйскай.

За 1928 год да працы па Інстытуту сялян-дасьледчыкаў было ўцягнута 70 гаспадарак Бабруйскай акругі, 22 гаспадаркі—Магілеўскай і 22—Гомельскай. З агульнага ліку

дасьледчыкаў—сялян 99, калгасаў—9, вясковых школ—3, с.-г. школ—1, машынных т-ваў—1, К. С. У.—1. [1]).

Усяго досьледаў, па якім зроблен вучот і прадстаўлены справаздачы на станцыю, было праведзена 125, якія па тэмах разьмяркоўваюцца наступным чынам:

1) Уплыў штучных угнаеньняў на ўраджай аўса—33 досьледы.

2) Уплыў штучных угнаеньняў на ўраджай зімовага жыта—16 досьледаў.

3) Уплыў штучных угнаеньняў і гною на ўраджай бульбы—18 досьледаў.

4) Уплыў штучных угнаеньняў, унесеных павярхоўна, на ўраджай канюшыны—7 досьледаў.

5) Уплыў штучных угнаеньняў на ўраджай ільну—5 досьледаў.

6) Уплыў штучных угнаеньняў на ўраджай ячменю—6 досьледаў.

7) Уплыў штучных угнаеньняў на ўраджай караньплодаў—6 досьледаў.

8) Рэнтабельнасьць занятых папараў—3 досьледы.

9) Дзеяньне лубіну на зялёнае ўгнаеньне ў параўнаньні з гноем пад жыта—2 досьледы.

10) Уплыў часу пасеву лубіну і жыта на ўраджай—2 досьледы.

11) Уплыў гушчыні пасеву жыта на ўраджай—1 досьлед.

12) Мінэральныя ўгнаеньні пад грэчку і іх уплыў на ўраджай жыта—1 досьлед.

13) Велічыня ўраджаю лубіну (зерня) і сэрадэлі (сена)—2 досьледы.

14) Сортаспрабаваньне: жыта, аўса, ячменю, бульбы і караньплодаў—23 досьледы.

Для лепшага разгляду лічбаў па ўсіх досьледах падаюцца толькі дабаўкі ўраджаю ў параўнаньні з ураджаем кантрольных дзялянак і безадносныя лічбы па кантрольных дзялянках. З тае прычыны, што схэмы досьледаў для аднолькавых культур былі не заўсёды аднолькавымі для таго ці іншага ўгнаеньня або іх камбінацый дабаўкі ўраджаю па кожным

[1]) Прыведзены толькі тыя гаспадаркі, дзе досьледы былі даведзены да канца і па якім Станцыя атрымала справаздачы. Усяго-ж гаспадарак, дзе закладаліся досьледы, было значна больш, але точных лічбаў Станцыя ня мае.

відзе ўгнаеньня падаюцца самастойна, што дае магчымасьць рабіць параўнаньне на большым ліку выпадкаў.

Разглядаючы лічбовы матар'ял досьледаў, мы заўважаем, што нашы глебавыя адменьнікі (супесі і суглінкі—у большасьці выпадкаў лёгкія) вельмі моцна рэагуюць на галоўныя пажыўныя матар'ялы—азот, фосфар + калій.

У досьледах з кальцыем, апошні, апрача дадатковага ўплыву, у некаторых выпадках меў адмоўнае значэньне, але гэта тлумачыцца тым, што вапнаваньне рабілася вельмі позна і, паводле заўваг саміх сялян-дасьледчыкаў, яно апякала вэгетацыйныя органы.

Дасьледчая работа.

АВЁС.

Усяго з аўсом праведзена 23 досьледы, з якіх 18 на супяшчаных глебах і 5 на суглінках.

Папярэднімі культурамі ў 18 досьледах было зімовае жыта, для 3-х досьледаў—бульба, у адным—буракі і ў адным—віка.

Тэрмін засеву хістаўся ў межах ад 2 да 30 мая, прычым галоўны засеў рабіўся ў сярэдзіне мая. Апрацованы матар'ял дае наступныя лічбы.

Табліца № 1.

Назва і колькасьць угнаеньняў у цэнт. на гектар	Дабаўка ўраджаю аўса на супесі						
	Зерня цэнт. на гектар	Саломы цэнт. на гектар	У процантах		Сяр. ўрадж. кантролю ў цэнт. на гект.		Лік досьл.
			Зерня	Сал.	Зерня	Сал.	
Супэрфасфат (3,60—2,70)	+ 2,28	+ 4,22	+27,7	+36,3	8,23	11,62	11
Каліевая соль (1,80—1,3)	+ 3,91	+ 4,12	+43,0	+37,0	9,10	11,15	9
Каліевая соль + супэрфасфат . . .	+ 5,82	+ 7,10	+70,8	+66,2	8,22	10,73	11
Супэрфасфат + сярчана-кіслы амоні . .	+10,65	+14,99	+125,4	+145,5	8,49	10,30	11
Супэрфасфат + каліевая соль + сярчана-кіслы амоні	+14,46	+19,78	+170,3	+192,0	8,49	10,30	10

З паданай табліцы, бачым, што дзейнасьць угнаеньняў (азоту, фосфару і калія) на ўраджай аўса адбіваецца вельмі значна, прычым найбольшую дабаўку дае азот (у злучэньні сярчана-кіслага амонію дае дабаўку 55% зерня і 79,3% саломы), далей ідзе калій (дабаўка ўраджаю—43% зерня і 37% саломы) і, урэшце, фосфар (дабаўка ўраджаю 27,7% зерня і 37,3% саломы). Усе тры элемэнты разам даюць дабаўку ўраджаю—170,3% зерня і 192% саломы.

З тае прычыны, што дзейнасьць калі-фосфатных угнаеньняў вывучалася з двумя відамі азоцістых угнаеньняў—сярчана-кіслым амоніем і чылійскай салетрай, дык для параўнаньня іх дзейнасьці вынікі досьледаў з чылійскай салетрай падаюцца асобна.

Досьледы ставіліся на супесі і на суглінку, вынікі якіх паказаны ў табліцы № 2, стар. 80.

Дзейнасьць азоту, фосфару і калію ў гэтых досьледах застаецца тая-ж самая' як і ў першым выпадку. Прычым заўважана, што азот у злучэньні — чылійская салетра з фосфарам і каліем дае вялікае адхіленьне ў бок зьніжэньня дабавак ураджаю ў параўнаньні з сярчана-кіслым амоніем.

Гэта дае магчымасьць паставіць пытаньне аб скарыстаньні пад авёс на супяшчаных глебах лепш сярчана-кіслага амонію, чым салетры.

Што да дзейнасьці штучных угнаеньняў на суглінках, дык уплыў на ўраджай атрымліваецца іншы—фосфар (дабаўка—44,7% зерня, 32,2% саломы), потым каліевая соль (дабаўка—31% зерня і 26,3% саломы) і, урэшце, чылійская салетра (дабаўка—23% зерня і 30% саломы). Фосфар з трэцяга месца на супесі стаў на першае месца на суглінках.

Больш нізкі эфэкт азоту і калія абумоўліваўся тым, што ў гэтых-жа выпадках авёс быў пасеяны ў адным досьледзе пасьля кармовых буракоў, а ў іншых—пасьля бульбы.

БУЛЬБА.

Ва ўсіх досьледах з бульбай папярэднімі культурамі было зімовае жыта, якое ў большасьці выпадкаў сеялася па ўгноеным папары. Бульба сеялася з 11 па 26 мая і толькі ў адным досьледзе 17 чэрвеня. З усіх 12 досьледаў два забракаваны, а рэшта—8 было пастаўлена на супяшчаных глебах, а 2 досьледы на суглінках. Атрыманыя лічбы паказаны ў табліцы № 3, стар. 81.

Табліца № 2.

Назва і колькасьць угнаеньняў у цэнт. на гектар	Дабаўка ўраджаю аўса												
	На супесі							На суглінку					
	Зерня цэнт. на гектар	Саломы цэнт. на гектар	У %%		Сярэдні ўрадж. кантролю цэнт. на гектар		Лік досьледаў	Зерня цэнт. на гектар	Саломы цэнт. на гектар	У %%		Сярэдні ўрадж. кантролю цэнт. на гектар		Лік досьледаў
			Зерня	Саломы	Зерня	Саломы				Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	
Супэрфасфат 3,60—2,70	+ 3,08	+ 3,86	+ 33 9	+30,2	8,90	12,80	6	+5,07	+4,61	+44,7	+32,2	11,35	14,62	4
Каліевая соль 1,80—1,35	+ 3,92	+ 4,12	+ 43	+37	9,10	11,15	4	+3,52	+3,84	+ 31	+26,3	11,35	14,62	4
Чылійская салетра 1,20	+ 4,56	+ 5,05	+ 55	+48,2	8,30	10,47	2	+3,22	+5,27	+23	+30,2	14,00	17,48	2
Супэрфасфат + каліевая соль . . .	+ 5,48	+ 6,05	+ 64,6	+49	8,48	12,35	6	+7,56	+8,77	+66,6	+ 60	11,35	14,62	4
Каліевая соль + чылійская салетра .	+ 3,94	+10,29	+ 46,8	+98,3	8,43	10,47	1	—	—	—	—	—	—	—
Супэрфасфат + чылійская салетра .	+ 4,81	+ 6,07	+ 55,5	+56	8,66	10,85	3	—	—	—	—	—	—	—
Супэрфасфат + каліевая соль + чылійская салетра . .	+10,35	+13,73	+116,4	+115	8,90	11,94	6	+21,84	+24,97	+156	+143	14,00	17,48	2

Табліца № 3.

Назва і колькасьць угнаеньняў у цэнт. на гектар.	Дабаўка ўраджаю бульбы							
	На супесі				На суглінку			
	Бульбы цэнт. на гектар	У процантах	Сярэдні ўраджай кантр. цэнт. на гект	Лік досьледаў	Бульбы цэнт. на гект.	У процантах	Сярэд. ўрад. кантр. цэнт. на гект.	Лік досьл.
Супэрфасфат 3,60—1,80 .	+ 24,27	+ 34,5	76,16	3	+ 29,41	+26,8	109,74	2
Каліевая соль 3,0—1,50 . .	+ 32,73	+ 38,0	86,15	8	+ 33,47	+30,5	109,74	2
Супэрфасфат + + каліевая соль . . .	+ 48,08	+ 54,0	89,05	3	+ 80,11	+73,0	109,74	2
Сярчана-кіслы амоні . .	+ 32,81	+ 40,2	81,62	6	—	—	—	—
Сярчана-кіслы амоні + каліевая соль .	+ 63,66	+ 78,0	81,62	6	—	—	—	—
Сярчана-кіслы амоні + супэрфасфат. .	+ 56,42	+ 67,9	81,62	6	—	—	—	—
Сярчана-кіслы амоні + супэрфасфат + + каліевая соль	+103,82	+127,2	81,62	6	—	—	—	—
Гной 360 цэнтн.	+168,54	+208,3	76,16	3	—	—	—	—

Дабаўка ўраджаю бульбы на супесі больш усяго была па гнаі—208%. З штучных угнаеньняў, якія клаліся паасобку, самая вялікая дабаўка была па сярчана-кіслым амонію—42,2%, потым ідзе каліевая соль, дабаўка—38 % на супесі і 30,5 на суглінку і, урэшце, супэрфасфат—дабаўка 34% на супесі і 26,4% на суглінку.

Камбінацыя каліевай солі з сярчана-кіслым амоніям дае дабаўку большую, чым камбінацыя азоту з фосфарам або фосфару з каліем. Поўнае штучнае ўгнаеньне дае найбольшую дабаўку—127%.

ЖЫТА.

а) Уплыў штучных угнаеньняў на ўраджай жыта. Досьледы былі пастаўлены на дзьвюх глебах: на супесі 4 досьледы і на суглінку 3. Папярэднімі культурамі для зімовага

жыта ў 5-ці досьледах быў няўгноены чысты папар, а ў 2-х—папар, заняты віка-аўсянай мешанкай. Час сяўбы для асобных досьледаў цягнуўся ад 25 жніўня да 8 верасьня. Атрыманы наступныя лічбы (табліца № 4).

Табліца № 4.

Назва і колькасьць угнаеньня ў цэнт. на гектар	Дабаўка ўраджаю зімовага жыта							
	На супесі				На суглінку			
	Зерня ў цэнт. на гект.	Саломы	У процантах		Зерня ў цэнт. на гект.	Саломы	У процантах	
			Зерня	Саломы			Зерня	Саломы
Супэрфасфат 3,75—2,70 .	+3,25	+2,64	+45,7	+15,6	+2,69	+2,61	+36,9	+17,1
Каліевая соль 1,80 . . .	+0,71	+2,61	+10,0	+14,7	—	—	—	—
Супэрфасф.+ +чылійская салетра . .	+5,72	+1,45	+80,4	+86,0	+4,46	+14,83	+61,4	+97,0
Супэрфасф.+ +каліев. соль	+3,39	+5,50	+47,6	+26,6	+4,08	+11,41	+52,6	+74,6
Супэрфасф.+ + каліевая соль+чылійская салетра	+7,55	+13,03	+106,0	+77	+6,11	+14,56	+84.2	+95,2
Кантроль (безадносны ўраджай) .	7,12	16,92	—	—	7,26	15,29	—	—

Найбольшы ўраджай на абодвух глебавых адменьніх атрымліваецца калі палажыць поўнае мінэральнае ўгнаеньне (дабаўка ўраджаю на супесі 106,0% зерня і 77% саломы, на суглінку—84,2% зерня і 95,2% саломы). З угнаеньняў, якія клаліся паасобку, павялічэньне ўраджаю амаль што аднолькавае ад фосфару і азоту: першы дае дабаўку на супесі 45,7% зерня і 15,6% саломы, на суглінку 36,9% і 17,1% саломы, а другі разам з фосфарам павялічвае ўраджай на супесі 80,4% зерня і 86% саломы, на суглінку—61,4% зерня і 97% саломы. Каліевая соль ураджай павялічвае мала, хоць па фосфарна-азоцістаму фону і калій дае значную дабаўку. Для павялічэньня ўраджаю зімовага жыта трэба забясьпечыць у першую чаргу глебу фосфарам і азотам.

б) Параўнаньне дзеяньня фосфарытнай мукі на ўгноеным і няўгноеным фоне на ўраджай зімовага жыта.

Ёсьць два досьледы з фосфарытнай мукой, якую клалі па двух фонах—у адным досьледзе па ўгноеным фоне, а ў другім—бяз гною. Досьледы былі закладзены на супяшчанай глебе ў розных мясцох. Сеялі ў досьледзе з угноеным фонам—25/VIII, а ў другім—30/VIII і атрыманы наступныя вынікі (табліца № 5).

З лічбаў табліцы № 5 відаць значная розьніца ва ўмовах фасфарытнай мукі на ўгноеным фоне ў параўнаньні з няўгноеным. Дабаўка ўраджаю ад фасфарытнай мукі на ўгноеным фоне складае 32% зерня і 16% саломы, а на фоне няўгноеным толькі 4% зерня і 4% саломы. Такая самая розьніца ў дабаўках калі палажыць фасфарытнай мукі ў камбінацыі з азотам або каліем. Вынікі гэтых двух досьледаў вельмі рэльефна сьведчаць аб тым, што ўгнойваць глебу фасфарытнай мукой больш мэтазгодна, калі раней палажыць гною або якога-небудзь другога арганічнага ўгнаеньня, пасьля чаго дзейнічаньне фасфарытнай мукі амаль што будзе роўна дзейнічаньню супэрфасфату.

Табліца № 5.

Назва і колькасьць угнаеньня ў цэнт. на гектар	Дабаўка ўраджаю зімовага жыта							
	Папар, угноены 180 цэнт. гною на гектар				Папар няўгноены			
	Зерня цэнт. на гект.	Саломы цэнт. на гект.	У процантах		Зерня цэнт. на гект.	Саломы цэнт. на гект.	У процантах	
			Зерня	Саломы			Зерня	Саломы
Фасфарытнай мукі 4,80 .	+3,84	+4,37	+32	+16	+0,21	+0,49	+4	+4
Каліевая соль 1,80. . .	+0,90	+2,19	+7,5	+8	+0,47	+1,72	+9	+14
Фасфарытная мука+каліевая соль .	+4,56	+4,37	+38	+16	+1,32	+3,81	+25	+31
Фасфарытная мука + чылійская салетра . .	+5,88	+4,92	+49	+18	+1,32	+3,81	+25	+31
Фасфарытн. мука+каліевая соль+чылійская салетра	+7,08	+6,28	+59	+23	+3,68	+9,95	+70	+81
Кантроль (безадносны ўраджай) .	12,00	27,33	—	—	5,26	12,28	—	—

ЯЧМЕНЬ.

З ячменем было пастаўлена 3 досьледы на супяшчанай глебе і атрыманы наступныя лічбы (табліца № 6).

Табліца № 6.

Назва і колькасьць угнаеньняў у цэнт. на гектар	Дабаўка ўраджаю ячменю			
	Зерня цэнт. на гектар	Саломы цэнт. на гектар	У процантах	
			Зерня	Саломы
Супэрфасфат (3,00) . . .	+2,11	+1,99	+31,9	+14,1
Супэрфас.+каліевая соль (1,35).	+6,00	+10,53	+90,7	+74,5
Супэрфасфат + сярчана - кіслы амоні (2,00)	+11,38	+15,25	+172	+108
Супэрфасфат + сярчана - кіслы амоні+каліевая соль . .	+16,22	+28,38	+245	+201
Кантроль (безадносны ўраджай)	6,62	14,12	—	—

Найбольшая дабаўка ўраджаю атрымана па поўным мінэральным угнаеньні—245% і 201% саломы, пры гэтым надта вялікае павялічэньне ўраджаю дае азот. Дабаўка пры камбінацыі супэрфасфату з сярчана-кіслым амоніем даволі значная—172% зерня і 180% саломы, потым ідзе супэрфасфат з каліевай сольлю—дабаўка 90,7% зерня і 74,5% саломы і, нарэшце, супэрфасфат, які дае дабаўку 31,9% зерня і 14,1% саломы.

КАНЮШЫНА.

Уплыў паверхневага ўгнаеньня на ўраджай канюшыны 1 г.

Досьледаў з паверхневым угнаеньнем канюшыны праведзена 6.

З 6 досьледаў—4 былі пастаўлены на супяшчанай глебе, а 2 на суглінку. На супяшчанай глебе канюшына ва ўсіх досьледах падсявалася к аўсу, а на суглінку к зімоваму жыту. Вынікі наступныя:

Табліца № 7.

Назва і колькасьць угнаеньняў у цэнт. на гектар	Дабаўка ўраджаю канюшынавага сена					
	На супесі			На суглінку		
	Лік досьл.	Сена цэнт. на гектар	У проц.	Лік досьл.	Сена цэнт. на гектар	У проц.
Супэрфасфат (2,70) . .	4	+16,87	+68,6	2	+17,86	+108
Вапна (9,00) . . .	4	+3,96	+16	2	+5,41	+32,7
Каліевая соль (1,35)+супэрфасфат	4	+24,20	+98,4	2	+47,80	+289,0
Каліевая соль + супэрфасфат+вапна . . .	1	+24,49	+99,2	2	+52,27	+316,0
Попел (18,00) . . .	1	+8,19	+33 3	—	—	—
Кантроль (безадносны ўраджай) . . .	—	24,59	—	—	16,54	—

Фосфар і калі вельмі павялічваюць ураджай (дабаўка ўраджаю на супесі 98,4%, на суглінку 289% канюшынавага сена). Асабліва вялікая дабаўка ад калія-фосфатнага ўгна-



Мал. 3.

„Канюшына па павярховаму мінэральнаму угнаеньню".
Слева направа: 1) Без угнаеньня, 2) Калі, 3) Супэрфасфат, 4) Калі + + супэрфасфат.
Селянін-дасьледчык Новікаў І. М., паселак Рэвячына, Горацк. раёна.

еньня на суглінку. Вапна ў першы-ж год пасьля таго, як была паложана, рабіла дадатны ўплыў (дабаўка ўраджаю на супесі—16%, на суглінку 32%). Попел на супяшчанай глебе, паложаны ў адным досьледзе, павялічыў ураджай на 33,3%.

ЛЁН.

З лёнам па мінэральным угнаеньні былі два досьледы на супящчанай глебе. У адным досьледзе лён сеяўся пасьля 4-гадовай залежы, а ў другім пасьля папару. Вынікі наступныя:

Табліца № 8.

	Дабаўка ўраджаю лёну							
	Лён пасьля 4-гадовай залежы				Лён пасьля папару			
	Зерня цэнт. на гект.	Саломы цэнт. на гект.	У процант.		Зерня цэнт. на гект.	Саломы цэнт. на гект.	У процантах	
			Зерня	Саломы			Зерня	Саломы
Супэрфас. (1.90)	+3,23	+16,78	+62	+41	—	—	—	—
Каліев. соль (2,30)	+2,34	+15,96	+45	+39	+2,50	+7,30	+51	+19,9
Супэрфасфат + +каліевая соль	+4,32	+29,46	+83	+72	—	—	—	—
Сярчана - кіслы амоні (2,25)	—	—	—	—	+2,73	+29,69	+56,8	+77,7
Сярчана - кіслы амоні+каліевая соль	—	—	—	—	+2,03	+12,00	+42,2	+31,4
Супэрфасфат + сярчана-кіслы амоні+каліевая соль	—	—	—	—	+4,13	+18,46	+85.9	+48,3
Кантроль (безадносны ўраджай)	5,21	40,92	—	—	4,81	38,22	—	—

Лён пасьля 4-гадовай залежы вельмі рэльефна рэагаваў на калія-фосфатнае ўгнаеньне (дабаўка ўраджаю 83% зерня і 72% саломы), прычым на першым месцы быў супэрфасфат, на другім—каліевая соль. У другім досьледзе, пасьля папару, лён быў вельмі засьмечаны, але па поўным мінэральным угнаеньні атрымана значная дабаўка (83,9% зерня і 48,3% саломы). З паасобных угнаеньняў больш за ўсё павялічыў ураджай сярчана-кіслы амоні (дабаўка 56,8% зерня і 77,7% саломы), потым каліевая соль (дабаўка 52% зерня і 19,9% саломы).



Мал. 4.
Сортнасьць рабаваньне аўса. Слева направа: 1) Мясцовы, 2) Залаты дождж, 3) Шацілаўскі. Селяніна дасьледчыка Рыжкова А. М. і Немцаў І. П.

КОРАНЬПЛОДЫ.

З кораньплодамі было пастаўлена: 2 досьледы з кармовай морквай, 2 з кармовымі буракамі і 1 з турнэпсам. Кармовая морква і турнэпс выпрабоўваліся на супяшчанай глебе, а буракі—на сугліністай. Вынікі наступныя (табліца № 9).


Табліца № 9.

Назва ўгнаеньняў	Дабаўка ўраджаю кораньплодаў					
	Кармовая морква цэнт. на гект.	У процант.	Кармовыя буракі цэнт. на гект.	У процант.	Турнэпс цэнт. на гект.	У процант.
Супэрфасфат	+144,05	+53,3	+41,51	+12,1	+48,65	+9,0
Каліевая соль	+175,68	+65	+58,66	+17,1	+194,59	+36
Супэрфасфат + каліевая соль	+370,28	+137	+135,16	+39,4	+291,89	+54
Кантроль (бязадносны ўраджай)	270,28	—	344,05	—	540,55	—

Усе тры віды кораньплодаў добра рэагавалі на каліяфосфатнае ўгнаеньне (дабаўка ўраджаю для кармовай морквы 137%, буракоў 39,4% і турнэпсу 54%, прычым ад калія дабаўка ўраджаю была большая, чым ад фосфару.

Сортаспрабаваньне.

Па сортаспрабаваньні ў сялян-дасьледчыкаў Турскай Станцыяй атрыманы вынікі падліку 23 досьледаў. У Бабруйскай акрузе праведзена 19 досьледаў, з іх 10 у Рагачоўскім раёне, 1—у Жлобінскім, 2—у Сьвіслацкім і 4—у Бабруйскім раёне. У Магілеўскай акрузе праведзена 4 досьледы: 1—у Прапойскім раёне і 3—у Журавіцкім. У Гомельскай акрузе праведзена 3 досьледы Засьпенскім дасьледчым полем.



Мал. 5.

„Уплыў густаты пасеву на ўраджай ільну".

Справа налева: 1) 6 пуд. 2) 9 „ 3) 13 „ } з вучотнай плошчы 100 кв. мэтраў.

Селяніна дасьледчыка Ефімава К. пас. Азеровічы, Горац. раён.

Мэтодыка досьледаў наступная: дзялянка 250 кв. мэтраў без паўторнасьці, падлік—абмалотам усяе дзялянкі; у досьледах, праведзеных Станцыяй, рабіліся адхіленьні ад гэтай мэтодыкі: давалася 2-разовая альбо нават 6-разовая паўторнасьць; падлік рабілі амаль ва ўсіх выпадках па пробным снапу.

АВЁС.

Праведзена ўсяго досьледаў з аўсом 11, з іх 2 досьледы праведзены Станцыяй, рэшта-ж сялянамі-дасьледчыкамі.

Выпрабоўваліся сарты: „Пабеда“, „Геральцкі“, „Маскоўскі“, „Залаты Дождж“, „Пяткускі“, „Пфлюч“ і „Шацілаўскі“. Даныя паказаны ў табліцы № 10.

Станоўчых вывадаў зрабіць немагчыма з-за нязначнай колькасьці досьледаў. Па некаторых досьледах на супяшчанай глебе найбольшы ўраджай даў „Пяткускі“, а на суглінку, больш прадукцыйным быў „Залаты Дождж“.

Наступнымі па ўраджайнасьці сартамі ідуць „Геральцкі“ і „Пфлюг“, але ў некаторых выпадках яны далі ўраджай ніжэйшы ад мясцовага аўсу.

Табліца № 10.

Назва сартоў	Ураджай на гектар у цэнтнэрах		Глеба
	Зерня	Саломы	
„Маскоўскі“	8,64	13, 12	Супяшчаная
„Геральцкі“	6,56	8,48	„
Мясцовы	4,48	6,56	„
„Пабеда“	17,60	27,20	„
Мясцовы	13,60	20,40	„
„Залаты Дождж“ . . .	9,07	10,52	„
„Геральцкі“	10,40	11,02	„
Мясцовы	9,13	9,68	„
„Геральцкі“	19,68	13,16	„
Мясцовы	13,16	11,84	„
„Пяткускі“	19,80	24,16	„
Мясцовы	15,44	17,96	„
„Пфлюг“	7,93	8,43	Суглінак
„Пяткускі“	13,78	13,67	„
Мясцовы	8,29	10,69	„

Назва сартоў	Ураджай на гектар у цэнтнэрах		Глеба
	Зерня	Саломы	
„Шацілаўскі“	9,00	19,95	Супесь
„Залаты Дождж“ . . .	10,80	20,88	„
Мясцовы	8,46	16,02	„
„Пфлюг“	10,16	14,74	Суглінак
„Залаты дождж“ . . .	9,17	12,29	„
Мясцовы	8,19	11,47	„
„Пяткускі“	6,40	5,72	Супесь
„Залаты Дождж“ . . .	4,56	5,64	„
Мясцовы	3,84	5,61	„
„Залаты Дождж“ . . .	20,83	16.38	„
„Пфлюг“	15,56	13,10	„
Мясцовы	18,35	15,73	„
„Пабеда“	32,93	27,07	Лёгкі суглінак
Мясцовы	31,33	33,33	„
„Гералецкі“	14,06	15,78	Суглінак
„Пяткускі“	14,38	16,25	„
„Пфлюг“	15,55	17,03	„
„Залаты Дождж“ . . .	16,03	18,91	„
Мясцовы	14,22	16,56	„
„Залаты Дождж“ . . .	15,99	22,03	„
„Пяткускі“	15,18	19,70	„
„Пфлюг“	13,69	16,65	„
„Гералецкі“	17,45	21,50	„
Мясцовы	9,25	14,82	„

ЯЧМЕНЬ.

Выпрабоўваліся сарты: „Залаты“, „Брыо“, „Лебядзіная Шыя“, „Прынцэса“. Праведзены 4 досьледы і ўраджайныя даныя паказаны ў табліцы № 11.

Табліца № 11.

Назва сартоў	Ураджай на гектар у цэнтнэрах		Глеба
	Зерня	Саломы	
„Залаты“	14,08	16,33	Супесь
„Брыо“	12,60	13,48	„
Мясцовы	9,00	12,69	„
„Лебядзіная Шыя“ . .	3,36	6,56	„
Мясцовы	4,48	8,64	„
„Залаты“	20,16	—	Супяшчаная
Мясцовы	16,80	—	„
„Прынцэса“	10,42	6,75	Суглінак
„Лебядзіная Шыя“ . .	7,29	7,95	„
„Залаты“	13,96	12,92	„

Як відаць з табліцы, самым ураджайным сартом быў двурадны ячмень „Залаты“, ва ўсіх 3-х досьледах ён займае першае месца.

ЖЫТА.

У 3-х досьледах па сортаспрабаваньні жыта браліся 2 гатункі: „Пяткускае“ і „Венбенскае“. У 2-х досьледах. „Пяткускае“ жыта дало большы ўраджай за мясцовае і ў адным досьледзе мясцовае перавысіла яго.

Табліца № 12.

Назва сартоў	Ураджай на гектар у цэнтнэрах		Глеба
	Зерня	Саломы	
„Пяткускае“	7,92	28,80	Пяшчаная
Мясцовае	11,01	37,47	„
„Пяткускае“	12,65	21,00	„
Мясцовае	12,27	20,00	„
„Венбенскае“	7,61	—	„
„Пяткускае“	11,57	—	„
Мясцовае	6,47	—	„

Рубанаў
Глазоўская.

ВЫНІКІ РАБОТЫ ІНСТЫТУТУ СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ ПАЛЕСКАЙ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ ДАСЬЛЕДЧАЙ СТАНЦЫІ.

Распачатая з вясны 1927 году Палескай С.-Г. Дасьледчай Станцыяй работа з сялянамі-дасьледчыкамі і да гэтага часу праводзіцца з вялікай напружанасьцю, з прычыны, па-першае, невыстарчальнасьці патрэбных на гэту справу сродкаў, па-другое, адсутнасьці на Станцыі спэцыяльнага пэрсаналу, малога знаёмства сялянскага насельніцтва з значэньнем дасьледчай справы ў сельскай гаспадарцы.

Да арганізацыі дасьледчай станцыі на Беларускім Палесьсі грамадзкай аграномаіяй з 1922 году праводзілася закладка так званых дасьледча-паказальных вучасткаў з засевам лубіну, сэрадэлі і, у нязначнай колькасьці, з мінэральнымі ўгнаеньнямі. Работа гэта да 1925—26 гадоў мела выпадковы характар, закладзеныя вучасткі часта давалі адмоўныя вынікі.

Пачатак больш сыстэматычнай дасьледчай работы сярод сялян быў паложаны канфэрэнцыяй сялян-дасьледчыкаў з удзелам аграномаў, якая адбылася пры дасьледчай станцыі вясною 1928 году і на якой быў ухвалены парадак правядзеньня досьледаў па праграме ды інструкцыі, выданай Бюро Сялян-Дасьледчыкаў пры БНДІ.

Лік сялян-дасьледчыкаў да пачатку 1929 году на Мазыршчыне ўзрос да 139 чалавек, і пры належных сродках ды кіраўнікох гэта работа можа вельмі шырака разгарнуцца.

На другой канфэрэнцыі сялян-дасьледчыкаў, у сакавіку 1929 году, выразна пастаўлена і падкрэсьлена канечная патрэба сялянам-дасьледчыкам рашуча ўзяцца за ажыцьцяўленьне тых мерапрыемстваў, якія высунуты ўрадам для ўздыму ўраджайнасьці і павялічэньня прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі. Трэба вывучыць спосабы, якімі-б найхутчэй

можна было выкарыстаць неабсяжныя прасторы кідомай зямлі, а яе ў Мазыршчыне налічваецца да 40%; трэба выявіць, якія культуры і якія сарты пашыраць у першую чаргу.

Пэўная работа Палескай Дасьледчай Станцыяй і сялянамі-дасьледчыкамі ў гэтым кірунку ўжо зроблена, і тыя падагульненьні агранома Дзіковіча, на падставе масавага сялянскага досьледу, даюць нам магчымасьць хоць прыблізна па асобных пытаньнях арыентыроўча меркаваць аб мэтазгоднасьці ды эфэктыўнасьці таго ці іншага мерапрыемства.

Загадчык Палескай С.-Г. Дасьледчай
Станцыі *С. Г. Трызна.*

м. Скрыгалава,
17-IV-1929 год.

Вынікі масавага сялянскага досьледу на Мазыршчыне.

Мазыршчына, дый наогул усё Беларускае Палесьсе, у разгортваньні навукова-дасьледчай работы ў сельскай гаспадарцы застаецца далёка ззаду параўнальна з іншымі акругамі Беларусі.

Надзвычайна шырака разгарнулася с.-г. дасьледчая справа на Беларусі пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі, калі хутка адна за аднэй пачалі вырастаць дасьледчыя ўстановы.

Аднак, значна менш у гэтым кірунку зроблена на Мазыршчыне. Як нам вядома, да рэвалюцыі тут ня было амаль ніякай дасьледчай с.-г. работы. У пасьлярэвалюцыйны час яна разгортваецца са значным спазьненьнем параўнальна з іншымі с.-г. раёнамі Беларусі.

Палеская Дасьледчая Станцыя, арганізавалася ў 1926 г. З пачатку свайго разьвіцьця яна была пастаўлена ў такія ўмовы, што і цяпер яшчэ перажывае арганізацыйны пэрыяд.

Пры такіх абставінах падагульненьне масавага сялянскага досьледу, хаця-б праведзенага ў сваёй большасьці і ня зусім дакладна, набывае асаблівую цікавасьць.

Лік падагуленых досьледаў, іх разьмеркаваньне па гадох і культурах падаецца ў табліцы № 1.

Табліца № 1.

№№ па чар.	Назва тэмы	Лік досьледаў па гадох					Увагі
		1925	1926	1927	1928	Разам	
1	Розныя ўгнаеньні пад жыта	—	1	5	2	8	Фактычна ў большасьці выпадкаў тут мы маем справу з паказальнымі або так званымі дасьледча - паказальнымі вучасткамі, але для прастаты і кароткасьці ўмоўна будзем усюды ўжываць тэрмін— дасьледчыя вучасткі або проста досьледы.
2	Уплыў розных папараў на ўраджай жыта . . .	—	2	—	1	3	
3	Баранаваньне жыта ў весну	—	—	3	—	3	
4	Розныя тэрм. сяўбы жыта	—	—	1	1	2	
5	Уплыў пасеву сартыравальным зернем на ўраджай жыта . . .	—	—	—	4	4	
6	Сортаспрабаваньне жыта.	—	—	—	1	1	
7	Угнаеньні пад бульбу .	—	5	13	5	23	
8	Сортаспрабаван. бульбы.	—	—	—	1	1	
9	Розныя ўгнаеньні пад авёс	—	—	3	3	6	
10	Сортаспрабаваньне аўсоў	—	—	3	1	4	
11	Розныя ўгнаеньні пад ячмень	—	4	2	—	6	
12	Сортаспрабаваньне ячменю	—	—	1	—	1	
13	Угнаеньні пад лён. . .	—	—	2	—	2	
14	„ „ грэчку .	—	—	—	1	1	
15	„ „ проса . .	—	—	—	4	4	
16	„ „ гарох . .	—	—	—	2	2	
17	„ „ канюшыну	—	—	—	4	4	
18	Ураджай турнэпсу на ўгнаеньні і без ўгнаеньня	—	1	23	—	24	
19	Ураджай буракоў на ўгнаеньні і без угнаеньня .	—	1	1	7	19	
20	Ураджай морквы на ўгнаеньні і без угнаеньня .	—	—	8	—	8	
21	Таксама бручкі . . .	—	—	4	—	4	
22	Таксама сэрадэлі . . .	3	5	15	—	23	
23	Таксама лубіну (зялёнай масы і насеньня) . .	3	16	36	5	60	
	Усіх разам .	6	35	130	42	213	

ЖЫТА.

Для падагульненьня выкарыстаны:

З рознымі ўгнаеньнямі	8	дасьледча-паказ.	вуч.
Параўнаньне розных папараў . .	3	„	„ „
Баранаваньне руні вясной . . .	3	„	„ „
Розныя тэрміны сяўбы	2	„	„ „
Параўнаньне засеву сартаваным і несартаваным зернем . . .	4	„	„ „
Сортаспрабаваньне	1	„	„ „

Такім чынам, усяго падагулена 21 досьлед, гэтыя досьледы былі праведзены на працягу 3-х гадоў (1926—1928 г.)

Ураджай няўгноенага кантролю ў сярэднім з 7-мі паказаньняў—5,4 ц./гект. (36 п./дз.) зерня і 10,3 ц./гект. (68 п./дз.) саломы.

Дабаўкі ўраджаю ад розных угнаеньняў ў процантах адносна няўгноеных паказаны ў табліцы № 2.

Табліца № 2.

Угнаеньні	Дабаўка ў процантах			Увагі
	Зерня	Саломы	Лік паказаньн.	
½ нормы гною . . .	47	51	4	Супэрфасфату і тамасоўкі бралася на гект 270 кг., каліевай солі 135 кг., чылійскай салетры 90 і 180 кг.
Лубін	97	93	2	
Супэрфасфат . . .	18	19	1	
Тамасоўка	16	16	1	
Каліевая соль	11	21	2	
Чылійская салетра. . .	125	137	1	За норму гною ўсюды лічылася 360 цнт. на гект. (2400 п. на дз.)
Каліевая соль+супэрфасф	44	43	1	
Каліевая соль+тамасоўка.	40	40	1	

Папары занятыя (бульбяны, віка аўсяны, сэрадэлевы) па ўраджайнасьці іх жыта ня горш ад папару сялянскага талочнага і раньняга чыстага. Папар раньні (майскі) чысты на пералогах ня мае пераваг перад сялянскімі талочнымі (1 паказ.) і ўраджай на ім крыху ніжэйшы ў параўнаньні з сялянскім талочным і шмат ніжэйшы (на 70 проц.) у параўнаньні з папарам лубінавым.

Баранаваньне жыта вясной на лёгкіх глебах не дае, амаль, ніякага эфэкту, і ў некаторых выпадках нават зьніжае ўраджай.

Досьледы з рознымі тэрмінамі сяўбы не даюць згодных паказаньняў. На падставе іх можна заўважыць, што ў асобных выпадках позная сяўба (3 кастрычніка) бывае лепшай за ранейшую. Гэта паказаньне супадае з вынікамі досьледу

Палескай Станцыі адносна часу сяўбы жыта, з якіх (вынікі 1-га году) выходзіць, што сяўба ў пачатку кастрычніка дала найвышэйшы ўраджай (раньнім засевам вельмі шкодзяць грыбныя хваробы). Супадае гэта і з масавай сялянскай практыкай, бо сяляне ў большасьці выпадкаў, ня вельмі сьпяшаюцца з сяўбой азімых на Мазыршчыне.

Сортаваньне і ачыстка насеньня, згодна з 5-ма паказаньнямі, павышае ўраджай на 33%, эфэкт занадта высокі, і, магчыма, тлумачыцца недакладнасьцю падліку.

Сортаспрабаваньне 5 сартоў жыта (Прабштэйнскага, Пяткускага Харкаўскай Станцыі № 950, Пяткускага Гомельскай Дзяржнасенкультуры, Нямышлянскага і мясцовага) ня было як належыць ажыцьцёўлена да канца; тым ня менш, выявілася, што найлепшым сортам для мясцовых умоў зьяўляецца сорт жыта Пяткускі Гомельскай Дзяржнасенкультуры, што адпавядае і даным Станцыі.

БУЛЬБА.

Усяго падагулена 23 досьледы з угнаеньнямі пад бульбу, праведзеныя ў працягу 3-х гадоў (1926—1928 г.г.).

У сярэднім з 21 паказаньняў няўгноены кантроль дае 91,1 цэнтнэраў з гектара клубеняў (607 пуд. з дзес.), пры найбольшым ураджаі ў 195 ц. і найменшым 52 ц.

Ад розных угнаеньняў атрыманы наступныя дабаўкі.

Табліца № 3.

Угнаеньне	Дабаўкі ў проц.	Агульны лік паказ.	Далі адм. вын.	Не зрабілі ўплыву	Увагі
Гной поўнай нормы	73	7	—	—	Каліевая соль—90—270 кг. на гект.
„ палова нормы	32	3	—	—	
Супэрфасфат	12	10	2	2	
Тамасоўка	9	4	—	—	
Каліевая соль	26	18	1	—	Супэрфасфат і тамасоўка—180 450 кг. на гект.
Попел	27	7	—	—	
Чылійская салетра	25	2	—	—	
Каліевая соль + супэрфасфат	29	7	1	—	
Каліевая соль + тамасоўка	37	5	—	—	
Салетра + каліевая соль	66	2	—	—	
Салетра + супэрфасфат	63	2	—	—	Салетра—да 450 кг. на гект.
Салетра + каліевая соль + супэрфасфат	118	2	—	—	
Торф пасьцілачны	205	1	—	—	Попел—375—1800 кг. на гект.
1/2 торфу + 1/2 гною (польнае кампаставаньне)	225	1	—	—	

З сортаспрабаваньнем бульбы быў у 1928 г. праведзены 1 досьлед, з якога выявілася, што Вольтман даў меншы ўраджай на 4% за мясцовы. Адкуль быў узяты Вольтман і з якім мясцовым параўноўваўся, пра гэта даных няма. Дасьледчыкам Навіцкім зазначана толькі, што па сваёй чыстаце Вольтманавы клубяні былі лепшымі, і ён мае на ўвазе працягнуць досьлед у 1929 годзе. Мясцовы сорт называецца „ружовым“ і ў гаспадарцы разводзіцца з 1917 г.

АВЕС.

З угнаеньнямі пад авёс усяго падагулена 6 досьледаў 1927 і 1928 гадоў.

Сярэдні ўраджай няўгноенага кантролю 6,8 ц. на гект. (45 п./дз.) зерня і 9,9 ц. (61 п./дз.) саломы.

Ад розных угнаеньняў атрыманы наступныя дабаўкі:

Табліца № 4.

Угнаеньні	Дабаўка ў проц.	Лік паказ.	Увага
Гной	65	4	Нормы ўгнаеньняў:
Супэрфасфат	20	5	Каліевая соль ад 140 да 192 кг. на гект.
Тамасоўка	12	2	Супэрфасфат 225 да 360 кг. на гект.
Каліевая соль	20	2	
Чылійская салетра	17	1	
Салетра + каліевая соль	30	1	Тамасоўка—ад 300 да 384 кг. на гект.
Салетра + супэрфасфат	42	1	Салетра 300 кг. на гек.
Салетра + супэрфасфат + каліевая соль	55	2	У большасьці выпадкаў гісторыя палетку, глебы ды інш. не паказаны,—ёсьць толькі вынікі падліку.
Торф	43	1	

З сортаспрабаваньнем аўсоў ёсьць вынікі 4-х досьледаў. Ува ўсіх досьледах сартавыя аўсы далі вышэйшы ўраджай за мясцовыя. Дабаўкі ўраджаю наступныя:

„Пабеда“ 24% зерня, 30% саломы; сярэд. з 3-х паказан.
„Пфлюг“ 31% „ 4% „ „ 1 „
„Пяткускі“ 37% „ 4% „ „ 1 „

Найвышэйшая дабаўка сорту „Пяткускі“ пацьвярджаецца і данымі Палескай Станцыі, згодна з якімі—авёс Пяткускі стаіць на 1 месцы па ўраджайнасьці сярод 14 іншых сартоў.

ЯЧМЕНЬ.

З мінэральнымі ўгнаеньнямі пад ячмень падагулены вынікі 6-ці досьледаў.

Ураджай няўгноенага—кантролю—6,9 ц. з гект. зерня (46 пуд. з дзес.) і 10,8 ц. (72 пуды) саломы.

Тамасоўка па 4-х паказаньнях дае дабаўку 26%

Супэрфасфат па 2-х „ „ „ 17%

Згодна з вынікамі сортаспрабаваньня (1 досьлед) ячмень „Залаты" даў дабаўкі 5% зерня ў параўнаньні з мясцовым.

ЛЁН.

З лёнам распрацаваны вынікі 2-х досьледаў. Ураджай няўгноенага кантролю—6,1 ц. на гект. (40 пуд на дзес.) семя і 17,2 ц. (115 пуд.) трэсты (1 паказ.). Гной 1/2 нормы дае дабаўкі 39% насеньня і 20% трэсты, супэрфасфат 270 кг. на гект.—19% насеньня і 13% трэсты, попел 750 кг. на гект.—21% насеньня і 19% трэсты, каліевая соль 120 кг. і попел 750 кг. на гект., разам уздымаюць ураджай на 43% насеньня і 32% трэсты. (Усе лічбы паданы на падставе 1-га паказаньня).

ГРЭЧКА.

З грэчкай у 1928 годзе ў калгасе „Міна", Калінкавіцкага раёну, праведзены 1 досьлед. Вынікі яго наступныя:

Табліца № 5.

Угнаеньні	Ураджай з гектара				Увага
	Цэнтнэраў		Процантаў		
	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	
Кантрольная (0) . . .	5,6	10,2	100	100	Глеба супяшчаная.
Чылійская салетра. 300 кг.	7,5	12,2	134	119	Грэчка пасьля жыта.
Супэрфасфат 225 кг.	6,7	11,1	119	109	
Каліевая соль 150 кг. .	7,9	12,9	141	126	
Салетра + супэрфасфат.	8,2	13,3	147	130	
Салетра + каліевая соль	8,6	13,7	153	134	
Супэрфасфат + каліевая соль	8,4	13,6	150	133	
Салетра + супэрфасфат + + каліевая соль . . .	9,2	15,0	164	147	
Гной	8,3	13,4	149	131	

ПРОСА.

З мінэральным угнаеньнем пад проса зроблены ў 1928 г. на пяшчаных глебах 4 досьледы ў Юравіцкім раёне пад непасрэдным кіраўніцтвам агранома Гутарава, згодна з інструкцыяй Бюро Сялян-Дасьледчыкаў.

Вынікі гэтых досьледаў наступныя:

Табліца № 6.

Месца досьледу	Угнаеньні	Ураджай з гектара				Увага
		Цэнтнэраў		У процантах		
		Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	
1. в. Крышычы, калгас „Пролетары"	Гной (норма) .	5,0	6,7	357	335	
	Супэрфасфат + салетра + кал. соль. . .	11,3	14,7	807	735	
	Салетра + супэрфасфат. .	7,8	9,2	557	460	Усе досьледы зроблены з 3-хразовай паўторнасьцю.
	Салетра + кал. соль . . .	8,5	9,9	607	495	Гісторыя дасьлед. вуч. наступная:
	Супэрфасфат + кал. соль . .	1,8	3,0	128	150	Досьлед. № 1—пералог 6 год.
	Каліевая соль 150 кг . . .	2,3	3,6	164	180	Досьлед. № 2—пералог 10 год.
	Супэрфасфат 225 кг. . .	1,9	2,5	136	125	Досьлед. № 4—пералог 2 г.
	Салетра 300 кг.	4,9	5,4	350	370	Пералог № 3 пасьля жыта.
	О	1,4	2,0	100	100	
2. в. Тульгавічы, калгас „Чырвонамайск"	Гной (норма) .	1,7	3,3	425	550	Усе ўгнаеньні клаліся непасрэдна перад сяўбой, у тым ліку і гной.
	Салетра. + супэрфасфат. .	1,6	3,2	400	533	Чылійская салетра клалася два разы: перад сяўбой і па ўсходах.
	Супэрфасфат 225 кг. . .	0,6	0,5	150	83	
	Салетра 300 кг.	1,5	2,1	375	350	Проц. хістаньняў паказаць нельга, бо не дасланы падзяляначныя даныя.
	О	00,4	0,6	100	100	

Месца досьледу	Угнаеньні	Ураджай з гектара				Увага
		Цэнтнэраў		У процантах		
		Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	
3. Касьцючэнка, Р. М., в. Бярозаўка.	Гной (норма) .	10,0	10,9	294	294	
	Салетра + супэрфасф. . .	10,1	11,5	297	311	
	Супэрфасфат 225 кг . . .	7,5	9,8	220	264	
	Салетра 300 кг.	11,1	11,7	326	316	
	О	3,4	3,7	100	100	
4. Настаўнік Піпчэнка, в. Крышычы.	Гной (норма) .	1,4	2,9	117	139	
	Салетра + супэрфасф. . .	1,4	3,0	117	143	
	Супэрфасфат 225 кг. . .	1,2	2,3	100	109	
	Салетра 300 кг.	1,4	2,9	116	139	
	О	1,2	2,1	100	100	

Сярэднія даныя па 4-х досьледах паказаны ў таб. № 7.

Табліца № 7

Угнаеньні	Ураджай з гектара			
	Цэнтнэраў		У процантах	
	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы
Гной 360 ц. на гектар .	4,5	5,9	281	281
Чылійская салетра 3 ц.+ +супэрфасф. 2,25 ц. на гектар	5,2	6,7	325	319
Супэрфасфат 2,25 ц. на гектар	2,8	3,7	175	176
Чылійская салетра 3,0 ц. на гектар	4,7	5,5	293	262
Без угнаеньня	1,6	2,1	100	100

Дадзеныя досьледаў паказваюць, што мінэральныя ўгнаеньні даюць на ўраджаі проса значную дабаўку. Вельмі выразна выяўляецца азотны мінімум. З табліц бачым, што чылійская салетра дае дабаўку амаль ва ўсіх досьледах, як і гной, а ў камбінацыі з іншымі ўгнаеньнямі нават перавышае эфэкт ад гною. Апошняе можна тлумачыць тым, што гной, паложаны перад самай сяўбой, ня даў поўнага эфэкту як салетра, паложаная ў выстарчальнай колькасьці, і да таго-ж у 2 разы, дала поўны эфэкт.

Супэрфасфат, згодна з данымі большасьці досьледаў, не дае вялікага эфекту, і, па першаму досьледу, уступае калі-евай солі. Высокія дабаўкі ад супэрфасфату атрыманы ў досьледзе № 3, дзе мы мелі справу з больш зьвязанай глебай і лепшым яе заворваньнем, што відаць, між іншым, і з ўраджаю няўгноенага кантролю, на якім атрымаўся ўраджай амаль у тры разы вышэйшы ў параўнаньні з кантролямі іншых досьледаў.

ГАРОХ.

У Юравіцкім раёне ў 1928 годзе зроблена 2 досьледы з угнаеньнямі пад гарох. Мэтодыка пастаноўкі досьледаў і нормы ўгнаеньняў такія самыя, як і ў досьледах з просам.

Вынікі досьледаў падаюцца ў табліцы № 8.

Табліца № 8.

Месца досьледаў	Угнаеньні	Ураджай з гектара				Увага
		Цэнтнэраў		У процант.		
		Зерня	Салому	Зерня	Салому	
Касьцючэнка, Р. М., в. Бярозаўка	Гной	16,1	21,6	644	235	Глеба сугліністая. Гісторыя вуч.: 27 г.—папар; 26 г.—жыта; 25 г.—грэчка; 24 г.—жыта (угнаеньня клалася).
	Супэрфасф. + салетра . .	10,2	18,8	408	204	
	Супэрфасфат 225 кг. . .	4,7	9,8	188	106	
	Салетра 300 кг.	8,6	14,6	344	159	
	О	2,5	9,2	100	100	
Наст. Піпчэнка, Крышыцкай школы.	Гной	13,4	70,5	268	352	Глеба дробна-зярністая, пяшчаная 2-хгадовая аблога.
	Супэрфасф. + салетра . .	9,1	41,7	182	208	
	Супэрфасфат 225 кг. . .	8,7	22,7	174	113	
	Салетра 300 кг.	8,5	23,0	170	115	
	О	5,0	20,0	100	100	

У сярэднім з 2-х досьледаў:

Табліца № 9.

Угнаеньня	Ураджай з гектара				Увага
	Цэнтнэраў		У процантах		
	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	
Гной 36 тон	14,7	46,0	397	315	
Чылійская салетра + супэрфасфат 2,25 ц. . .	9,6	30,2	259	207	
Супэрфасфат 2,25 ц. . .	6,7	16,2	181	111	
Чылійская салетра 3,0 ц.	8,5	18,8	229	129	
Без угнаеньня	3,7	14,6	100	100	

КАНЮШЫНА.

З паверхневым угнаеньнем канюшыны маем даныя 4-х досьледаў, зробленых у 1928 годзе. Вынікі іх наступныя:

Табліца № 10.

Месца досьледу	Угнаеньні	Ураджай сена з гектара		Увага
		Цэнтнэр.	У проц.	
Кібец, в. Крэшнае, Тураўскага раёну.	Каліевая соль 2 ц.	50	151	Глеба—лёгкі суглінак на марэне.
	Супэрфасфат 4 цэнт. . . .	50	151	Папярэднікі—ярына (27 г.), жыта, бульба.
	Баранаваньне без угнаеньня . . .	40	121	
	Без баранаваньня і без угнаеньня. .	33	100	
Ляшкевіч Васіль. Тамсама.	Вапна 10 ц. . .	60	150	Як і летась
	Супэрфасфат 4.	50	125	
	Баранаваньне без ўгнаеньня . . .	43	107	
	Кантроль О . .	40	100	

Месца досьледу	Угнаеньні	Ураджай сена з гектара		Увага
		Цэнтнэр.	У проц.	
Калгас „Чырвоны Баец", Пятрыкоўскага раёну.	Каліевая соль 2 ц.	49	126	Лёгкі суглінак.
	Баранаваньне без угнаеньня . . .	43	113	
	0.	38	100	
Калгас „Зорка", Пятрыкоўскі раён.	Каліевая соль 2 ц.	41	128	Супесь на пяску.
	Баранаваньне без угнаеньня . . .	35	109	
	0.	32	100	

Сярэдняе:

Табліца № 11.

Угнаеньні	Ураджай сена на гектар		Лік паказаньняў.	Сярэдні ўраджай кантр. (0).
	Цэнтнэр.	У проц.		
Каліевая соль 2 ц.	47	138	3	34
Супэрфасфат 4 ц.	50	139	2	36
Вапна 10 ц.	60	150	1	40
Баранаваньне без угнаеньня .	40	111	4	36

КОРАНЬПЛОДЫ.

Турнэпс. Сярэдні ўраджай турнэпсу з 35 паказаньняў—234 цэнтнэраў на гект. (1.560 пуд. на дзес.).

У большасьці выпадкаў турнэпс сеялі па гнаі на прысядзібнай зямлі і ў некаторых выпадках—на гародзе.

Буракі. Ураджай кармовых буракоў па гнаі ў сярэднім з 15 паказаньняў—328 цэнт. на гектар (2.180 пуд. на дзес.). Няўгноены кантроль паводле 5-ці паказаньняў, даў 97 ц. на гектар (650 пуд. на дзес.).

Морква. Ураджай карэньня кармовай морквы па гнаі ў сярэднім з 15 паказаньняў—252 падв. цэнтнер. на гектар (680 пуд. на дз.).

Бручка. У сярэднім з 7-мі паказаньняў ураджай бручкі з гектара 210 падв. ц. (1400 пуд. на дзес.).

Параўнаньне ўраджайнасьці розных відаў кораньплодаў і бульбы.

На гэтую тэму праведзена ў 1927 годзе 9 досьледаў і ў 1928 г.—5 досьледаў. Для параўнаньня між сабой увесь ураджай кораньплодаў і бульбы пераводзіўся на кармовыя адзінкі, прычым на адну кармовую адзінку лічылася 2 кг. бульбы, 3,5 кг. буракоў, 3 кг. морквы, 4,0 кг. турнэпсу і бручкі.

Ва ўсіх досьледах сеялі турнэпс, таму за аснову для параўнаньня ўзяты ўраджай у кармовых адзінках турнэпсу, які лічыўся за 100.

У выніку такога параўнаньня мы маем, што кармовыя буракі даюць кармовых адзінак з гектару на 61 проц. больш за турнэпс (сярэдняе з 5 паказаньняў).

Кармовая морква дае кармовых адзінак з гект. 27 проц. б. за турнэпс (сярэд. 6 пак.), бульба дае кармовых адзінак з гект. 9 проц. б. за турнэпс (сярэд. 9 пак.), прычым ва ўсіх досьледах з буракамі яны перавышаюць ураджай турнэпсу, морква—у 2-х з 6-ці паказаньняў дае ніжэйшы ўраджай за турнэпс (—7%) і бульба дае менш кармовых адзінак за турнэпс у 2-х з 9 паказаньняў.

Што да бручкі, то яе ўраджай у 3-х выпадках амаль адналькавы з ураджаем турнэпсу і ў 1-м выпадку перавышае яго на 10 проц.

СЭРАДЭЛЯ.

Усяго падсумаваны досьледы па 23 дасьледча-паказальных вучастках; з сэрадэляй гэтыя досьледы зроблены за 1925—1928 г.

У чыстым засеве сэрадэля дае ўраджаю 24 ц. на гект. (160 пуд. з дзес.) сена, у сярэднім з 15 паказаньняў.

Падсеўная сэрадэля (галоўным чынам падсеў у жыта)—18 ц. з гект. (120 пуд. з дзес.), у сярэднім з 16 паказаньняў.

Лепшы ўраджай атрымліваецца пры падсеве ў пшаніцу і горшы пры падсеве ў авёс. Ураджай зерня аўса ад падсеву сэрадэлі, паводле 7-мі паказаньняў, зьніжаецца з 7,9 ц. (53 п.) да 6,8 ц. (45 пуд.).

ЛУБІН.

Узяты досьледы 60 вучасткаў, праведзеныя на працягу 4-х год (1925—1928 г.).

Асноўныя вынікі па гэтых вучастках можна характарызаваць наступнымі лічбамі.

У сярэднім з 50 паказаньняў лубін без угнаеньня дае 216 цэнт. з гектара (1.440 пуд. з дзес.) зялёнай масы, пры хістаньнях ураджаю ад 25 ц. (168 п.) да 600 ц. (4.000 п.).

Насеньня, згодна з 7-мі паказаньнямі, атрымліваецца 14,9 ц. (99 пуд.). Гной, ад ¼ да ½ нормы, павышае ўраджай зялёнай масы, у сярэднім, з 21 паказаньня, на 64 проц., фосфар (тамасоўка і супэрфасфат) у комбінацыі з каліевай сольлю—на 46 проц. (2 паказаньні), каліевая соль—20 проц. (2 паказаньні).

Падсеўны лубін (2 досьледы) даў масу 95 ц. (630 п.), пажніўны пасьля жыта—93 ц. (2 паказаньні).

Каліевая соль павышае ўраджай насеньня лубіну на 2-х досьледах на 44 проц., гной—на 80 проц. (2 досьледы).

Заражэньне глебы (2 досьледы) павышае колькасьць зялёнай масы на 25 проц. Заворваньне насеньня плугам і бараной (3 паказаньні) дае аднолькавыя вынікі.

З агульнага ліку вышэйадзначаных досьледаў тры вучасткі былі закладзены на кідомых землях і далі без угнаеньня ўраджаю зялёнай масы 122 ц. у (810 пуд. з дзес.).

ЛЮЦЭРНА.

Вучастак з люцэрнай быў закладзены ў сел. Каляды ў Нараўлянскім раёне. Паводле падліку 1927 г., ураджаю сена люцэрны на лёгкім суглінку было 22,5 ц. з гект. (150 п. з дзес.). Канюшына ў таго-ж самага гаспадара дала ў 1927 г. 22,2 ц. (148 п. на дзес.). Які сорт люцэрны выявіўся і колькі сабрана ўкосаў—пра гэта даных няма.

Заключэньне.

Нязначны лік досьледаў на кожную тэму і невыстарчальная вытрыманасьць іх не далі магчымасьці зрабіць больш грунтоўных вынікаў (сярэдняе паказаньняў па гадох, норма угнаеньняў ды інш.), а ў паданых табліцах прышлося, каб без патрэбы іх не ўскладняць, абмежавацца толькі схэматычным паказаньнем дабавак у процантах, не падаючы ў большасьці выпадкаў безадносных вялічынь.

Даныя гэтай працы не зьяўляюцца зусім сталымі вынікамі, але часам могуць быць карыснымі дзеля арыентыроўчых меркаваньняў па тым ці іншым пытаньні.

А. К. Дзіковіч

ВЫНІКІ РАБОТЫ ІНСТЫТУТУ СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ ВІЦЕБСКАЙ С.-Г. ДАСЬЛЕДЧАЙ СТАНЦЫІ ЗА 1928 г.

Справаздачны год зьяўляецца другім па рабоце сялян-дасьледчыкаў.

Яго трэба лічыць годам значнага разгортваньня сялянскіх досьледаў у абедзьвюх акругах раёну Віцебскай Станцыі—

Віцебскай і Полацкай. Пад вясну 1928 г. налічвалася дасьледчыкаў:

Віцебская акруга		Полацкая акруга	
Віцебскі раён .	13 дасьл.	Полацкі раён . .	4 дасьл.
Высачанскі „ .	16 „	Асьвейскі „ . .	3 „
Сураскі „ .	5 „	Ушацкі „ . .	4 „
Езярышчанскі раён	4 „	Расонскі „ . .	5 „
Ліёзьнянскі „	4 „	Ветрынскі „ . .	17 „
Сіроцінскі „	4 „	Валынецкі „ . .	4 „
Межанскі „	4 „	Дрысьненскі „ . .	5 „
Сененскі „	5 „	Лепельскі „ . .	5 „
		Удьскі „ . .	2 „
Усяго . .	55 дасьл.	Усяго . .	49 дасьл.

Разам па дзьвюх акругах 104 чал., з якіх 98 звычайных сялян, 1 камуна, 3 арцелі і 2 с.-г. гуртка.

К восені лік дасьледчыкаў павялічыўся. Так, па Віцебскай акрузе налічвалася да восені 1928 г. каля 70 дасьледчыкаў. Прычым, згодна дасланым з Бюро Сялян-Дасьледчыкаў праектам палажэньня, ужыты былі меры да пераважнага ўцягненьня калгасаў і пасёлкаў.

Адначасова з гэтым высьветліўся як мала актыўны элемэнт, ня вёўшы грамадзкай работы, так і актыў, прымаючы ўдзел у выстаўках і друку, наладзіўшы дзейную перапіску са Станцыяй.

30 сакавіка была праведзена канфэрэнцыя сялян-дасьледчыкаў Віцебскай акругі, у якой прынялі ўдзел 23 дасьледчыкі.

Наогул-жа, работа Станцыі па сялянскіх досьледах, з прычыны адсутнасьці для гэтай работы пасады спэцыялістага, працякала нездавальняюча, рабілася ўрыўкамі, галоўным чынам загадчыкам Станцыі.

З таго сартавога насеньня, што было на Станцыі, вясной даслана сялянам 50 пасылак, звычайна па 2 сарты ў кожнай: 7 пасылак гародніх культур, 12 ячменю, 21 аўсу і 10 бульбы. Улетку к восеннай сяўбе даслана 7 пасылак жыта, 5 пасылак зімовай вікі і 3 лубіну.

Пры ўдзеле Станцыі і дапамозе аграномаў вясной закладзена 12 досьледаў з гароднінай, 43 па сортаспрабаваньню ярыны: аўса, ячменю, бульбы; 15 досьледаў са штучнымі ўгнаеньнямі. Увосень закладзена 5 досьледаў з зімовай вікай, 7 па сортаспрабаваньню гатункаў жыта, 3 з лубінам і 8 са штучнымі ўгнаеньнямі пад жыта. Усяго 104 досьледы.

Гэтыя досьледы праводзіліся паводле інструкцыі Бюро Сялян-Дасьледчыкаў. Апрача гэтага, грамадзкай агранаміяй

абедзьвюх акруг праведзена каля 200 досьледаў. Гэтыя досьледы часткова праводзяцца паводле інструкцыі Бюро, а часткова, згодна са сваімі акруговымі схэмамі і інструкцыямі. Большасьць гэтых досьледаў праводзілася па вывучэньні дзейнасьці штучных угнаеньняў, торфу, гною, лубіну, з культурай лёну, кораньплодаў і сэрадэлі. Яны ў большасьці ня менш цікавыя, чым грунтоўныя досьледы, закладзеныя паводле Інструкцыі Бюро. Досьледы-ж са штучнымі ўгнаеньнямі маюць амаль аднолькавыя тэмы, чаму іх патрэбна ўвесьці ў справаздачу.

Між іншым, выявілася, што Акрза ня маюць магчымасьці распрацаваць вынікі сваіх досьледаў, якіх за 1927 г. і 1928 г. сабрана больш 500.

Таму Віцебская Станцыя паставіла мэтай апрацаваць вынікі досьледаў грамадзкай агранаміі за абодва гады разам з досьледамі, праведзенымі пры непасрэдным удзеле Станцыі, тым больш, што шмат досьледаў, пастаўленых Станцыяй у сялян, папсаваны дрэннымі мэтэаралёгічнымі ўмовамі.

ЛЁН.

Гушчыня засеву лёну.

У 1927 годзе былі праведзены досьледы з рознай гушчынёй засеву лёну на палёх сялян-дасьледчыкаў, каб выявіць, пры якой гушчыні засеву атрымліваецца самы вялікі ўраджай валакніны і выстарчальная колькасьць насеньня з аднаго гектару. Выраб глебы на ўсіх вучастках быў аднолькавы—веснавое ўзорваньне і баранаваньне, угнаеньня ня клалі, сяўба—ручная, закрывалі насеньне пасьля сяўбы бараной, праходзілі па адным месцы два разы. Нормы гушчыні: 0,5; 0,8; 1,4; 1,79 цэнтн. на гектар (ці 3; 5; 7; 9; 11 пудоў на дзесяціну).

Досьледы праведзены вось у якіх мясцовасьцях.

Акруга	Раён	Вёска	Гаспадарка	Глеба	Папярэдняя культура	Час			
						Ворыва	Баран.	Сяўбы	Зьбір з поля
Полацкая	Вушачы	Клапы	Кобуна Язэп	Падзол	Дзярніна	3/IV	30/IV	5/VI	20/VIII
„	Асьвея	Сянькова	Барысевіч Ад.	Цяжкі суглінак	Пералог	25/V	15/VI	17/VI	21/IX
„	„	х. Ветка	Обух Палікарп.	Суглінак марэнавы	Пералог	15/V	25/V	1/VI	1/IX
„	„	Стрэлка	Забеліна Кімф. Нік.	Суглінак лёгкі	Канюшына	8/VI	12/VI	16/VI	12/IX

Ураджай насеньня і валакніны ў цэнтнэрах паказаны ў табліцы:

№№ па парадку	Вёска	Гушчыня засеву 0,5 цэнт. на гектар		Гушчыня засеву 0.8 цэнт. на гектар		Гушчыня засеву 1,1 цэнт. на гектар		Гушчыня засеву 1,4 цэнт. на гектар		Гушчыня засеву 1,7 цэнт. на гектар	
		Ураджай у цэнтн. на гектар		Ураджай у цэнт. на гектар		Ураджай у цэнт. на гектар		Ураджай у цэнт. на гектар		Ураджай у цэнт. на гектар	
		Насеньня	Валакна	Насеньня	Валакна	Насеньня	Валакна	Насеньня	Валакна	Насеньня	Валакна
1	Клапы . . .	3,6	1,8	3,8	2,3	3,2	2,4	3,9	1,7	3,8	1,6
2	Сянькова . .	—	—	3,8	3,0	4,9	3,8	4,1	4,5	4,5	5,7
3	х. Ветка . .	—	—	2,4	2,0	2,9	2,5	2,7	2,6	2,7	2,9
4	Стрэлка . .	—	—	2,1	1,7	2,6	2,3	2,4	2,5	2,4	2,9
		У процантах									
1	Клапы . . .	95	73	100	100	84	104	103	74	100	70
2	Сянькова . .	—	—	100	100	129	127	108	150	118	190
3	х. Ветка . .	—	—	100	100	121	125	112	130	112	145
4	Стрэлка . .	—	—	100	100	124	135	114	147	114	170

З гэтых лічбаў можна бачыць, што ў трох пунктах: 2, 3, 4 самы вялікі ўраджай валакніны атрыман пры норме засеву 1,7 цэнтнэраў на гектар (11 дзес.), а самы вялікі ўраджай насеньня пры гушчыні засеву, 1,1 цэнтнэраў на гектар (7 п/дзес.). Норма засеву 1,4 цэнтнэраў на гектар, як відаць з табліцы, займае прамежнае месца паміж 1,1 і 1,7 цэнтнэраў на гектар па ўраджаі валакніны, а па ўраджаі насеньня займае такое самае месца, як і норма 1,7 цэнтнэраў на гектар, за выключэньнем вёскі Сянькова.

Найбольшы ўраджай у вёсцы Клапы прыпадае на 1,1 цэнтнэраў на гектар нормы па валакну і па насеньню на 1,4 цэнтнэраў на гектар.

Наогул можна сказаць, што з досьледаў 1927 г. з гушчынёй засеву лёну, на падставе даных трох пунктаў—в. Сянькова, х. Ветка і в. Стрэлка—для атрыманьня большага ўраджаю валакніны з адзінкі плошчы магчыма загушчэньне засеву да 1,7 цэнтнэраў на гектар (11 пуд. на дзесяціну). Для атрыманьня выстарчальнай колькасьці валакніны і насеньня прыдатнай нормай гушчыні будзе 1,4 цэнтн. на гект. (9 пуд. на дзес.).

У 1928 г. досьледы з гушчынёй засеву лёну на сялянскіх палёх рабіліся далей, ужыты другія варыянты 0,8; 1,1; 1,5; 1,9 і 2,3 цэн. на гектар (5; 7,5; 10; 12,5; 15 п. на дзес.).

Досьледы праводзіліся на двух фонах, без угнаеньня і з угнаеньнем калій-фасфатам (46 кгр. чыстага фосфару + + 46 кгр. чыстага калія на гектар).

Акруга	Раён	Вёска	Гаспадар	Глеба	Папярэдняя культура	Час			
						Ворыва	Баран.	Засеву	Уборкі
Полацкая	Асьвейскі	Каханавічы	Некрасаў Евстаф	Супесь	Канюшына	2/V	30/V і 10/5	10/VI	29/VIII
„	Дрысенскі	Свальна	С.-г. Комуна Леніна	Суглінак	„	3/V	18/V і 30/V	30/VI	7/IX
„	Вушацкі	Вушацы	Чэрных Андрэй	Суглін. марэн.	Канюш. 3-га г.	10/X	21/IV, 14/V і 29/V	8/VI	12/IX
„	Падздз. Няровічы	Сяцінец	Ткачоў Р. Ф.	Супесь	Канюш.	1/IX 11/XI	10/V 2/VI	6/VI	—
Віцебск	Езярышча	—	Круме А.	—	Бульба	—	—	—	—

Ураджай насеньня і валакніны ў цэнт. на гектар.

Паселішча	Гушчыня засев. 0,8 ц. на гект.		Гушч. засеву 1,1 ц. на гектар		Гушч. засеву 1,5 ц. на гектар		Гушч. засеву 1,9 ц. на гектар		Гушч. засеву 2,3 ц. на гектар		
	Насен.	Валакна	Насен.	Валакна	Насен.	Валакна	Насен.	Валакна	Насен.	Валакна	
Кахановічы	2,4	2,3	2,7	2,8	3,3	3,4	3,3	3,7	2,3	3,4	Без угнаен.
	3,6	3,6	3,9	4,2	3,6	4,8	3,8	5,0	3,0	4,3	Угноена
Свальня	2,2	1,9	2,2	2,0	2,5	2,6	2,3	2,5	2,2	2,4	Без угнаен.
	2,6	2,8	2,8	2,8	2,9	3,2	2,8	3,2	2,7	3,1	Угноена
Вушацы	3,7	2,4	3,3	2,6	2,9	2,9	2,7	2,9	2,6	3,4	Без угнаен.
	4,9	3,0	4,8	3,2	4,4	3,3	3,9	3,5	3,7	3,6	Угноена
Сяцінец [1]	2,5	12,8	2,3	20,3	2,1	19,2	2,1	20,3	1,7	32,4	Без угнаен.
	2.1	27,1	2,0	30,1	1,9	30,9	1,8	33,5	2,3	28,3	Угноена
Езярышчанскі раён	—	—	3,4	1,1 ц. на га 3,5	4,5	1,7 ц. на га 4,4	5,0	1,7 ц. на га 5,1	—	—	Без угнаен.

У процантах

(за 100 прыняты ўраджай з 0,8 ц. на гект.)

Кахановічы	100	100	112	122	137	148	137	161	96	148	Без угнаен.
	100	100	108	117	100	138	105	139	83	119	Угноена
Свальня	100	100	100	105	114	137	104	131	100	126	Без угнаен.
	100	100	108	100	111	114	108	114	104	111	Угноена
Вушачы	100	100	89	108	78	121	73	121	70	142	Без угнаен.
	100	100	98	107	90	110	79	117	75	120	Угноена
Сяцінец	100	100	92	158	84	150	89	158	68	253	Без угнаен.
	100	100	95	111	90	114	86	124	109	104	Угноена
Езярышчанскі раён	—	—	1,1 ц. на га 100	100	129	1,4 ц. на га 126	143	1,7 д. ц. на га 146	—	—	Без угнаеньня

У раёне Езярышч. за 100 узяты ўраджай з 1,1 ц. на гек.

[1]) У Сяцінцы паказан ураджай сьцябла, а ня чыстага валакна.

З табліцы відаць, што калі палажыць калій-фасфату, дык ўраджай як валакніны, так і насеньня павялічваецца (в Сяцінец ня прымаецца пад увагу), загушчэньне засеваў ад 1,5 цэнтнэраў да 1,9 ц. на гект. дае ў большасьці выпадкаў павышэньне ўраджаю валакніны і насеньня.

Наогул досьледы 1927 і 1928 г. выявілі мэтазгоднасьць загушчэньня засеву лёну ня менш як да 1,5 цэнтн. на гектар, адкуль вынікае, што прынятыя больш рэдкія засевы лёну, якія хістаюцца ад 1 да 1,3 цэнтнэраў на гектар, трэба лічыць замалымі.

КОР АНЬПЛОДЫ.

Досьледы з кораньплодамі ставіліся па вывучэньню ўраджайнасьці розных відаў кораньплодаў на працягу 2-х гадоў на прысялібнай зямлі ў Полацкай акрузе.

Дзялянкі—каля 100 кв. мт., паўторнасьць—2-хразовая. Раўнаючы па гадох ураджаі кораньплодаў, заўважаем: у добры год (1927) на багатых запраўленых глебах найбольш высокія ўраджаі атрыманы кармовых буракоў і блізкія па вазе ўраджаі турнэпсу. Ураджай морквы па вазе многа меншы, што відаць з наступнай табліцы (Віды кораньплодаў), табл. на 112 стар.

У 1928 халодным і сырым годзе буракі больш усяго былі пашкоджаны таму, можна сказаць, што яны горш за ўсё пераносяць няспрыяючыя кліматычныя ўмовы.

Бручка ў 1928 годзе таксама дала дрэнныя вынікі, ня лепшыя за буракі, з тых самых прычын, што і буракі, і яна зьяўляецца культурай, маючай доўгі вэгетацыйны пэрыяд.

Турнэпс выяўляе сябе як вельмі ўпартая культура; ён даў амаль аднолькавы ўраджай ў абодва гады.

Кармовая морква выкарыстала мэтэаралёгічныя ўмовы 1928 г. лепш за ўсе іншыя кораньплоды, даўшы вялікі ўраджай.

Ураджай яе ў 1927 годзе быў ніжэйшы, чым буракоў.

Такім чынам, у Віцебшчыне і Полаччыне добра растуць усе віды кораньплодаў і асабліва ўстойлівым па ўраджаі зьяўляецца турнэпс. Буракі і бручка менш трывалыя да нізкіх тэмпэратур, усё-ж такі больш выгадныя за турнэпс.

Самыя лепшыя ўраджаі на запраўленых глебах далі буракі і морква.

№№	Год	Акруга	Раён	Гаспадар	Глеба
1	1927	Полацкая	Ветрынскі	—	Супесь
2	„	„	„	Лысоў Аляксандр	„
3	„	„	„	Гасьцеў Ляксей	„
4	„	„	„	Навайчук Іяьля	„
5	„	„	„	Кузьмін Нікінор	„
6	„	„	„	Багдановіч	„
7	„	„	„	Лаўрэнці Пракопавіч	„
8	1928	Полацкая	„	Невядома	„
9	„	„	„	Чарняўскі Рычард	„
10	„	Віцебская	Ліёзьнянскі	Ляшкевіч Андрэй	„
11	„	Полацкая	Ветрынскі	Катушонак Васіль	Суглінак
12	„	„	„	Самко Язэп	„
13	„	„	„	Парашоў Міхал	„

Сярэдн. за 1927 г. . . . . .

за 1928 г. . . . . .

[1]) Тона раўна 61 пуду.

Угнаеньні	Папярэдняя культура	Спосаб сяўбы і час	Ураджай з гект. у тонах [1])				Увага
			Буракі	Морквы	Бручкі	Турнэпс	
ой 125 цэнтн. масаўка 2,3 цэнт. ліев. соль 1,4 цэнт. рнакіслы ам. 1,4 цэнт.	Ячмень	У грэбні	27,5	12,6	—	15,3	Усе досьледы рабіліся на прысялібных вучастках
ой 360 цэнт.	Бульба на гнаі	Без грэбняў	54,0	18,0	—	36,0	
ой 360 „	Невядома	У грэбні	48,6	27,9	—	33,7	Сяўба ў другой палове мая (15—30)
ой 360 „	Бульба	„	36,0	15,0	—	32,4	
рна-кісл. ам.—0,8 ц. л. соль —1,2 ц.	Невядома	„	54,0	50,4	—	67,5	
ой 90 цэнтн. масаўка 1,4 ц. л. соль 0,8 ц. рна-кіслы амон. 1,0 ц.	Жыта на гнаі	„	62,1	19,8	—	51,3	
ою 120 цэнтн. пэрфасфат 2,8 цэнт. л. соль 1,5 „ рнакісл. 1,0 „	[illegible]уста	„	48,6	27,9	—	32,7	
ою 180 цэнтн. пэрф. 3,6 „ л. соль 1,8 „ рна-кіслы ам. 1,8 ц.	Ярына	„	17,2	23,8	23,4	22,2	
ою 180 цэнтн. пэрф. 3,6 ц. л. соль 1,8 ц. рна-кіслы ам. 1,8 ц.	Бульба	„	17,4	43,6	—	42,9	
евядома	Невядома	—	20,0	33,3	—	42,0	
ою 180 ц. пэрф. 2,4 цэнт. л. соль 1,2 „ рна-кіслы ам. 1,2 ц.	Бульба на гнаі	У грэбні	31,5	36,0	—	27,0	
ою 180 цэнтн. пэрф. 2,4 цэнт. л. соль 1,2 „ рна-кіслы ам. 1,2 ц.	Каноплі	—	18,3	82,8	—	59,7	
ою 360 цэнтн.	Бульба на гнаі	Сяўба	17,0	38,1 (22,0 батв.)	35,4	53,3 (12,3 батв.)	
Сярэдн. за 1927 г. . . .			47,2	24,5	—	38,4	
„ „ 1928 г. . . .			20,2	42,9	29,4	41,2	

Сортаспрабаваньне.

У гэты агляд увайшлі вынікі наступнай колькасьці сялянскіх досьледаў:

1. Спрабаваньнее жыта Пяткускага ў 1927 г. ў Полацкай акрузе . . . . 6 досьл.
2. Спрабаваньне ячмянёў 1927 г. ў Полацкай акрузе . . . . . 3 „
3. Спрабаваньне ячмянёў 1928 г. ў Полацкай акрузе і Віцебскай . . . . . 9 „
4. Спрабаваньне аўсоў у 1928 г. . . . . 8 „
5. Спрабаваньне бульбы ў 1928 г. . . . 3 „

Вынікі досьледаў з жытам атрыманы ад Полацкага Акрза. Яны былі зроблены ў Ветрынскім раёне на дзялянках 660 кв. мт.: 2 на суглінках і 4 на супесях.

Атрыманы наступныя вынікі ўраджаю зерня ў падвойных цэнтнэрах на гектар.

Глеба	Ураджай кантролю (мясц. жыта)	Пяткускае жыта дало дабаўку	Дабаўка ў %	У в а г а
Супесь	8,8	+ 2,1	+ 24	Зімоўка для Пяткускага жыта здавальняючая
Суглінак . . .	10,3	+ 1,6	+ 17	

Гэтыя досьледы выявілі, што пры спрыяючай зімоўцы Пяткускае жыта больш ураджайнае чым мясцовае ня толькі на пескаватых, але-ж і на суглінкавых глебах; выяўлялася, аднак, меншая ўраджайнасьць Пяткускага жыта на суглінках, чым на супесях.

Вынікаў досьледаў з Пяткускім жытам за 1928 г. пакуль што на Станцыі няма, але-ж вядома, што Пяткускае жыта ў гэтым годзе ў абедзьвюх акругах значна папсавана лішкам выпадзяй; увосень і вясной на ёй таксама больш дрэнна, чым на мясцовым жыце адбілася выпаданьне сьнегу на талую глебу.

На дасьледчым полі Станцыі Пяткускае жыта, якое было ў 8 узорах рознага паходжаньня, зусім згінула; перасеў яго, які рабіўся ў гаспадарцы Падбярэзьзе, толькі вярнуў насеньне. Такая зьява прымушае быць асьцярожным у распаўсюджваньні яго на вільготных глебах, асабліва на суглінках, невыстарчальна абсушаных.

Весткі па спрабаваньні сартоў ячменяў дасланы за 1927 г. таксама Полацкім Акрза. Досьледы праведзены ў Асьвейскім і Ветрынскім раёнах на суглінках пасьля ўгноенай гноем

бульбы. Выпрабоўваліся два сарты: „Залаты"—1 досьлед і „Ганхен II"—2 досьледы. Кантролем зьяўляўся мясцовы 6-ці радны.

Вынікі наступныя:

Сарты	Ураджай у цэнт. на гкт.		Дабаўка		Увага
	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	
Мясцовы . . .	6,4	10,2			„Ганхен" у адным з досьледаў даў адмоўныя вынікі, а ў другім—станоўчыя.
„Залаты" . . .	9,9	16,8	+ 3,5	+ 6,6	
„Ганхен II" . .	7,5	11,7	+ 1,1	+ 1,1	

У 1928 годзе досьледы па выпрабаваньні ячменяў рабіліся ў абедзьвюх акругах паводле інструкцыі Бюро Сялян-Дасьледчыкаў. Выпрабоўваліся 4 сарты: „Брыо", „Залаты", „Прынцэса", „Лебядзіная Шыя". Плошча дзялянак 250 кв. мэтраў.

Сарты	Суглінак				Супесь			
	Ураджай		Дабаўка		Ураджай		Дабаўка	
	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы
Мясцовы . . .	12,2	16,5	—	—	5,7	9,5	—	—
„Брыо"			—	—	—	—	+ 0,6	+ 2,4
„Залаты" . . .			— 1,6	— 0,8			— 0,9	— 0,9
„Лебядз. Шыя" .			— 0,9	+ 3,4				
„Прынцэса" . .			+ 0,4	+ 0,5				

Усе сарты, апрача „Залатога", далі здавальняючыя вынікі ў параўнаньні з мясцовым. Досьледы з гэтымі сартамі на дасьледчым полі Станцыі таксама даюць досыць добрыя вынікі, але-ж на працягу 3-х гадоў яны давалі невялікую дабаўку ўраджаю, чаму Станцыя іх пакуль што раіць ня мае магчымасьці, апрача „Брыо", ня даўшага пакуль што ні разу адмоўных вынікаў. Такім чынам, досьледы з сартамі ячменю выяўлялі ўраджайнасьць сорту „Брыо" і магчымасьць шляхам далейшай работы адшукаць шмат сартоў, больш ураджайных, чым мясцовы.

З аўсамі досьледы рабіліся ў 1928 годзе на суглінках у Віцебскай і Полацкай акругах. Усе досьледы праводзіліся згодна з інструкцыяй Бюро Сялян-Дасьледчыкаў. У выпрабаваньні былі: „Шацілаўскі“, „Пабеда“,=1 досьлед. Дзялянкі па 250 кв. мт. Атрыманы наступныя вынікі ў цэнтнэрах на гектар.

Сарты	Ураджай на гектар		Дабаўка ўраджаю	
	Зерня	Саломы	Зерня	Саломы
Мясцовы . . .	10,0	13,8		
„Шацілаўскі“ . .			+ 1,6	+ 5,5
„Залаты Дождж“			— 0,5	— 1,0
„Гаралецкі“ . .			— 0,2	— 3,8
„Пабеда“ . . .			— 2,1	— 3,8

Гэтыя вынікі адпавядаюць 3-гадовым даным работы дасьледчага поля Станцыі па выпрабаваньні аўсу і сьведчаць, што надта цяжка адшукаць сорт аўса на Віцебшчыне, які даў-бы больш значны ўраджай, чым мясцовы. На жаль, у лік выпрабаваных сартоў на Станцыі не ўваходзіць шацілаўскі авёс, чаму, пакуль што, немагчыма праверыць сталымі досьледамі вынікаў сялянскіх досьледаў. З другога боку, высокая ўраджайнасьць мясцовага аўсу прымушае зьвярнуць ўвагу на палепшаньне яго якасьці праз мясцовае сартаваньне.

Выпрабаваньне сартоў бульбы ў 1928 годзе ня мела тэй шырыні, з якой рабілася яно ў сялянскіх досьледах у 1927 годзе. Досьледы 1927 году вызначылі цікавасьць з заводзкіх сартоў „Сілезія“, з позьніх сталовых „Гаўронка“, з раньніх „Эпікура“. Тое-ж сьведчаць 2-гадовыя вынікі досьледаў на дасьледчым полі Станцыі.

У 1928 годзе праведзена два досьледы параўнаньня „Вольтмана“ і „Сілезія“ і 1 досьлед з тэй самай калекцыяй, якая выпрабоўвалася ў 1927 г. Усе досьледы рабіліся на супяшчанай глебе.

Атрыманы наступныя вынікі.

Сарты	Ураджай	У падвойных цэнтнэрах на гектар
	Досьлед гр. Жыголка	Досьлед гр. Аляшкевіча
	У цэнтн. на гектар	
„Сілезія“ . . .	140,4	104,4
„Вольтман“. . .	135,9	91,8
„Сілезія“ дала больш на . .	4,5	12,6

Паўторны досьлед Аляшкевіча А. М. даў наступныя вынікі ўраджаю на гектар у цэнтнэрах:

„Гаўронак“ 198,7
„Эпікур“ 195,0
„Сталовая 136“ 185,5
„Апал“ 127,5
„Імпэратар“ (свой) 150,0

Энгельгардт.

ВЫНІКІ СЯЛЯНСКІХ ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ ПА КУЛЬТУРЫ БАЛОТ ЗА 1928 г.

У вырашэньні кармовага пытаньня ў беларускай сельскай гаспадарцы культура балот пачынае адыгрываць значную ролю.

Цяпер амаль па ўсіх куткох БССР лік мэліярацыйных таварыстваў павялічваецца ўсё больш ды больш. Да сёнешняга дня мы маем звыш 1000. Прычын, якія прымушаюць сялянства брацца за асваеньне балот, шмат, пералічым толькі галоўныя з іх.

Мы ведаем, што натуральных сенажацяй ў Беларусі мала. А павялічыць кармовыя рэсурсы можна: 1) шляхам пашырэньня кармовай плошчы і 2) павялічэньня ўраджайнасьці кармовых ужыткаў. Пашырэньне натуральнай кармовай плошчы цяпер амаль немагчыма, бо яна ўся ўжо выкарыстана. Такім чынам, застаецца пашырэньне палявога травазасеву і асваеньне балот. За апошнія гады мы бачым пэўнае пашырэньне палявога травазасеву, але гэта пашырэньне ня надта вялікае. Ды яно і зразумела. Пашырэньне травазасеву прымушае скарачаць засеў збожжавых расьлін з прычыны абмежаванасьці ворнае зямлі. Асваеньне-ж балот лепш, як што іншае, дапамагае выйсьці з гэтага становішча. З аднаго боку, яно дае магчымасьць пашырыць с.-г. плошчу, а з другога—тыя высокія ўраджаі траў, што даюць культурныя балотныя сенажаці, у значнай меры забясьпечаць гаспадарку добрым кормам; выстарчальная колькасьць корму дасьць магчымасьць пашырыць жывёлаводзтва і павялічыць запасы гною ў гаспадарцы, а гэта апошняе,—больш рацыянальна арганізаваць і весьці палявую гаспадарку. Такім чынам, каштоўнасьць асушанага балота як культурнай плошчы, якую можна скарыстаць пад усялякую расьліну, прымушае селяніна ўцягваць у культурнае выкарыстаньне балота. Цяпер-жа, калі дасьледчыя ўстановы і апорныя балотныя пункты паказалі, што культура балот дае карысьць, сялянства пачынае шукаць мэтадаў, каб абярнуць свае балоты ў сенажаці і ральлю.

У гэтых шуканьнях балотная станцыя дапамагае бядняцкаму і серадняцкаму сялянству—шляхам уцягненьня сялян-

скага актыву ў дасьледчую работу. Дасьледчую работу сярод сялянства Станцыя распачала ў 1927 г. У першы год сваёй работы з сялянамі Станцыя налічала 25 сялян-дасьледчыкаў, летась жа яна мела ўжо больш як 50 дасьледчыкаў, у якіх пры дапамозе раённых культуртэхнікаў праведзены 51 досьлед; з іх 34 досьледы былі закладзены ў мэліярацыйных таварыствах і 17 досьледаў у паасобных членаў мэліярацыйных таварыстваў.

Колькасьць тэм (асобных пытаньняў), якія Станцыя летась вывучала, была невялікая. Больш за ўсё праведзена досьледаў па вывучэньні норм угнаеньняў. Гэта тэма для кожнага мэліярацыйнага таварыства, а таксама і для кожнага селяніна важная таму, што ня ўсе балоты аднолькава багаты на спажыўныя матэрыі. Адны з іх патрабуюць адных спажыўных матэрый, а другія—другіх. І ня ведаючы, чаго больш патрабуе балота, селянін будзе сеяць ня тое ўгнаеньне, якога не хапае, і такім чынам, будзе псаваць дарма грошы і не атрымае таго ўраджаю, што мог-бы мець. Гэты досьлед праводзіўся так: дасьледчы вучастак падзяляўся на 18 дзялянак, кожная па 100 кв. мт. На 9 з іх, разьмеркаваных у рад, высявалася каліевая соль—сьпярша з разьліку 300 кг. на гектар, ці чыстага калію—90 кг; да яе дадаваўся супэрфасфат з разьліку на гектар 90 кг. (чыстага фосфару 15 кг.), потым 180 кг. (чыстага фосфару 30 кг.), потым 270 кг. (чыст. 45 кг.) і 360 кг. (чыст. фосфару 60 кг.). На наступных дзялянках супэрфасфат высяваўся з разьліку 360 кг. на гектар, а каліевая соль зьмяншалася на 3/4 нормы, г. зн. 68 кг. чыст. калію і на палову нормы—45 кг. чыст. калію. Дзейнасьць гэтых норм вывучалася пры засеве аўса на зерне аўсяна-вікавай мешанкі на сена і мешанкі лугавых траў.

Вынікі досьледаў пры засеве аўса на тарфяніку ў сярэднім на гектар у цэнтнэрах атрыманы наступныя:

Акруга	Лік досьлед.	Без угнаеньня	Калі 90 кг.	Фосф. 90 кг.	Калі 90 кг., фосф. 15 кг.	Калі 90 кг., фосф. 30 кг.	Калі 90 кг., фосф. 45 кг.	Калі 90 кг., фосф. 60 кг.	Калі 68 кг., фосф. 60 кг.	Калі 45 кг., фосф. 60 кг.
Полацкая .	3	8,19	10,40	9,01	11,79	12,86	12,29	12,61	9,01	10,65
Аршанская .	2	3,68	6,56	5,75	8,16	12,61	13,44	—	10,08	9,12

З гэтае табліцы відаць, што ўсе балоты, на якіх праводзіліся досьледы, бедныя на калій. Пры параўнаньні дзялянкі з адным каліем і дзялянкі з адным фосфарам мы бачым, што ўраджай па калію значна большы, чым па фосфару.

Самы лепшы ўраджай на дзялянках з поўным угнаеньнем калію, 90 кг. чыстага калію, што адпавядае 300 кг. каліевай солі з дабаўкай 30—45 кг. чыстага фосфару, што адпавядае 180—270 кг. на гектар супэрфасфату. Пры павялічэньні нормы высеву фосфару да 60 кг. на гектар у адных выпадках ураджай не павялічваецца, а ў другіх, калі і павялічваецца, дык зусім мала.

Ураджай аўсяна-вікавай мешанкі на сена ў цэнтнэрах на гектар.

Акруга	Лік досьлед.	Без угнаеньня	Калі 90 кг.	Фосф. 90 кг.	Калі 90 кг., фосф. 15 кг.	Калі 90 кг., фосф. 30 кг.	Калі 90 кг., фосф. 45 кг.	Калі 90 кг., фосф. 60 кг.	Калі 68 кг., фосф. 60 кг.	Калі 45 кг., фосф. 60 кг.
Полацкая .	2	16.87	33,58	17,04	30,47	38,50	40,95	41,29	37,19	32,43
Віцебская .	2	12,78	—	—	35,71	35,38	32,43	41,62	38,00	36,86
Аршанская .	3	28,50	42,83	31.01	36,88	38,90	49,00	—	44,94	40,00
			Ураджай травяных мешанак у падвойных цэнтн. на гектар							
Аршанская	4	26,09	30,67	28,97	32,39	35,16	41,64	—	38,17	37,26
Менская .	2	23,83	46,60	30,55	52,99	52,68	54,55	53,64	57,41	57,08

Такі самы малюнак мы бачым з ураджаямі аўсяна-вікавай мешанкі і на травяных канюшына-цімафейкавых мешанках. У Полацкай акрузе ўраджай аўсяна-вікавай мешанкі па калію роўна ўдвая вышэйшы, чым па фосфару. Што да ўплыву калію і фосфару разам, дык тут таксама большыя ўраджаі дала поўная норма калію з дабаўкай фосфару 30—45 кг. Пры павялічэньні высеваў фосфару да 60 кг.—ураджай таксама павялічваецца надзвычайна мала, і ўжываньне такой колькасьці фосфару ў большасьці выпадкаў будзе нерэнтабельна, з прычыны малой дабаўкі ўраджаю. Такім чынам, з нашых досьледаў відаць, што на большасьці тарфяных глеб найбольш выгадна сеяць наступную колькасьць угнаеньняў: калію—90 кг., што адпавядае 300 кг. каліевай солі, і фосфару 30—45 кг., што адпавядае 180—270 кг. супэрфасфату. Такое хістаньне норм высеваў фосфару залежыць ад багацьця балота на прыродны запас фосфару. Каб ведаць, як балота багата на гэтыя пажыўныя матэрыі,—трэба закладаць досьледы на кожным балотным масыве з выпрабаваньнем норм высеву ўгнаеньняў. Гэты досьлед на працягу 2—3 г.

дасьць пэўны адказ,—чаго балота патрабуе. Досьледы з нормамі на сухадольных сенажацях далі крыху іншыя вынікі. Ураджай аўсяна-вікавай мешанкі па калію 78 кг. на гектар у выглядзе каліевай солі дае 10,75 цэнтнэраў сена на гектар, а па фосфару—45 кг. у форме супэрфасфату—11,47 цэнтнэраў. Па калію—75 кг. + фосфару 30 кг.—12,28 цэнтнэраў сена на гектар. Авёс па аднаму калію (нормы тыя-ж самыя) даў ураджай 5,08 цэнтнэраў зерня на гектар, па фосфару—12,28 цэнтнэраў; калій і фосфар разам далі—12,94 цэнтнэра ўраджаю зерня аўса. Такім чынам, сухадольныя сенажаці патрабуюць фосфару болей, чым калію.

Параўнаньне спосабаў паверхневага палепшаньня тарфянікаў.

Другая тэма, якую Станцыя праводзіла ў сялян-дасьледчыкаў,—гэта параўнаньне спосабаў торфавага палепшаньня тарфянікавых сенажацяй.

Гэта тэма праводзілася ў патройнай схэме з двухразовай паўторнасьцю: 1) балота без палепшаньня, 2) адно баранаваньне, 3) баранаваньне + угнаеньне (калі 75 кг., фосфар 45 кг.). Сярэднія ўраджаі сена па 8 досьледах атрыманы наступныя:

1) Балота без палепшаньня дало ўраджай 7,70 цэнтнэраў сена на гектар.

2) Адно баранаваньне дало 9,30 цэнтнэраў і

3) Баранаваньне з угнаеньнем—12,80 цэнтнэраў сена на гектар. Мы бачым, што адно баранаваньне дало дабаўкі сена толькі 1,60 цэнтнэраў на гектар, а баранаваньне з угнаеньнем 5,10 цэнтнэраў. Такім чынам, баранаваньне тарфяніку без угнаеньня не дае належных вынікаў.

Параўнаньне спосабаў паверхневага і карэннага палепшаньня тарфяніку.

Гэта тэма Станцыяй праводзілася на працягу 2-х год на нізінных балотах з добраперапрэўшым тарфянікам і досыць добрым травастоем. Дзялянкі браліся ў 250 кв. мт. з двухразовай паўторнасьцю паводле наступнай табліцы: 1) дзялянка без палепшаньня, 2) адно ўгнаеньне без баранаваньня, 3) баранаваньне, угнаеньне і падсеў траў, 4) ворыва + угнаеньне + засеў траў. Угнаеньне клалася з разьліку на гектар—калію 90 кг. у форме каліевай солі і фосфару 60 кг. у форме супэрфасфату. Ужывалася канюшына-цімафейкавая мешанка траў наступнага складу: канюшыны чырвонай—6 кг., канюшыны швэдзкай—6 кг. і цімафейкі—10 кг. на гектар.

Гэты досьлед быў закладзены ў 1927 годзе на дзесяці паасобных балотных масывах. Вынікі 1927 г. надрукаваны ў

выданьні Бюро Сялян-Дасьледчыкаў—„Вынікі працы Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў".

У 1928 годзе гэты досьлед быў працягнуты. Вясной, калі балота так падсохла, што можна было на яго ўзьехаць, дзялянка, якая паводле схэмы павінна баранавацца,—была забаранавана, а на тых дзялянках, што ўгнойваліся, было высеяна ўгнаеньне ў паказанай вышэй колькасьці.

У выніку гэтага досьледу атрыманы наступныя ўраджаі сена: без палепшаньня—16,76 цэнтнэраў з гектара, па адным угнаеньні—21,96 цэнтнэраў, па баранаваньні з угнаеньнем і падсевам траў—34,93 цэнтнэраў і па ўзаранаму з угнаеньнем ураджай—50,46 цэнтнэраў. Такім чынам, адно ўгнаеньне дало дабаўкі сена 5,20 цэнтнэраў на гектар. Баранаваньне з угнаеньнем і засеў траў—18,17 цэнтнэраў і ворыва з засевам траў ды ўгнаеньнем—33,70 цэнтнэраў, г. зн. у 3 разы больш, чым балота без палепшаньня. З гэтага досьледу відаць, што самае выгаднае—гэта карэннае палепшаньне балота.

Уплыў расьліннага акрыцьця на ўраджай траў.

У 1928 годзе праведзена 4 досьледы па вывучэньні ўплыву акрыцьця на ўраджай лугавых траў на балоце. У якасьці акрыцьцёвай расьліны—быў высеяны авёс. Досьлед закладзены паводле наступнай схэмы: 1) травы без акрыцьця і 2) травы з акрыцьцём аўса. Там, дзе было акрыцьцё, травы разьвіваліся досыць добра, але ўкосу ня далі, дзякуючы чаму атрыманы толькі ўраджай аўса—12,69 цэнтнэраў зерня на гектар. Травы без акрыцьця далі ўраджай сена 28,17 цэнтнэраў на гектар. Па дадзеных аднаго году сказаць, як лепш сеяць травы—з акрыцьцём ці без яго,—нельга. Гэты досьлед будзе ставіцца яшчэ некалькі год, пасьля чаго можна будзе адказаць на гэта пытаньне.

Дуброўскі.

ВЫНІКІ РАБОТЫ СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ ПА КУЛЬТУРЫ ЛЕКАВЫХ РАСЬЛІН ЗА 1928 год.

Інстытут Сялян-Дасьледчыкаў пры Магілеўскай Станцыі Лекавых Расьлін аб'яднаў у 1927 г. 4 селяніна-дасьледчыка, а ў 1928 г.—24 селяніна-дасьледчыка і 3 установ.

Тэрытарыяльна ў адносінах да раёну дзейнасьці Магілеўскай Дасьледчай Станцыі Лекавых Расьлін сяляне-дасьледчыкі разьмяшчаліся наступным чынам: у межах БССР знаходзіцца 20 чалавек дасьледчыкаў і 3 установы і за межамі БССР—4 дасьледчыкі.

У межах Магілеўскай акругі лічыцца 13 сялян-дасьледчыкаў і Каніцкая С.-Г. Прафшкола; у Бабруйскай акрузе—3 селяніна-дасьледчыка і Чырвона-Бярэскі Аграпэдтэхнікум; у Менскай акрузе—1 селянін-дасьледчык; у Аршанскай акр.—1 дасьледчык і Засьпенскае Дасьледчае Поле і ў Гомельскай акрузе—1 селянін-дасьледчык.

За межамі БССР знаходзіцца: 1 дасьледчык у АССР немцаў Паваложжа; 1 дасьледчык у Пскоўскай губ., 1 дасьледчык у Сталінградзкай губ. і 1 дасьледчык у Цьвярской губ. Пры такой раскіданасьці дасьледчыкаў і адсутнасьці на станцыі спэцыялістага па сялянскіх досьледах—сувязь з сялянамі-дасьледчыкамі Станцыяй падтрымлівалася пераважна перапіскай і толькі тыя дасьледчыкі, што знаходзяцца ў радыусе 25—30 вёрст ад Станцыі, час-часам наведваліся ды інструктаваліся прадстаўніком Станцыі.

Для пастаноўкі досьледаў сялянам-дасьледчыкам было разаслана насеньне розных лекавых траў, маючых найбольш практычнае значэньне ва ўмовах нашай краіны.

У асноўным у набор насеньня лекавых траў для сялян-дасьледчыкаў уваходзілі наступныя віды:

1. Yaleriana nitida (Валярьяна сухадольная) 100 гр. насеньня
2. Yaleriana palustris (валяр'яна балотная . 20 „ „
3. Atropa Belladonna Эўропэйская (беладона) 100 „ „
4. Atropa Caucasica (Каўкаская беладона) . 100 „ „
5. Digitalis purpurea (Чырвоная напярсьцянка) 50 „ „
6. Salvia officinalis (Шалфей лекавы) . . . 20 „ „
7. Matricaria chamomilla (рамашка лекавая) . 100 „ „
8. Hyoscyamus albus (беляна) . . . . . 50 „ „
9. Datura stramonium (дурман). . . . . 100 „ „

Усяго было выдана 11,1 кг. насеньня на агульную суму 88 руб. 80 кап. Насеньне выдавалася дарам. Разам з насеньнем кожнаму селяніну-дасьледчыку высылалася інструкцыя па пастаноўцы досьледаў з лекавымі расьлінамі.

За лета было зроблена абсьледваньне засеваў у 12 дасьледчыкаў з мэтай выяўленьня зробленай работы і стану расаднікаў.

Пры абсьледваньні выяўлена, што выданае насеньне лекавых траў, за выключэньнем аднаго выпадку, было пасеяна на прыгатаваныя градкі, але вынікі засеваў ня ўсюды аднолькавыя. Агульная скарга дасьледчыкаў на вельмі нядобрыя кліматычныя ўмовы вэгетацыйнага пэрыяду 1928 году, які вызначаўся вельмі халоднай і доўгай вясной са значнай колькасьцю вопадзяй, а таксама вільготным летам з улавамі і вялікімі вятрамі.

Такія заўвагі дасьледчыкаў падкрэсьліваюцца данымі мэтэаралёгічных назіраньняў на дасьледчай станцыі. Пры такіх умовах засевы лекавых траў на нізкіх мясцох выправалі, а калі і не, дык разьвіваліся вельмі марудна. З паведамленьня дасьледчыка з г. Себежа, Пскоўскай губ., відаць, што ў той час, калі на Магілеўскай Дасьледчай Станцыі шалфей 2-га году і аніс ужо давалі сьпелае насеньне, у яго яны нават яшчэ не красавалі.

Найбольш пацярпелі ў дасьледчыкаў засевы шалфею, які чулы да вільготнага надвор'я і марудна пры гэтым разьвіваецца. У некаторых выпадках усходы шалфею моцна папсаваны мышамі.

Усходы беладоны, патрабуючыя асабліва беражных адносін, у шмат якіх выпадках гінулі, як відаць, ад ня зусім правільнага дагляду.

Дасьледчыкі выказвалі думку, што ў іх рабоце адчувалася няўпэўненасьць у правільнасьці дагляду лекавых траў. Акрамя інструкцыі, яны выказалі думку аб патрэбе жывога слова з тлумачэньнямі і парадамі па тых пытаньнях, што зьяўляюцца ў процэсе работы. Зазначалася таксама на тое, што пры працаёмістасьці і тратах на культуру лекавых расьлін значных сродкаў, якіх звычайна няма ў дасьледчыка, для пашырэньня плошчы лекавых расьлін трэба правесьці кантрактацыю засеваў, прыцягнуўшы да гэтай справы Белмэдгандаль. Некаторыя сяляне ўжо ў першы год сваёй працы зрабілі невялікі запас лекавай сыравіны ў колькасьці ад 1/2 кг. да 2-х кг. і больш, і ў кожным такім выпадку дасьледчык імкнецца прадаць яго, каб хоць крыху апраўдаць сваю нялёгкую работу па догляду,—таму пытаньне збыту іх надта цікавіць.

У некаторых выпадках, калі прыняць сыравіну ў дасьледчыка было магчыма, дык гэта Станцыяй рабілася, і дасьледчыкам плаціліся грошы па існуючай цане. Трэба адзна-

чыць, што тавар, дастаўлены дасьледчыкамі ў выглядзе ўзораў, быў на мясцовых выстаўках у Магілеве ды ў Менску і па сваёй якасьці быў ня горшы за матар'ял, сабраны на Дасьледчай Станцыі.

У 2-х выпадках сяляне-дасьледчыкі выказвалі расчараваньне ў першых пробных засевах лекавых расьлін; прычына гэтага, відаць, у нядобрым выбары месца, дзякуючы чаму ўсходы лекавых расьлін гінулі ад пустазельля. Усё-ж яны ў канцы сваіх справаздач кажуць, што хочуць яшчэ раз паспрабаваць пасеяць лекавыя расьліны, спадзяючыся на лепшыя кліматычныя ўмовы будучага году, а таксама на лепшы выраб глебы для расаднікаў лекавых траў.

У бягучым годзе галоўнай работай сялян-дасьледчыкаў была загатоўка расады, якая і пойдзе на пастаноўку досьледаў.

Досьледы ў сялян-дасьледчыкаў Станцыя мае намер зрабіць з галоўнымі лекавымі расьлінамі, як валяр'яна, беладона, шалфей, рамашка і напярсьцянка, па пытаньнях угнаеньня, дагляду, вырабу глебы ды інш.

З атрыманах справаздач сялян-дасьледчыкаў тут падаецца падрабязная справаздача селяніна-дасьледчыка т. Шабайлава, у якой, між іншым, ёсьць імкненьне асьвятліць эканамічны бок разьвіцьця лекавых траў. Паводле зробленых падлікаў аб траце часу на зьбіраньне кветак рамашкі, відаць, што работа падлетка пры 6-гадзінным дні аплачваецца па 35—45 кап.

Ураджай кветак рамашкі, як відаць з паданай ніжэй справаздачы, 1783 кг. з гектара трэба лічыць выключным па велічыні і, мяркуючы па рэгулярнасьці запісаў, досыць праўдападобным.

Справаздача

аб рабоце селяніна-дасьледчыка Шабайлава, Янкі Захаравага, з вёскі Мікалаеўка, Лупалаўскага раёну, Магілеўскай акр., які мае вучастак зямлі плошчай у 5 дзес., 1 каня, 1 плуг, 1 барану, 1 спрунжыновую барану.

Выдана для засеву ў гадавальніку насеньня Эзэльскай рамашкі 100 гр. і шалфею 40 гр.

Для засеву насеньня быў падрыхтаваны гадавальнік гароднай зямлі і разьбіты на дзялянкі разьмерамі 1×4 саж. Усяго было падрыхтавана 10 такіх дзялянак, схэматычнае разьмеркаваньне якіх наступнае:

10. Без засеву	5. Без засеву
9. Без засеву	4. Шалфей
8. Беладона	3. Рамашка
7. Пярцовая мята	2. Шалфей
6. Рамашка позьні засеў	1. Рамашка

Глеба гадавальніку сугліністая, месца высокае з ухілам на поўнач у 5°, гадавальнік знаходзіцца блізка ля хаты. Вясна і лета 1928 г. ў кліматычных адносінах для разьвіцьця лекавых расьлін былі няспрыяючымі, ішлі вялікія дажджы пры зьніжанай тэмпэратуры; 14 і 26 былі ўлавы, 24/V выпаў град. Уначы з 7 на 8 чэрвеня былі замаразкі, папсаваўшыя ўсходы шалфея і гародніны.

Рамашка (Matricaria chamomilla).

Градкі пад рамашку падрыхтаваны 5/V, былі ўгноены і перакопаны рыдлёўкай.

Рамашка на 1—3 дзялянках пасеяна паводле правіл інструкцыі 10 мая. Адна з дзялянак пасьля засеву была прыкрыта саломай. Рамашка дружна ўзышла 19/V. 26/V прайшла ўлава, вада пакрывала грады гадавальніку і зрабіла іх больш цьвёрдымі. Па назіраньні 4/VI рамашка на градах, пакрытых саломай, аказалася радзейшай, чым на градцы адкрытай. Уначы з 7/VI па 8/VI быў падмарозак, 21/VI праполата і прарыхлена на градках зямля. У далейшым рамашка нармальна разьвівалася і к 28/VI завязаліся бутоны, распусьціўшыяся 1 ліпеня. 1-шы збор рамашкі 15/VII, 2-гі збор—2/VIII. На рамашцы былі заўважаны гусеніцы пядзеніцы зялёнага колеру, паядаўшыя лепясткі і кошыкі кветак рамашкі.

26/VIII зроблен збор перасьпеўшых кветак рамашкі на насеньне. Рамашка разьвілася буйна, і на дзялянцы № 3 была да 1 мэтру. Усяго сабрана рамашкі з дзялянкі № 1—2,977 кг. з якой адабрана 275 гр. насеньня; з дзялянкі № 3 сабрана—3,626 кг. і адсеяна 422 гр. насеньня. У пераводзе на гектар сабрана з дзялянкі № 1—1607,6 кг. сухіх кветак і з дзялянкі № 3 сабрана 1.958,1 кг. сухіх кветак, што ў сярэднім дае 1783 кг. кветак з гектара. Акрамя раньняга пасеву рамашкі, быў спрабаваны позьні пасеў 12/VII на месцы згніўшай беладоны, але такі пасеў аказаўся няўдалым, усходы рэдкія, кветкі папалі пад мароз.

Шалфей (Salyia officinalis).

Пасеў шалфею быў менш удачным, чым рамашкі. Насеньне шалфею высеяна 7/V на дзялянках № 2 і № 4, падрыхтаваныя таксама як і пад рамашку. Дзялянкі шалфею былі пагрэблены курамі, насеньне падсявалася 2 разы, а 7 і 8/VI усходы шалфею пацярпелі ад марозу, бо грады ня былі прыкрыты саломай. Разьвіцьцё шалфею ішло марудна да 17/VI, калі з наступленьнем цёплай пагоды шалфей пачаў разьвівацца больш прыкметна.

У працягу ўсяго вэгетацыйнага пэрыяду дзялянкі з шалфеем палоліся і рыхліліся 3 разы. Сабрана шалфею з дзялянкі № 4, пасаджанай расадай Магілеўскай Дасьледчай Станцыі, 190 кг. сухіх лісьцяў, што дае 103 кг. з гектара. Такі няўдалы збор шалфею зусім правільна тлумачыць т. Шабайлаў тым, што шалфей быў пасаджаны з усходняй стараны хаты ўсяго на 1 саж. ад сьцяны і ня меў добрага асьвятленьня, а па-другое—шалфей пацярпеў ад марозу і дажджоў.

Беладона (Atropa Belladonna).

Садзілася расадай у ямкі, угноеныя гноем, а зьверху прысыпаныя торфам альбо перагноем. Пасадка зроблена 30/VI на дзялянцы 1×4 саж., апрача таго, пасаджана 34 штукі беладоны ў расаднік. Ямкі з беладонай ад улавы 7/VII значна аселі, але беладона ў ямках з дабаўкай торфу добра разьвілася і дасягнула 10 сант. у вышыню. Другі раз беладона пасаджана 23/IX.

З іншых пасадак у т. Шабайлава трэба адзначыць пасадку пярцовай мяты з расткамі, атрыманымі ад Магілеўскай Дасьледчай Станцыі. Пасадка мяты зроблена на дзялянцы 1×4 кв. саж. Сабрана з гэтай плошчы 400 гр. сухога лісьця ці 2 кг. сырога. У пераводзе на гектар сабрана сухога лісту мяты 216 кг. Прымаючы пад увагу халоднае лета і позьнюю пасадку, збор лісьцяў мяты для 1-га году трэба лічыць здавальняючым.

20/VIII пасаджана напярсьцянка чырвоная расадай у ліку 16 штук. Атрымана яна ад Дасьледчай Станцыі. Уся расада добра прынялася. Лісьце з расады ня зьбіраліся.

Пасаджана таксама 50 шт. расады пэрсыдзкай і каўкаскай рамашкі на плошчы 2 кв. саж. 6 кустоў лыжачнай процыцынготнай травы і 14 шт. шток-розы (чорнай мальвы).

Паводле назіраньня т. Шабайлава ад падмарозка 3/X замерзла зямля на 1 сант. і памерзьлі лісьці беладоны, апрача дробных пазухавых. Мальве, шалфею, аканіту каравяку, напярсьцянцы лыжачнай траве і рамашцы мароз не пашкодзіў, што супадае з назіраньнямі Дасьледчай Станцыі ў ка-

лекцыйным гадавальніку. Па даным мэтназіраньняў, падмарозак ў 7 гадз. раніцы быў 1,8° С. па паветраным тэрмомэтры ў ангельскай будцы.

З боку дасьледчыка выяўлена наглядальнасьць, зацікаўленасьць справай і пунктуальнасьць у выкананьні работ. Мяркуецца ў 1929 годзе пашырыць засевы лекавых траў у полі з ужываньнем пад іх угнаеньняў.

Мяркуюцца таксама спробныя засевы дурману і беляны і пашырэньне засеваў лекавых траў, ужо высеяных дасьледчыкам у 1928 годзе.

Справаздача

па культуры лекавых траў селяніна дасьледчыка Пратасені Ф. з вёскі Дубей, Чырвонадворскага с.-с., Старобінскага раёну, Бабруйскай акругі.

Агульная плошча зямельных ужыткоўнасьцяй дасьледчыка 3-дзесяціны, глеба—суглінак. Дасьледчыку выданы поўны набор лекавых траў. Плошча пад расаднікам 20 кв. саж. на гароднай зямлі. Лекавыя травы на працягу лета некалькі разоў палолі, зямлю ўскопвалі. На ўсю работу па дагляду расады і падрыхтоўцы вучастка пад засеў пайшло, як казаў дасьледчык, каля трох тыдняў. Ёсьць расада валяр'яны, напярсьцянкі і беладоны, вынікі работы пасылаліся на мясцовую выстаўку і ў Менск. Няспрыяючымі момантамі для культуры лекавых траў селянін-дасьледчык лічыць дажджыстае і халоднае надвор'е, разьвіцьцё пустазельля і цяжкасьці ў барацьбе з ім, адсутнасьць заўваг на месцы, незаданоленасьць тлумачэньнямі ў атрыманьні інструкцыі па пастаноўцы досьледаў. Выказваецца просьба прыняць сыравіну лекавых траў, сабраную на працягу лета.

У 1929 годзе плошчу пад лекавымі травамі маецца на ўвазе павялічыць.

Справаздача

аб засевах лекавых траў сялянамі-дасьледчыкамі ў вёсцы Навасёлкі, Грэбянецкага с.-с., Лупалаўскага раёну, Магілеўскай акругі, у ліку 11 сялян-дасьледчыкаў — Кароткіна К. А., Кастусёва Ф. Д., Скавароткіна А. М., А. П., Д. П., Х. П., Храмцовых П. Т., Г. В. і П. В., Чамко Г. С., і Чамко К. Г.

Па сацыяльным становішчы памянёныя грамадзяне належаць да групы беднякоў і сераднякоў з колькасьцю зямлі ад 3-х да 8-мі дзесяцін, большасьць маюць 4—5 дзесяцін зямлі на сям'ю. Нядаўна заснавалі пасёлак Навасёлкі пад № 16, далі анкеты і падпіску аб залічэньні іх у лік сялян-

дасьледчыкаў у пачатку вясны 1928 году і атрымалі набор насеньня лекавых расьлін:

1. Валяр'яны сухадольнай . . . . 1.300 гр.
2. Беладоны каўкаскай . . . . 1.300 „
3. Чырвонай напярсьцянкі . . . . 650 „
4. Шалфею . . . . . 520 „

Насеньне разьмеркавана пароўну і было высеяна сялянамі ў маі месяцы на супяшчанай глебе на гародах уроскід; грады зроблены на гародных вучастках, занятых у 1927 г. гароднінай ці бульбай, і таму запраўленых гноем, але засьмечаных пустазельлем. Месцамі былі вымачкі і імі асабліва папсавана беладона.

У сярэднім пад расаднікам у кожнага селяніна было занята 50 саж.

Усходы лекавых траў зьявіліся ў палове червеня, у гэты-ж час зьявіліся і ўсходы пустазельля. У шмат якіх выпадках гэта непакоіла сялян, бо яны не маглі адрозьніць усходаў траў ад пустазельля і не сьпяшаліся палоць, што мела ўплыў на ўраджай. Гэта гаворыць аб тым, што трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на азнаямленьне сялян-дасьледчыкаў з лекавымі расьлінамі, тым больш, што ў сябе на месцы сяляне-дасьледчыкі наўрад ці здолеюць атрымаць ад каго-небудзь досыць грунтоўныя заўвагі ў гэтым кірунку. Наведваньне сялян сьвядомаю асобаю вельмі патрэбна. Гэта здолее выратаваць расаднікі, якія могуць хутка загінуць у цяні глушачага іх пустазельля. Ад сялян-дасьледчыкаў, Кароткіна, Скавароткіна, Кастусёва і Храмцова, расада шалфею, напярсьцянкі і валяр'яны будзе паслана на мясцовую выстаўку. Сабрана дасьледчыкамі невялічкая колькасьць сыравіны лісьцяў шалфею і напярсьцянкі. Ня гледзячы на першыя няўдачы некаторых сялян-дасьледчыкаў з закладкай расаднікаў лекавых расьлін, усё-ж ткі яны думаюць і далей сеяць лекавыя расьліны, а ў некаторых выпадках павялічыць плошчу засеву.

Рабочая сіла па догляду лекавых расьлін не падлічалася

Справаздача

аб засеве лекавых траў гр. Шаўцова А. з пасёлка „Адраджэньне", Чорнаўскага с.-с., Магілеўскага раёну.

Селянін мае 8 дзесяцін зямлі, глеба супяшчаная, вымачкі ёй ня шкодзяць. На гароднай зямлі пасьля гародніны было пасеяна насеньне валяр'яны, шалфею, 50 грам гарчыцы; невялікая колькасьць расады валяр'яны была атрымана ад Магілеўскай Дасьледчай Станцыі. Усходы лекавых траў і расады былі ў добрым стане Валяр'яна, высаджаная расадай, красавала ў ліпні да жніўня і дала насеньня 60 грам

і сухіх карэньняў 1 кг. Ад 50 грам пасеянай гарчыцы атрымана 2 кг. насеньня.

Карэньні валяр'яны, насеньне валяр'яны і гарчыцы ды ўзоры сабранай лекавай сыравіны былі прадстаўлены на мясцовай выстаўцы і пасланы на выстаўку ў Менск.

Плошчу пад лекавыя расьліны мяркуецца пашырыць да 1/4 гектара. Дасьледчык расадай забясьпечаны. Стан расаднікаў сьведчыць аб зацікаўленасьці селяніна культурай лекавых траў і ў далейшым гарантуе гэтай справе посьпех.

Справаздача

аб рабоце па культуры лекавых расьлін селяніна-дасьледчыка Чуянява А. Д., які жыве ў м. Гомелі, па Міхайлаўскай вул., дом № 21. Працуе па загатоўцы лекавай сыравіны з 1920 году і зьяўляецца інструктарам па лекавай сыравіне Белдзяржгандлю.

Наведваўся ў былыя гады некалькі разоў на Дасьледчую Станцыю і ў невялікай колькасьці сеяў лекавыя травы. Знаёмы з культурай іх. У сувязі з пераменай месца пражываньня ў гэтым годзе быў засеяны лекавымі травамі невялікі вучастак на супяшчанай, угноенай і чыстай ад пустазельля, глебе, бо ў 1927 г. вучастак быў пад бульбай. На прыгатаваных градках 10-V быў пасеяны ў радкі шалфей, прыбіты пасьля засеву дажджом і даўшы ўсходы толькі 10-VI. З прычыны халоднай дажджыстай вясны і няспрыяючага для росту лекавых траў лета шалфей першы час разьвіваўся марудна, але пад восень дасягнуў да 1/2 арш. Сабранае ў кастрычніку лісьце дало сухой масы 500 грам з 1 кв. саж., ці 1200 кг. з 1 дзесяціны.

Аптэчная рамашка пасеяна была 23-VI радкамі і трохі прысыпалася тонкім пластам зямлі; узышла 9-VII закрасавала 12 жніўня, кветкі зьбіраліся 5 разоў, сабрана з 1 кв. саж. 600 грам, што складае 1440 кг. з 1 дзесяціны.

Насеньне дурману пасеяна 23-VI у радкі, усходы падняліся 12-VII, красаваць дурман пачаў 14-VIII, насеньне дурману не пасьпела з прычыны халоднага лета і раньніх халадоў увосені, але лісьця сабрана ў сярэднім 750 гр. на 1 кв. саж., што дае 1800 кг. з 1 дзесяціны.

Экспанаты лекавых траў, разам з дзікарастучымі, пасылаліся на Гомельскую с-г. выстаўку 14-X і зацікавілі насельніцтва. Дасьледчык выяўляе вялікае жаданьне ўзяцца выключна за культуру лекавых траў з пашырэньнем плошчы пад ёю да 3-х дзесяцін пры ўмове кантрактацыі засеваў адпаведнымі ўстановамі.

Справаздача

селяніна-дасьледчыка Судніка Рафаіла з вёскі „Вольгіна-Дубраўка", Наталаўскага с.-с, Клічаўскага раёну, Бабруйскай акругі.

Зямлі ў гэтага селяніна-дасьледчыка 13 дзесяцін, глеба—суглінак, на якой засевам шкодзіць вымачка.

Плошча пад засевамі лекавых траў—100 кв. саж. з-пад бульбы ды вікі, угноеная гноем. Насеньне на градках пасеяна ўроскідку 16 мая, разьвіцьцё ўсходаў дружнае. У працягу лета расада палолася 2 разы і зямля ўскопвалася 5 разоў. Рамашка закрасавала 18-VII і красавала ўсё лета; красаваньне беляны пачалося 29-VIII. Сабрана насеньня рамашкі 25 гр., кветак 2 кг., лісьцяў напярсьцянкі 400 гр., шалфею 200 гр. На культуру лекавых траў селянін-дасьледчык патраціў 7 дзён.

Дасьледчык зьбіраў лекавую сыравіну дзікіх траў.

Справаздача

селяніна-дасьледчыка Васорава М. Е. з в. Сава, Шарыскага с.-с., Горацкага раёну, Аршанскай акругі.

Зямельных ужыткаў у селяніна-дасьледчыка 6 дзесяцін. Глеба—суглінак, на якой засевам лекавых траў шкодзіць вымачка. Пад лекавымі расьлінамі быў вучастак зямлі ў 10 кв. саж.; у 1927 г. на ім нічога ня сеялі. Вучастак угноены і ўзараны плугам. На градках у радкі пасеяна насеньне лекавых траў. Ўсходы лекавых траў, выключаючы шалфею, загінулі; шалфей перасаджаны 15-VII, разьвіваўся дрэнна. Як відаць, дасьледчык не зьвярнуў належнай увагі на культуру лекавых расьлін, аб чым сьведчыць тое, што пад лекавыя травы быў вылучаны вучастак зямлі, нявыкарыстаны ў 1927 г. і таму, як кідомая зямля, быў вельмі засьмечаны насеньнем дзікіх траў.

Дасьледчык сам прызнаецца ў сваіх памылках, і на будучы час абяцае стварыць лепшыя ўмовы для культуры лекавых траў.

Справаздача

аб засевах лекавых траў Каніцкай С.-Г. Прафшколы Бялынавічскага с.-с., Клімавіцкага раёну, Магілеўскай акругі.

Каніцкай С-Г. Прафшколай атрыманы набор насеньня з 9 відаў і, звыш гэтага, насеньне табаку ды іншых траў у колькасьці 35 гр. Глеба вучастку, занятага лекавымі травамі,—супесь. У 1927 годзе гэта плошча ў 48 кв. саж. была пад аўсом. Адказаў на пытаньні—як падрыхтоўвалася глеба, якое клалася ўгнаеньне, ці палоліся градкі і пульхнілася

глеба паміж расадай лекавых траў—не атрымана. Таксама няма вестак аб тым, якая расада і колькі яе. Адзначана толькі, што. валяр'яна і шалфей загінулі.

Справаздача

селяніна дасьледчыка Ціхамірава з в. Лідзіна, Себескага раёну, Пскоўскай губ.

Займаецца культурай лекавых траў з 1915 году. Насеньне лекавых траў мае ня толькі Магілеўскай Дасьледчай Станцыі, але і з галоўнага Батанічнага Саду (Ленінград), Маскоўскага Батанічнага Саду (1-га МДУ), Астраханскай Стазры, Нікіцкага Батанічнага Саду, Таўрыцкага Батанічнага Саду, Сібірскага ды інш.

Насеньне сеялася на градках, ускапаных рыдлёўкай, вучастак з сугліністай глебай з ухілам, засевы не вымакаюць. Усходы чырвонай і мясцовай напярсьцянкі разьвіваліся слаба, а напярсьцянка мясцовая дрэнна ўзышла. Аніс засеву 1927 г. перазімаваў у гадавальніку, але вельмі кепска разьвіваўся, з прычыны дрэннага надвор'я вясной і летам 1928 г. з уламі і ветрамі. Беладона ў палявых умовах разьвівалася дрэнна і ня высьпела (відаць, не пасьпела насеньне). Шалфей 2-га году не красаваў, „Остра-Пёстра" не пасьпеў.

Алтэй лекавы і „Любісток" далі сьпелае насеньне; таксама пасьпеў „Каравяк", „Мыльнянка" і „Доньнікі"—жоўты і белы. Насеньне, прысланае Дасьледчай Станцыяй, не высявалася з прычыны непаразуменьняў з вучасткам зямлі, які гатаваўся пад лекавыя травы.

Ад некаторых сялян-дасьледчыкаў і ўстаноў на запытаньні аб справаздачах адказаў не атрымана, апрача дасьледчыка Пярова А. з АССР немцаў Паваложжа, паведаміўшага, што справаздача ім складаецца. Выслана на мясцовую выстаўку карэньне валяр'яны і алтэю. Сабраная ім сыравіна лекавых траў здана ў Немаптэкакіраўніцтва.

Заг. Магілеўскай Дасьледчай Станцыі
Лекавых Расьлін **А. Астанковіч.**

ЗЬМЕСТ.

Стар

Вынікі работы Менскай Расьлінаводнай Станцыі па Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў 3

Асыстэнт Тачыцкі. Вынікі работы Першай Канфэрэнцыі Сялян-Дасьледчыкаў і аграпрацаўнікоў Менскай Расьлінаводнай Дасьледчай Станцыі пры Навукова-Дасьледчым Інстытуце імя Ў. І. Леніна 46

А. І. Берзін, І. Г. Уласенка. Вынікі работы Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў Горацкай Сельска-Гаспадарчай Дасьледчай Станцыі . 50

Рубанаў, Глазоўская. Вынікі работы Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў Турскай С.-Г. Дасьледчай Станцыі за 1928 г. 76

А. К. Дзіковіч. Вынікі работы Інстытуту Сялян-Дасьследчыкаў Палескай Сельска-Гаспадарчай Дасьледчай Станцыі 92

Энгельгардт. Вынікі работы Інстытуту Сялян-Дасьледчыкаў Віцебскай С.-Г. Дасьледчай Станцыі за 1928 г. 105

Дубровскі. Вынікі сялянскіх досьледаў па культуры балот за 1928 г. 118

Вынікі работы Сялян-Дасьледчыкаў па культуры лекавых расьлін за 1928 г. 123